Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

№ 14 (4405) 6 красавіка 2007 г.

У нумары:

«Белая Русь ты мая...»
Гутарка са старшынёй нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Югры» Сяргеем Бандарэнкам
Стар. 4

Увага, кантрафакт!
У полі зроку некаторыя этычныя праблемы кнігадрукавання
Стар. 5

Мастацкая праўда
Агляд апошніх нумароў часопісаў «Полымя», «Маладосць» і «Нёман»
Стар. 7

Міёршчына, зямля натхнення
Творчасць навукоўцы і графіка, члена Беларускага саюза мастакоў Вячаслава Шамшуры
Стар. 10

«У свет ішлі з любоўю і дабром...»
Пра тое, як адзін верш паэта адгукаецца ў сэрцах соцень беларусаў
Стар. 13

ПАДПІСАЦЦА НА ШТОТЫДНЁВІК «ЛіМ» МОЖНА З ЛЮБОГА МЕСЯЦА

Для індывідуальных падпісчыкаў: 1 месяц — 4500 руб. Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска: 1 месяц — 5800 руб. Падпісны індэкс — 638562

Льготная падпіска: 1 месяц — 4700 руб. Падпісны індэкс — 63880

Дуэт «Аляксандра і Канстанцін»

Чароўны свет сустрэч

Сустрэча з сябрам, добрым знаёмцам... Доўгачаканая сустрэча... Яна заўсёды спалучае ў сабе нешта таемнае ды загадкава-прыемнае. Гэта цалкам датычыць і той падзеі, якая вясновымі днямі адбылася ў старажытным горадзе Чачэрску, — свята беларускай музыкі "Чачэрскія сустрэчы-2007". Так, ізноў сустрэчы, якія ладзілі сумеснымі намаганнямі Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу нашай краіны, Гомельскі аблвыканкам, Чачэрскі райвыканкам, Гомельская абласная філармонія і Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам прафесара Міхала Фінберга.

Сёлетні фестываль у Чачэрску праводзіўся ўпершыню, але, паводле слоў маэстра, ён абавязкова стане традыцыйным. Як сталі традыцыйнымі музычныя фэсты ў гістарычных гарадах Беларусі — Нясвіжы, Тураве, Мсціславе, Міры, Заслаўі, Стоўбцах, Навагрудку. Яны зрабіліся цэнтрам прыцягнення, месцам жаданых сустрэч людзей неабыякавых да лёсу айчыннай культуры, яны абуджаюць цікавасць грамадства да сваіх гістарычных каранёў. Да таго ж, ідэя фестываляў Міхала Фінберга спрычынілася да дзяржаўнай праграмы адраджэння малых гарадоў Беларусі...

Нездарма ў назве свята беларускай музыкі слова "сустрэчы" пададзена ў множным ліку. Так, сустрэч было некалькі, і самай разнастайнай скіраванасці. Але галоўныя з іх — з прыгожым: музыкай, мастацтвам, самабытным фальклорам.

У рамках фестывалю адбыліся адкрыццё мастацкай выстаўкі, выступленне народнага ансамбля народнай песні і музыкі "Палеская жывіца".

Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі падрыхтаваў да свята дзве праграмы: "Музычнае мастацтва Беларусі: на скрыжаванні стыляў і эпох" і "Міхал Клеафас Агінскі — сусветная велічыня", якія прагучалі ў выкананні калектываў, што працуюць у яго складзе, — ансамбляў флейтыстаў, кларнетыстаў, трубачоў, салістаў на драўляных духавых інструментах, струннага квартэта і камернага аркестра.

Як лічыць доктар мастацтвазнаўства, навуковы каментатар музычных праграм Вольга Дадзіёмава, у айчыннай мастацкай спадчыне ёсць асобы, якія з'яўляюцца сімвалам ўзнаўлення мастацкага мінулага. Да іх адносіцца М.Кл. Агінскі, які заўсёды лічыў Беларусь радзімай сваіх продкаў, змагаўся за яе і менавіта з ёй звязаў самыя плённыя гады свайго творчага жыцця. А ў старажытным Чачэрску, дзе захоўваецца памяць пра мінулае і доўжацца лепшыя традыцыі бацькоў, дзе на мяжы XVIII — XIX стагоддзяў існаваў прыдворны тэатр і шыкоўны аркестр графа З. Чарнышова, узнаўленне музычнай спадчыны тых часоў падаецца вельмі надзённым.

Таксама адбылася сустрэча з лаўрэатам міжнародных конкурсаў і фестываляў — дуэтам "Аляксандра і Канстанцін", у выкананні якога прагучалі ўсімі любімыя напевы.

А яшчэ — асамблея "Дыялог парламентарыяў Беларусі з актывам Чачэрскага раёна", у якой бралі ўдзел члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу нашай краіны, дэпутаты, кіраўнікі грамадскіх аб'яднанняў, прадстаўнікі працоўных калектываў, прадпрыемстваў, арганізацый, журналісты рэспубліканскіх, абласных, раённых СМІ.

З уступным словам выступіў Аляксандр Якабсон, старшыня Гомельскага аблвыканкама, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Ён расказаў пра эканамічныя дасягненні Гомельскай вобласці і акцэнтаваў увагу на духоўным развіцці насельніцтва, павышэнні ролі культуры і мастацтваў у грамадскім жыцці. Аляксандр Серафімавіч адзначыў, што сёлета ўпершыню праводзіўся агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці кіраўнікоў раённых і гарадскіх выканкамаў Гомельскай вобласці, які яго прыемна ўразіў. Так, фінальны канцэрт доўжыўся каля чатырох гадзін, на ім сваё майстэрства паказвалі старшыні райвыканкамаў, іх намеснікі: танцавалі, спявалі, чыталі вершы.

(Заканчэнне на стар. 2)

Чароўны свет сустрэч

(Заканчэнне. Пачатак на стар 1.)

Маэстра Міхал Фінберг паведаміў пра вытокі стварэння свята ў Чачэрску: год таму ў Тураве ён сустрэўся з начальнікам упраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама Аляксандрам Прусавым. І вось, з размовы з ім і пры падтрымцы гомельскага губернатара нарадзіўся фестываль. “Мы праводзім фестывалі толькі ў маленькіх населеных пунктах рэспублікі, — зазначыў Міхал Якаўлевіч. — У гэтых гарадах жывуць добрыя людзі, якія разумеюць мастацтва. Намі зроблена 25 праграм на тэксты беларускіх паэтаў: М. Багдановіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, А. Куляшова, А. Міцкевіча, У. Караткевіча. Зараз калектыў завяршае падрыхтоўку праграмы, прысвечанай 125-годдзю Янкі Купалы і Якуба Коласа, якая прагучыць на IX Нацыянальным фестывалі беларускай песні і паэзіі “Маладзечна-2007”. Самае галоўнае, каб мы любілі сваё, беларускае”.

Старшыня пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец заўважыў, што гэта сапраўды рэдкі выпадак, калі збіраюцца разам кіраўнікі тэрыторый, парламентарыі, прадстаўнікі грамадскасці. У сваім выступленні Мікалай Іванавіч закрануў тэмы парламенцкай дзейнасці, развіцця супрацоўніцтва з іншымі краінамі ў галіне культуры, эканомікі, а таксама зрабіў акцэнт на павышэнні ролі пісьменніка і яго твораў у грамадстве.

Таццяна Прыгожая, галоўны ўрач установы “Гомельскі абласны клінічны анкалагічны дыспансер”, член Савета Рэспублікі, агучыла пытанні аховы здароўя і зазначыла, што ёй даспадобы адносіны прадстаўнікоў Чачэрскага раёна да народнага мастацтва. Некалькі месяцаў таму тут праходзілі святкаванні з нагоды юбілею заснавання раёна, і яе ўразіў канцэрт, падрыхтаваны сіламі яго насельнікаў: апантанымі, таленавітымі людзьмі...

Пасля выступлення парламентарыяў прысутныя мелі магчымасць задаць ім свае пытанні.

Так, дырэктар СШ № 1 Чачэрска Мікалай Лагойкін пацікавіўся, у чым прычына такой жанравай разнастайнасці Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі. Прафесар М. Фінберг патлумачыў, што ў складзе аркестра працуе шэсць прафесійных калектываў: ансамбль трубачоў “Інтрада”, якім кіруе прафесар Мікалай Волкаў; ансамбль флейтыстаў, ансамбль салістаў на драўляных духавых інструментах (кіраўнікі — прафесар Барыс Нічкоў і дацэнт Генрых Гедыльтэр); камерны аркестр (кіраўнік — дацэнт Валерый Сарока); ансамбль кларнетыстаў (кіраўнік — дацэнт Генадзь Забара) ды струнны квартэт... А на пытанне Людмілы Трубачэнкі, дырэктара метадычнага цэнтра аддзела культуры райвыканкама: “Ваш аркестр працуе ў розных кірунках, а менавіта вам што больш імпануе?”, прагучаў адказ: “Мне бліжэй тое, што высокапрафесійна. Музыка бывае або добрая, або дрэнная, а да якога жанру яна належыць — не вельмі істотна”.

Ганна Арлова, старшыня Савета старэйшын пры райвыканкаме, запыталася ў М. Чаргінца, на старонках якіх перыядычных выданняў друкуюцца яго творы. Мікалай Іванавіч патлумачыў, што творы часцей выходзяць кнігамі, бо вялікія па аб’ёме. А так іх мяркуецца друкаваць у часопісах “Нёман”, “Полымя”. “У Саюзе пісьменнікаў Беларусі, — падкрэсліў ён, — мы паставілі мэту максімальна дапамагчы пісьменнікам адчуць сябе запатрабаванымі ў нашым грамадстве людзьмі. Трэба адрадзіць павагу да нашых літаратараў, дапамагчы ім выдавацца. Пачынаем выдаваць бібліятэку Саюза пісьменнікаў Беларусі. Адкрываем яе выданнем кніг Янкі Купалы, Якуба Коласа, М. Танка...”.

Член СПБ Міхаіл Болсун выказаў падзяку Саюзу пісьменнікаў за падпіску старэйшых творцаў на газету “Літаратура і мастацтва”, часопісы “Нёман”, “Полымя”, “Маладосць”, што дае магчымасць сачыць за літаратурным працэсам у краіне, чытаць творы класікаў і адкрываць для сябе новыя імёны. Міхаіл Міхайлавіч прапанаваў аднавіць працу бюро прапаганды літаратуры. Старшыня СПБ М. Чаргінец запэўніў, што ўжо створана бюро прапаганды і літфонд, які ўваходзіць у яго склад. Галоўнае, каб сустрэчы, творчыя вечарыны, выступленні, пачынаючы са школ і заканчваючы працоўнымі калектывамі, былі пастаўлены на планавую аснову.

Таццяна Тульжэнка, першы сакратар ГА “БРСМ”, пацікавілася ў маэстра, з якімі калектывамі яго звязвае творчае супрацоўніцтва і з чаго будзе складацца праграма фестывалю ў Маладзечне. М. Фінберг адказаў, што супрацоўнічае ў большай ступені не з калектывамі, а з салістамі, прычым з усімі, пачынаючы са старэйшага выканаўцы І. Кабзона. А праграма IX Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі “Маладзечна-2007”, згодна з распараджэннем Прэзідэнта, будзе прысвечана 125-годдзю з дня нараджэння нашых класікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа. На першы дзень фестывалю спецыяльна падрыхтаваны вялікі канцэрт, на чатыры з паловай гадзіны, з твораў на вершы народных песняроў. На другі дзень разам з аркестрам выступяць вядомыя айчынныя выканаўцы. У рамках фестывалю адбудуцца вялікі канцэрт камернай беларускай музыкі, начны канцэрт джазавай музыкі. Выступіць шмат маладых выканаўцаў, прагучыць мноства новых песень. Таксама ў свяце возьмуць удзел нашы пісьменнікі.

Дырэктар дзіцячай школы

мастацтваў Ганна Паніматка папрасіла сп. Фінберга раскрыць сакрэты творчага даўгалецця калектыву. Маэстра задаволіў яе цікаўнасць: “Галоўнае — падбор і расстаноўка кадраў. У нас працуюць толькі выпускнікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і некалькі выканаўцаў з Расіі, якія вучыліся ў Маскоўскай кансерваторыі ці інстытуце імя Гнесіных. Падбор нашых вакалістаў конкурсны: толькі лаўрэаты рэспубліканскіх конкурсаў (I, II прэміі)”...

У адрас Аляксандра Якабсона прагучала падзяка ад начальніка аддзела культуры Чачэрскага райвыканкама Алега Чаплыгіна за фінансавую падтрымку, дзякуючы якой была закончана рэстаўрацыя помніка архітэктуры XVIII стагоддзя — ратушы, дзе і праходзіла мерапрыемства. Але ж, як зазначыў Алег Максімавіч, Чачэрск уключаны ў турыстычны праект “Залатое кальцо Гомельшчыны” і было б няблага адрадзіць яшчэ і маёнтак Чарнышовых-Круглікавых. А. Якабсон паабяцаў: “Дапаможам!”.

Вось такія сустрэчы адбыліся ў старажытным Чачэрску. Але не будзем развітвацца — наперадзе нас чакаюць новыя.

Віктар КАВАЛЁЎ

На здымках: выступленне М. Чаргінца; падчас канцэрта; ратуша.

Фота аўтара

Пачынаючы з другога паўгоддзя 2007 года, жыхары Расіі будуць мець магчымасць атрымліваць па падпісцы часопісы “Полымя”, “Нёман”, “Всемирная литература” і штотыднёвік “Літаратура і мастацтва”. У сувязі з гэтым мы папрасілі адказаць на некалькі пытанняў першага намесніка дырэктара РВУ “Літаратура і Мастацтва” Алеся БАДАКА.

Нашы выданні — падпісчыкам у Расіі

— Алесь Мікалаевіч, наколькі, на вашу думку, могуць быць запатрабаваныя беларускія выданні ў Расіі?

— Трэба мець на ўвазе, што сёння ў Расійскай Федэрацыі пражывае прыкладна 815 тысяч этнічных беларусаў.

— Вы лічыце, што гэта нашы патэнцыяльныя чытачы?

— Ведаеце, у многіх, хто апынаецца далёка ад тых мясцін, адкуль яны самі альбо іх продкі, абвастраецца пачуццё Радзімы. Адзін мой знаёмы, які нарадзіўся ў Беларусі, але апошнія дваццаць гадоў жыве ў Растове-на-Доне і які тут, дома, ніколі асабліва не захапляўся беларускай музыкай, вельмі прасіў мяне набыць для яго запісы “Песняроў”, і цяпер адна з яго самых любімых песень — “Александрына”. І гэта не нейкі выключны выпадак. Хутчэй, ён тыповы для тых, хто воляй лёсу даўно ці, няхай сабе, і зусім нядаўна пакінуў Радзіму. І яшчэ, не будзем забывацца, што сёння больш як у 70 суб’ектах Расіі створаны рэгіянальныя арганізацыі беларусаў, аб’яднаныя ў Федэральную нацыянальна-культурную аўтаномію “Беларусы Расіі”. Прычым, геаграфія іх надзвычай шырокая — ад Масквы да Уладзівастока. Што асабліва важна, многія з іх, як, напрыклад, Беларускі культурна-асветніцкі цэнтр імя святой Еўфрасінні Полацкай у Новасібірску, якім кіруе Іван Панасюк, праводзяць вельмі вялікую работу па захаванні і развіцці беларускай культуры ў гэтым рэгіёне сярод нашых землякоў.

— Каго яшчэ могуць зацікавіць нашы выданні ў Расіі?

— Я думаю, так званых “прафесійных чытачоў”: літаратуразнаўцаў, якія займаюцца даследаваннямі міжнародных літаратурных узаемасувязей, перакладчыкаў. На жаль, сучасная беларуская літаратура не так шырока вядома ў той жа Расіі, як гэта было некалі. І адна з галоўных прычын у тым, што туды яна трапляе ў вельмі малым аб’ёме, у тым, што мы самі мала рупімся пра тое, каб нас чыталі і за межамі Беларусі. Дарэчы, неўзабаве ў Маскве павінна выйсці перавыданне анталогіі беларускай паэзіі на дзвюх мовах — па-беларуску і па-руску. А таксама, здаецца, павінна нарэшце станоўча вырашыцца пытанне аб выданні на рускай мове тома сучаснага беларускага апавядання. Але ў гэтым, дарэчы, найпершая заслуга расійскага боку і нашых землякоў, якія сёння стала жывуць у Расіі.

Гутарыў А. КУПРЭЙЧЫК

Беларусы смяяліся

Свята гумару сёлета ўпершыню адзначана надзвычай каларытным мерапрыемствам — вясёлым канцэртам, які меў назву “Беларусы смяюцца” і адбыўся 1 красавіка ў сталічным Палацы культуры чыгуначнікаў. Ініцыятарамі правядзення свята выступілі Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі, Мінскі гарвыканкам, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Поўная зала палаца сведчыла сама за сябе — цікавасць да беларускага нацыянальнага гумару ў мінчан ёсць! Дарэчы, на ўваходзе ў якасці аплаты прымаліся жарты і анекдоты.

Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец заўважыў: “Трэба зрабіць так, каб свята гумару сталася набыткам усёй нашай краіны і народа.” Таксама Мікалай Іванавіч прызнаўся са сцэны, што на 1 красавіка пажартаваў з жонкі і з першага сакратара СПБ Анатоля Аўруціна. Апошняга ён папрасіў набраць з хатняга крана... бутэльку бярозавага соку, які нібыта рашэннем Мінгарвыканкама пусцілі 1-га красавіка праз водаправод літаральна на паўгадзіны. “Аўруціна зараз няма ў зале — нагэўна, пайшоў набіраць!” — працягнуў Мікалай Іванавіч...

Некалькі гадзін у зале не сціхалі каларытныя беларускія жарты. Ініцыятар і старшыня журы Усебеларускіх фестываляў народнага гумару ў Аўцюках, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Уладзімір Ліпскі расказваў аўцюкоўскія анекдоты. Паэты Мікола Шабовіч, Міхась Пазнякоў, Анатоль Зэкаў, Сяргей Давідовіч і Павел Саковіч чыталі вершы-пародыі, напісаныя паводле некаторых паэтычных твораў вядомых айчынных віртуозаў рыфмаванага слова. Паколькі на дварэ вясна — паэты звярнулі ўвагу і на тэму кахання. Спадзяюся, многія ведаюць, як тонка ды вобразна яны могуць “хуліганіць” на абсягах высокіх пачуццяў. Дарэчы, свежыя пародыі і проста вясёлыя вершы можна традыцыйна знайсці штомесяц у “ЛіМе” на “13-й паласе”. Былі прадстаўлены на свяце выстаўкі работ С. Давідовіча і А. Карповіча, а таксама мастакоў часопіса “Вожык”..

Не абышлося без сцэнак, якія паказалі артысты тэатраў народнага гумару “Вясёлыя аўцюкоўцы” (г. Калінкавічы), “Канкан” (г.Гродна), “Спораўскі акалот” (Бярозаўскі раён), “Тары-бары” (г. Маладзечна). Многія сцэнкі, як і пэўныя вершы, высмейвалі бязглуздае перайманне некаторых сучасных традыцый і з’яў. Фітнес і шлюбнае агенцтва паместачкоўску, інтэрнет-знаёмствы, мабільная недаступнасць — усё гэта і шмат іншага патрапіла ў поле зроку гумарыстаў.

На свяце гучалі народныя прыпеўкі, жарты ад маладых КВЗ-шнікаў, а правялі канцэрт Каласок і Калінка — традыцыйныя героі Аўцюкоўскіх фестываляў, у ролі якіх выступілі студэнты БДУ культуры і мастацтваў Дзмітрый Сергяйчук і Марыя Федарэнка.

Уладзімір ШУГАВЕЕЎ

На здымках: падчас свята гумару; намеснік старшыні Мінгарвыканкама Міхаіл Ціцянкоў і старшыня СПБ Мікалай Чаргінец.

Фота аўтара

Напярэдадні свята

Ужо ў пяты раз у Мінску па бласлаўленні Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Філарэта прайшла духоўна-асветніцкая выстаўка-кірмаш "Вербны кірмаш". Ладзілі яе ў сталічным Палацы мастацтва выставачнае таварыства "Экспафорум", Беларуская Праваслаўная Царква і ТАА "Экспасервіс".

Мэта выстаўкі-кірмашу — адраджэнне праваслаўнай культуры і царкоўных рамёстваў у Беларусі, садзейнічанне аднаўленню храмаў, манастыроў і пашырэнню грамадскіх ды гаспадарчых сувязей БПЦ, падрыхтоўка да святаў Вербнай нядзелі і Вялікадня, садзейнічанне духоўна-маральнай асвеце і выхаванню юнацтва і дарослых.

На "Вербным кірмашы" прадстаўлялася не толькі прадукцыя манастыроў, прыходаў, народных майстроў і выдавецтваў з Беларусі, Украіны, Расіі, але і пашыраная духоўна-асветніцкая праграма "Сям'я — яднаннем і любоўю выратуемся". У складзе гэтай праграмы адбыліся паказ фільмаў-прызёраў I, II і III Усесаюзных кінафестываляў кароткаметражных стужак "Сям'я Расіі", гутаркі са святарамі на тэмы, якія хвалююць сёння як моладзь, так і шырокае кола людзей — "Грамадзянскі шлюб", "Бацькі і дзеці", "Піўны алкагалізм і тытунёвая залежнасць"... Наведвальнікі мелі магчымасць паслухаць выступленні разнастайных музычных калектываў і царкоўных хароў, азнаёміцца з дзейнасцю манастыроў.

Як зазвычай, прапаноўваўся багаты выбар духоўнай літаратуры, аўдыё- і відэапрадукцыі для дзяцей і дарослых. А вопытныя майстры праводзілі майстар-класы па званарскім і дэкаратыўна-ўжытковым мастацтве, падзяліліся з цікаўнымі сакрэтамі вырабу размаітых сувеніраў. Таксама на выстаўцы былі прадстаўлены абразы, календары, прадметы царкоўнага ўжытку, царкоўнае адзенне і да т.п.

Трэба адзначыць, што выстаўкі такога кшталту сталіся ўжо традыцыйнымі і вельмі папулярнымі сярод наведвальнікаў і ўдзельнікаў. Бо "Вербны кірмаш" прысвечаны галоўнаму хрысціянскаму святу Вялікадню — Светламу Хрыстову Уваскрэсенню. Тут можна было набыць неабходную літаратуру, сувеніры і падарункі: вербныя букецікі, пісанкі, дэкаратыўныя свечкі і паштоўкі, паўдзельнічаць у разнастайных мерапрыемствах, пагутарыць з цікавымі людзьмі і проста спрычыніцца да святочнай атмасферы.

В. КАВАЛЁЎ

Фота К. Дробава

Да дня яднання народаў

Напрыканцы мінулага тыдня "Міжнародны цэнтр інтэграцыйнай інфармацыі. Грамадскі прэс-цэнтр Дома прэсы" правёў прэзентацыю ім жа выдадзенай кнігі "Мы — разам!"

Пад адной вокладкай аўтар Алесь Карлюкевіч сабраў гутаркі з дзеячамі культуры Расіі і Беларусі, а таксама артыкулы, нарысы, якія расказваюць пра адрасы рускай культуры ў Беларусі, пра знакамітых беларусаў, што засведчылі сябе ў культуры і навуцы ў Расіі. Сярод суразмоўцаў літаратара – Віктар Бокаў, Юрый Рытхэу, Леанід Невядомскі, Чынгіз Айтматаў, Мікалай Чаргінец, Анатоль Аўруцін...

Сваімі развагамі пра кнігу на прэзентацыі падзяліліся начальнік Дэпартамента сацыяльнай палітыкі і інфармацыйнага забеспячэння Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы Ірына Наркевіч (Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы — фундатар выдання), кансультант Прадстаўніцтва Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы ў г. Мінску Таццяна Сергіенка, першы сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі Анатоль Аўруцін, скульптар Уладзімір Слабодчыкаў, доктар культуралогіі Ігар Марозаў.

Ул. інф.

Культурныя стасункі

Як паведаміў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Арабскай Рэспубліцы Егіпет Сяргей Міхневіч, з 11 па 17 красавіка ў гэтай краіне пройдуць Дні культуры Беларусі. Да слова, дыпламатычныя зносіны паміж Егіптам і Беларуссю ўсталяваны пятнаццаць год таму, 1 лютага 1992-га.

У склад беларускай дэлегацыі ўвойдуць прадстаўнікі Міністэрства культуры. Праграма прадугледжвае перамовы з егіпецкімі калегамі, а таксама сустрэчы ў знешнепалітычным ведамстве Егіпта. У рамках Дзён культуры плануецца ўдзел майстроў айчынных народных промыслаў. Адбудуцца выступленні Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра балета нашай краіны пад кіраўніцтвам Валянціна Елізар'ева. Знаны калектыў выступіць на сцэне Каірскай оперы і ў Александрыйскім тэатры "Сейід Дэрвіш" з балетам П. Чайкоўскага "Шчаўкунчык".

В. К.

Госця бібліятэкі

У сакавіку Ждановіцкая сельская бібліятэка наладзіла сустрэчу юных чытачоў з членам Саюза пісьменнікаў Беларусі Кацярынай Хадасевіч-Лісавой. Сустрэча з пяцікласнікамі адбылася за "круглым сталом". Дзеці больш падрабязна даведаліся пра літаратурную дзейнасць госці. Чытачам была прадстаўлена магчымасць пазнаёміцца з падборкай публікацый пісьменніцы, падрыхтаванай бібліятэкай.

Творы пісьменніцы, напоўненыя пранікнёным лірызмам, тонкім гумарам, аптымізмам і любоўю да людзей, падабаюцца чытачам. Адметна і тое, што Кацярына Станіславаўна — іх першая настаўніца. Школьнікі парадавалі аўтарку чытаннем яе вершаў на памяць. Госця прапанавала да ўвагі чытачоў новыя празаічныя творы для дзяцей. Падчас мерапрыемства да прачытаных легенд вучням было прапанавана зрабіць ілюстрацыі. Ідэя спадабалася, а малюнкі атрымаліся даволі цікавымі.

Незвычайнасць сустрэчы была ў тым, што адначасова праходзілі і здымкі тэлепраграмы "Судьбой написанные строки", прысвечанай творчай дзейнасці Кацярыны Хадасевіч-Лісавой.

Валянціна СЛЕСАРАВА,
Галіна АТРАСЕВІЧ

На здымку: падчас сустрэчы.

З ПАЭТЫЧНЫМ ПРЫВІТАННЕМ

Не застаўся незаўважаным Сусветны дзень паэзіі і ў мінскай СШ № 48: на яго сюды запрасілі рэдактара аддзела часопіса "Полымя" Анатоля Зэкава. Госць распавёў пра здабыткі беларускай паэзіі і яе месца ў кантэксце сусветнай літаратуры, а таксама пазнаёміў вучняў і настаўнікаў з рэдакцыйнымі планамі выдання.

Для юнакоў і дзяўчат стала прыемнай навіна, што аддзел крытыкі і літаратуразнаўства ў часопісе "Полымя" цяпер узначальвае выпускніца іх школы Марыя Кудрашова (Шамякіна), якая ўжо добра зарэкамендавала сябе ў крытыцы, паэзіі і прозе, абараніла кандыдацкую дысертацыю, з'яўляецца членам Саюза пісьменнікаў Беларусі. У роднай школе Марыі Анатоль Зэкаў прачытаў свае вершы і літаратурныя пародыі, прыгадаў вясёлыя выпадкі з жыцця, якія знайшлі адлюстраванне ў яго празаічных творах.

Сяргей КРЫВІЧОЎ

"Вы ўяўляеце: Докшыцы чакалі нас аж 600 гадоў!" — пажартаваў Мікола Мятліцкі, звяртаючыся да Зіновія Прыгодзіча і Анатоля Зэкава па дарозе, яўна маючы на ўвазе пашанотную дату з дня заснавання гэтага раённага гарадка на Віцебшчыне.

У Докшыцы — на юбілей

Менавіта ў шэрагу мерапрыемстваў, прысвечаных юбілею Докшыцаў, значыўся і вечар-сустрэча "Радзіму сваю праслаўляю пяром", які адбыўся ў гарадскім цэнтры культуры. Яго вядучыя — загадчыца раённай дзіцячай бібліятэкі Алена Гудзь і бібліятэкар Наталля Шудрова — зрабілі кароткі экскурс у гісторыю горада, нагадалі імёны сваіх знакамітых землякоў, якімі ганарацца ў раёне. Прыемна, што сярод іх — і беларускія паэты, абодва ўраджэнцы вёскі Маргавіца Юрась Свірка ды Алесь Ставер. Мясцовыя самадзейныя артысты са сцэны дэкламавалі вершы і спявалі песні.

А потым прысутным у зале (а гэта былі бібліятэкары, настаўнікі, вучні і іншыя аматары паэзіі) прадставілі гасцей з Мінска. Галоўныя рэдактары часопісаў "Гаспадыня" і "Полымя" Зіновій Прыгодзіч і Мікола Мятліцкі распавялі пра свае выданні, падзяліліся рэдакцыйнымі планамі і, безумоўна, прачыталі вершы.

Вясёлае ажыўленне ў зале выклікала выступленне Анатоля Зэкава. І дзецям, і дарослым ён адрасаваў свае гумарыстычныя вершы і аповеды, літаратурныя пародыі.

Арганізатары сустрэчы ў Докшыцах не забыліся, зрэшты, і на дзень нараджэння Міколы Мятліцкага, які выпаў якраз на дату імпрэзы: тут жа на сцэне яго павіншавалі і ўручылі букет кветак.

А перад пачаткам гэтага мерапрыемства быў арганізаваны продаж мастацкай і вучэбна-метадычнай літаратуры, дзе ўсе жадаючыя змаглі набыць кнігі пісьменнікаў, якія прыехалі, ды атрымаць аўтографы ад іх.

Наталля АЛЯКСАНДРАВА

На здымку: пісьменнікі З. Прыгодзіч, М. Мятліцкі і А. Зэкаў сярод чытачоў.

Фота У. Несцерука

У абдымках «фартуны»

Пры канцы сакавіка ў актавай зале Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка з поспехам прайшлі два спектаклі: "Кола фартуны" і "Апельсінавыя жарсці". Акцёры народнага студэнцкага тэатра "Мы", бліскуча выканаўшы ролі, кранулі не толькі сэрцы моладзі, але і гледачоў сярэдняга ўзросту.

Спектакль "Кола фартуны", пастаўлены паводле сярэднявечнай паэзіі вагантаў, вось ужо два гады не перастае здзіўляць публіку глыбокім філасофскім зместам. Мабыць, сакрэт у тым, што на фоне трагічнага кахання паэта да прыгажуні-куртызанкі раскрываюцца вечныя праблемы чалавецтва: выбару, прадвызначанасці лёсу, трываласці сяброўства, нешчаслівага кахання.

Паводле слоў рэжысёра-пастаноўшчыка Дзмітрыя Шуканава, ідэя стварэння гэтага спектакля нарадзілася дзякуючы галоўнаму рэжысёру і мастацкаму кіраўніку тэатра "Мы" І. Карпенку.

Другі ж спектакль "Апельсінавыя жарсці" (паводле п'есы Л. Філатава) адрозніваўся ад першага камедыйнай скіраванасцю і казачнымі прыгодамі. Пастаноўкі былі высока ацэнены як аматарамі тэатра, так і вядомым пісьменнікам і драматургам А. Дударавым. Прысутнічалі ў зале і артысткі М. Захарэвіч, З. Белахвосцік, рэжысёр У. Савіцкі.

На сёння народны студэнцкі тэатр "Мы" з'яўляецца лаўрэатам міжнародных і рэспубліканскіх фестываляў і вядомы ў Расіі і на Украіне. Бліжэйшым часам ён наведае са спектаклем "Апельсінавыя жарсці" Брэсцкую вобласць.

Дарэчы, хутка народны шоу-тэатр "Мы" адзначыць сваё 22-годдзе.

Серафіма БЕРАЗУН

АБСЯГІ

Пра вясну і каханне

Магілёў. Ужо некалькі год дзейнічае ў магілёўскай Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя А. Пушкіна гасцёўня "Гаспадынька", дзе збіраюцца жанчыны, маці юных і маленькіх чытачоў. Сёлета гасцёўня пашырыла тэматыку сустрэч, якія набылі літаратурны ўхіл.

На літаратурна-музычную вечарыну пад назвай "І гэты час завецца вясной" запрасілі мужа і жонку Міколу і Алу Яцковых, якія працуюць у Брылёўскім доме культуры Магілёўскага раёна. Мікола Яцкоў — вядомы паэт-песеннік, яго жонка Ала — адметная спявачка.

Падчас сустрэчы Мікола Адамавіч чытаў вершы. А паколькі на дварэ вясна, прагучалі песні пра каханне. М. Яцкоў паклаў на музыку больш як паўтысячы вершаў беларускіх паэтаў. Сямейны дуэт выканаў песні "Гронка бэзу" (на словы Т. Ляшонка), "Замова" (на словы А. Салтука), "Наша каханне" (на словы М. Шабовіча).

На чарзе ў гасцёўні "Гаспадынька" — новыя літаратурныя вечарыны, прысвечаныя літаратарам-землякам.

Віктар АРЦЕМ'ЕЎ

Як вада, як луста хлеба, кніжка добрая нам трэба!

Маладзечна. Размаўляючы з бібліятэкарам Алай Асадчук, была ўражана, калі пачула, што шмат дзяцей малодшых класаў не ведаюць, нават не чытаюць казак.

— Калі я прыйшла ў малодшыя класы, каб правесці віктарыну, пытанні якой складаліся на аснове казак, якія, на мой погляд, знаёмыя ўсім і кожнаму, то была вельмі здзіўлена, што вучні не ведаюць ніводной казкі, ні аднаго героя, — абуралася Ала Паўлаўна.

Безумоўна, цяпер для дзяцей цікавей пагуляць на камп'ютэры, чым пачытаць казку. Навошта тады кнігі, бібліятэкі? Але ж менавіта казкі вучаць нас верыць у цуды, верыць у тое, што заўсёды дабро перамагае зло. Я вельмі люблю чытаць казкі, хоць мне і 15 год. Я веру ў цуд, а вы?

Кацярына ШЫМАНОЎСКАЯ

Фартэпіянная імпрэза

Салігорск. У першыя сакавіцкія дні Зала камернай музыкі гарадской дзіцячай музычнай школы прымала гасцей — студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, лаўрэатаў міжнародных конкурсаў.

Вечарына ўключала ў сябе два аддзяленні. У першым выступіла Аліса Сапега, студэнтка класа народнага артыста нашай краіны, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь прафесара Ігара Алоўнікава. Праграма складалася з класічных твораў і ўспрымалася з цікавасцю: Скерца Яганеса Брамса, адзін з эцюдаў Аляксандра Скрабіна, тры прэлюдыі Клода Дэбюсі...

У другім аддзяленні выступіў Аляксандр Палякоў, студэнт класа заслужанага артыста Беларусі прафесара Юрыя Гільдзюка. Выхаванцы дзіцячай музычнай школы і іх выкладчыкі былі зачараваны віртуозным выкананнем складаных твораў: санаты "Апасіяната" (2 і 3 часткі) Людвіга ван Бетховена, Такаты Роберта Шумана, Эцюда фа мінор Ферэнца Ліста.

Сяргей ЯКІМОВІЧ

Вечарына памяці паэта

Быхаў. Быхаўская цэнтральная бібліятэка правяла ў чытальнай зале літаратурную вечарыну "Рыцар паэзіі" з нагоды 50-годдзя з дня нараджэння вядомага беларускага паэта Алеся Пісьмянкова, які, на вялікі жаль, пайшоў ад нас тры гады таму.

Старшакласнікі СШ № 1 г. Быхава мелі магчымасць азнаёміцца з выставай твораў Алеся Уладзіміравіча "Ракавое прароцтва паэта" і некаторымі публікацыямі перыядычнага друку.

Бібліятэкар аддзела абслугоўвання цэнтральнай бібліятэкі А. Дрозд расказала вучням пра жыццёвы і творчы шлях Алеся Пісьмянкова, які быў, на вялікі жаль, кароткі, але вельмі яркі і плённы. І прачытала некалькі вершаў з кнігі выбраных твораў паэта "Я не памру, пакуль люблю".

Сваімі ўспамінамі пра сустрэчы са знакамітым земляком падзяліўся член Саюза пісьменнікаў Беларусі, галоўны рэдактар раённай газеты "Маяк Прыдняпроўя" Мікола Леўчанка. Ён закончыў выступленне наступнымі радкамі:

Не сустрэнешся
больш з землякамі
На парозе ні вёснаў, ні зім.
Ты, Алесь, па-ранейшаму з намі,
І заўсёды ў сэрцы маім.

Г. СУПРАНКОВА

«Белая Русь ты мая...»

У сакавіку 2007 года грамадскаму аб'яднанню — нацыянальна-культурнай аўтаноміі (НКА) "Беларусы Югры", утворанай у г. Сургуце Цюменскай вобласці — споўнілася чатыры гады. Аўтаномія аб'яднала беларускія грамадскія арганізацыі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі пяці муніцыпальных утварэнняў Ханты-Мансійскай аўтаномнай акругі (ХМАА) — Югры.

Станаўленне арганізацыі, якая ўсклала на сябе такія сур'ёзныя задачы, як захаванне самабытнасці беларускай культуры, супрацоўніцтва з іншымі нацыянальнымі аб'яднаннямі, каардынацыя дзейнасці беларускіх грамадскіх арганізацый на тэрыторыі акругі, бясспрэчна, патрабуе часу. Як кажуць, "без часу ня будзе і квасу, без пары ня будзе і травы"... Нягледзячы на "ясельны" ўзрост, арганізавана і праведзена шэраг мерапрыемстваў. Пра справы дыяспары мы папрасілі расказаць старшыню "Беларусаў Югры", Сяргея БАНДАРЭНКУ.

— Сяргей Афанасьевіч, з чаго ўсё пачыналася?

— Першая грамадская арганізацыя беларусаў створана ў Сургуце 19 чэрвеня 1999 года. Ачоліў культурна-асветніцкае таварыства "Бацькаўшчына" Валерый Шляхценка. Менавіта ў той час сфармуляваны асноўныя мэты дзейнасці таварыства: захаванне нацыянальных мовы і культуры, абуджэнне ў людзях гонару за прыналежнасць да этнасу, рэстаўрацыя гістарычнай памяці.

У красавіку 2001-га я ўзначаліў створанае грамадскае аб'яднанне беларусаў Сургуцкага раёна "Спадчына". А праз год, 20 верасня, у Ханты-Мансійску зарэгістравана гарадское нацыянальна-культурнае таварыства "Сябры", старшынёй якога стаў Валерый Зіновіч.

За час дзейнасці беларускімі дыяспарамі зроблена шмат карыснага, што характарызуе беларусаў як працавітых і адкрытых душою людзей. А лагічным крокам развіцця беларускіх грамадскіх аб'яднанняў у ХМАА сталася заснаванне ў Сургуце галаўной арганізацыі — рэгіянальнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Беларусы Югры". 11 лютага 2003 года на ўстаноўчым сходзе аўтаноміі прысутнічала дэлегацыя Пасольства Беларусі на чале з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі Уладзімірам Грыгор'евым. Напрыканцы сакавіка 2003-га адбылася дзяржаўная рэгістрацыя НКА.

Асноўнымі мэтамі Аўтаноміі абвешчаны: садзейнічанне абароне і рэалізацыі канстытуцыйнага права чалавека на захаванне духоўнай этнакультуры, адраджэнне і захаванне беларускай мовы, развіццё супрацоўніцтва з нацыянальнымі аб'яднаннямі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Расіі і за мяжой.

— Хто аказвае "Беларусам Югры" спонсарскую падтрымку?

— Больш за ўсё беларусаў (каля сямі тысяч чалавек) працуе ў нафтагазаздабываючым прадпрыемстве Сургута — адкрытым акцыянерным таварыстве "Сургутнафтагаз". Гэтым і тлумачацца самыя цесныя сувязі паміж прадпрыемствам і НКА. Дзякуючы генеральнаму дырэктару Уладзіміру Багданаву ўсе ініцыятывы беларусаў заўсёды знаходзяць падтрымку.

Акрамя спонсарскай падтрымкі ад горадаўтваральнага прадпрыемства Сургута, мы рэгулярна выйграём гранты розных узроўняў на мэтавыя мерапрыемствы.

— Запамінальнай падзеяй для жыхароў Сургута стала абвяшчэнне ідэі пра пабрацімства з Гомелем. Раскажыце пра гэта больш падрабязна.

— Ініцыятыва пабрацімства нарадзілася падчас знаходжання беларускай дэлегацыі ў гарадах Ханты-Мансійску і Сургуце. Яна знайшла падтрымку ў губернатара Ханты-Мансійскай аўтаномнай акругі Аляксандра Філіпенкі, які паабяцаў аказаць усямерную дапамогу ў развіцці двухбаковых зносін. Аўтаномія падрыхтавала зварот да кіраўнікоў двух гарадоў і выступіла ініцыятарам дадзенага праекта. Як казалі нашы бацькі: "Смелым лес дапамагае!". І распачалася работа.

Адным з першых крокаў у рэалізацыі ідэі стаў наш ліст кіраўніку Сургута Аляксандру Сідараву пра пабрацімства з беларускім горадам Гомелем. Актывісты падрыхтавалі матэрыялы, у якіх асвятляліся розныя бакі дзейнасці горада Гомеля. Як высветлілася, у нас вельмі шмат падобнага. Пасля дасканалага аналізу інфармацыі спецыялістамі гарадской адміністрацыі, ініцыятыву падтрымалі.

Пасля, з нагоды святкавання 410-годдзя Сургута, адбыўся візіт у горад афіцыйнай дэлегацыі на чале са старшынёй Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў Уладзімірам Чарнаштанам. Гэта сталася пачаткам падпісання ў далейшым афіцыйных дакументаў аб супрацоўніцтве паміж гарадамі.

— Думаю, трэба ўзгадаць, што ў гадавіну Вялікай Перамогі беларусы Югры асабліва вылучыліся. У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі аб заснаванні медаля "60 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў" аўтаноміяй арганізаваны шэраг мерапрыемстваў па ўручэнні гэтых узнагарод ветэранам вайны, якія бралі ўдзел у вызваленні Беларусі. Як усё адбывалася ў Сургуце?

— Уручэнне юбілейных медалёў ветэранам, якія вызвалялі Беларусь і жывуць на тэрыторыі Югры, адбылося на ўрачыстай вечарыне ў Палацы мастацтваў "Нафтавік". Ад імя Прэзідэнта Беларусі іх уручаў Саветнік-Пасланнік Пасольства РБ у Расіі Уладзімір Паўловіч. У мерапрыемстве таксама браў удзел славуты беларус, двойчы Герой Савецкага Саюза лётчык-касманаўт Пётр Клімук.

Медалі ўручылі 27 ветэранам. Адбыўся канцэрт творчага калектыву "Беларускія песняры". Сталы ўзрост і хваробы не дазволілі многім асабіста прысутнічаць на цырымоніі. Ім медалі дастаўлялі дадому прадстаўнік пасольства У. Паўловіч, старшыня НКА "Беларусы Югры" і намеснік старшыні праўлення НКА Мікалай Гвоздзь. Усяго ж пачэсная ўзнагарода знайшла 70 франтавікоў.

— Якія праводзяцца нацыянальныя святы?

— Улічваючы вялікую цікавасць да нацыянальнай культуры славянскіх народаў, нацыянальна-культурнай аўтаноміяй прынята рашэнне аб штогадовым правядзенні ў Сургуце свята "Купалле". У мінулагодніх святкаваннях, што ладзіліся на тэрыторыі гісторыка-культурнага цэнтра "Стары Сургут", бралі ўдзел дзіцячы ансамбль "Рушнічок" ды ансамбль "Вячоркі" з сяла Вікулава Цюменскай вобласці. Вялікую падтрымку ў правядзенні гэтага абрадавага свята аказалі Цюменская абласная Дума і НКТ "Беларусь" на чале са старшынёй Леанідам Ксяндзовым. Выраблялі ў будучым праводзіць падобныя мерапрыемствы сумесна з нашымі сябрамі — Таварыствам рускай культуры, Украінскім культурным цэнтрам і ўпраўленнем культуры адміністрацыі Сургута.

— Шмат сілы і часу вы аддаяце рэалізацыі ў Сургуце ваенна-гістарычнага праекта "Танк"...

— Так, падчас вайны ў Пскоўскай вобласці загінула шмат жыхароў Сургута. У рамках рэалізацыі нашай праграмы "Шляхам вайны", праект, які перамог у адкрытым расійскім конкурсе "12 грамадзянскіх ініцыятыў 2005 года ва Уральскай федэральнай акрузе", пры НКА "Беларусы Югры" створаны пошукавы атрад "Звезда". У мінулым годзе "Звезда" сумесна з ваенна-патрыятычным клубам "Пошук" з горада Шклова (Беларусь), аўтаномнай некамерцыйнай арганізацыяй "Пошукавы клуб "Ар'ергард" (Масква) і пошукавым атрадам "Вышыня" (Вялікія Лукі, Пскоўская вобл.) пры правядзенні пошукавых работ на месцах баёў каля вёскі Зяленкіна (Пскоўская вобл.) знайшлі затоплены ў балоце савецкі танк (магчыма, Т-34). У нас ужо ёсць дамоўленасць на ўсіх узроўнях улады па падняцці танка і ўстаноўкі яго на п'едэстале ў Ханты-Мансійску. Мяркуем адкрыць помнік сёлета, на 9 мая. А ў Сургуце плануем адкрыць музей Баявой Славы з экспазіцыяй баявой тэхнікі часоў вайны.

— Якія праекты рэалізаваны ў 2006 годзе?

— Іх пяць: "Кірмаш музыкантаў", "Школа лозапляцення", "Піліпаўскія вечары", "Купалле" ды "Вячоркі". У іх бралі ўдзел больш як 2000 чалавек.

— У якіх мерапрыемствах з удзелам нацыянальных дыяспар (у Сургуце іх больш як 30) вы мелі поспех?

— Нашы прадстаўнікі ўдзельнічалі ў цырымоніі ўрачыстага адкрыцця акруговага будынка Дружбы народаў у Ханты-Мансійску. Больш як 20 нацыянальных таварыстваў прадставілі канцэртныя праграмы і традыцыйныя стравы. Паводле вынікаў дэгустацыі беларускія стравы прызнаныя лепшымі. Гэта адзначылі губернатар акругі Аляксандр Філіпенка, першы намеснік старшыні ўрада акругі Аляксандр Навіцкі і шматлікія ўдзельнікі мерапрыемства.

На стале, прыгожа афармленым і сервіраваным поварам Андрэем Касяровічам, галоўнай стравай, канечне ж, былі дранікі. Шмат хто з паўночнікаў упершыню назіраў, як яны гатуюцца, і пакаштаваў іх пад "самагонку", прывезеную з гэтай нагоды з самой Беларусі.

Увогуле, бяром удзел ва ўсіх акружных мерапрыемствах, прыкладам, "Славянскі ход", "Суквецце" і інш., і заўсёды выйграём прызавыя месцы.

— А ў друкаваных выданнях адлюстроўваецца гісторыя беларусаў, якія жывуць на Поўначы?

— Нядаўна ў цэнтральнай Сургуцкай бібліятэцы імя Пушкіна адбылася падрыхтаваная нацыянальнай аўтаноміяй "Беларусы Югры", прэзентацыя манаграфіі "Очерки истории белорусов в Сибири" (Новосибирск, "Наука-Центр", 2003). Кніга, напісаная вядомымі вучонымі Сібірскага аддзялення Расійскай акадэміі навук і Інстытута гісторыі НАН Беларусі, перададзена дырэктару бібліятэкі Надзеі Жукавай. Пра гісторыю стварэння кнігі расказаў адзін з ініцыятараў прэзентацыі, старшыня таварыства "Беларусы Сібіры" (Новасібірск) Мікалай Сулкоўскі. Зараз ідзе падрыхтоўка другога, дапоўненага, выдання.

Інстытут гісторыі Сібірскага аддзялення РАН сумесна з рэгіянальнымі грамадскімі аб'яднаннямі беларусаў Сібіры рыхтуе кнігу па гісторыі ўдзелу беларусаў у асваенні гэтай тэрыторыі.

— А як ідуць справы ў беларускіх дыяспарах іншых гарадоў ХМАА?

— У сталіцы Югры горадзе Ханты-Мансійску з насельніцтвам каля 50 тыс. чалавек жыве некалькі тысяч беларусаў. Яны заняты ў розных галінах — працуюць у дзяржаўных ды прыватных структурах. Ужо колькі год там функцыянуе гарадская грамадская арганізацыя "Беларускае нацыянальна-культурнае таварыства "Сябры" (каля 250 членаў).

Актывісты НКТ імкнуцца ўдасканальваць працэсы інтэграцыі Беларусі і ХМАА — Югры праз удзел у рэалізацыі шэрагу праектаў. Гэта — прасоўванне на мясцовы рынак беларускіх тэхналогій, абсталявання, тавараў. Адбылася паездка рабочай групы ў складзе прадстаўнікоў адміністрацыі г. Ханты-Мансійска, генеральнага дырэктара ААТ "Рыбакамбінат Ханты-Мансійскі" і дэпартамента інвестыцый урада ХМАА — Югра на вядучае беларуска-германскае рыбаперапрацоўчае прадпрыемства ТАА "Санта-Бремор" (г. Брэст). Наладжваюцца адносіны з навуковымі арганізацыямі Беларусі, мясцовымі і рэгіянальнымі СМІ. Вывучаецца магчымасць перасялення беларусаў, у тым ліку этнічных, якія жывуць у ХМАА — Югра, на гістарычную радзіму ў рамках існуючай праграмы перасялення жыхароў аўтаномнай акругі, што пражылі на Поўначы больш як 20 гадоў.

У Дзень яднання народаў Расіі і Беларусі адбыўся ўстаноўчы сход грамадскай арганізацыі беларусаў Ніжнявартаўска. Старшынёй таварыства, якому адзінагалосна вырашылі даць назву "Белая Русь", выбраны Павел Сімановіч. Таварыства ўвайшло ў склад рэгіянальнай грамадскай арганізацыі "Нацыянальна-культурная аўтаномія "Беларусы Югры", якая, у сваю чаргу, уваходзіць у склад федэральнай НКА "Беларусы Расіі".

— Якія ў вас планы на будучыню?

— Працягнем працу над рэалізацыяй праекта "Танк", возьмем удзел у розных конкурсах, арганізуем відэаздымкі фільма пра жыццё і дзейнасць заслужанага нафтавіка В. Сідарэйку і г.д. Таксама мяне чакае шмат працы ў якасці члена Грамадскай палаты ХМАА — Югра, дзе з'яўляюся прадстаўніком ад больш чым 500 грамадскіх арганізацый Сургута.

— Дзякуй за размову.

Гутарыў
Уладзімір ЗАЯНЧКОЎСКІ,
член Саюза журналістаў Расіі

На здымку: актывісты грамадскага аб'яднання нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Беларусы Югры".

P.S. *Сёння Сургут называюць нафтавай сталіцай Расіі. Значны ўнёсак у развіццё горада і рэгіёна зрабілі беларусы. Яны складаюць тут адну з самых шматлікіх этнічных груп. Каля 10 тыс. чалавек жывуць у самім горадзе і 20 тыс. — у гарадах і мястэчках ХМАА.*

У.З.

Сувенір для госця

У студзені 2007-га падчас выніковага пасяджэння калегіі Міністэрства культуры краіны намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Аляксандр Косінец выказаў некалькі трапных заўваг: " Пераканаўча вас прашу звярнуць увагу на народныя промыслы. Аэрапорты, вакзалы, вялікія крамы павінны быць забяспечаны сувенірнай прадукцыяй... У 2006 годзе Беларусь наведала каля 600 тыс. турыстаў, у параўнанні з 76—80 тыс. у 2005-ым. Мы маглі б зарабляць на сувенірах каласальныя грошы, прычым экспартаваць нашы магчымасці ў гэтай сферы". Насамрэч, якія нацыянальныя сувеніры і прадметы народнай творчасці сёння можна набыць у агульнавядомых месцах продажу? Карэспандэнт "ЛіМа" вырашыў наведаць некаторыя крамы...

Думаю, што той, хто бываў у буйных універмагах сталіцы, змог упэўніцца — асартымент тавараў прыкладна адзін і той жа. Падобная сітуацыя і з сувенірамі — у ГУМе, ЦУМе, Гандлёвым доме "На Нямізе"...

У большасці выпадкаў сувеніры месцяцца непадалёк ад папулярных тавараў. Універмаг "Беларусь" размясціў секцыю з сувенірамі айчыннай вытворчасці ажно на 4-м паверсе. Добра, калі працуе эскалатар і маецца вялікае жаданне ў турыста набыць у Беларусі нейкі адмысловы падарунак...

Сувенірныя секцыі буйных універмагаў прадставілі цікавы выбар. Традыцыйныя беларускія лялькі, гліняныя фігуркі, такія мілыя і дзівакаватыя, міфалагічныя і зусім звычайныя. Вырабы з ільна — таксама наша адметнасць. Таму сурвэткі і абрусы магчыма набыць у такіх месцах.

З найбольш запамінальнага — масіўная кніга-папка з дзяржаўным гербам нашай краіны, выкладзеным з саломкі на чорным фоне драўлянага воклада. Без перабольшвання, падарунак вельмі салідны...

Звычайна разам з беларускімі таварамі прапаноўваюцца і расійскія. На першы погляд, наша лялька-гаспадынька выглядае даволі сціплай побач з мажнай матрошкай і распіснымі вырабамі а-ля хахлама. Але на візуальным узроўні найбольш уражваюць паліцы з саламянымі вырабамі.

Ёсць і прадметы, стылізаваныя пад савецкую эпоху. Напрыклад, каньячныя біклагі з кукардамі салдат савецкай арміі, гербам СССР, знакам прыналежнасці да гвардыі ды інш.

Асобны від — сучасны сувенір. Маю на ўвазе рэчы з выявамі мінскіх краявідаў: Прывакзальнай плошчы, Траецкага прадмесця, будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Але на некаторых цэнніках такіх рэчаў пазначана месца вытворчасці... Расія.

Акрамя буйных універмагаў, калі прайсціся па галоўным праспекце нашай сталіцы, то можна знайсці і не адну спецыялізаваную краму... Атрымліваецца, што самыя звычайныя сувеніры (маю на ўвазе лялек-гаспадынь, ільняныя вырабы) набыць у сталіцы няцяжка. Іншая справа — знайсці нешта арыгінальнае кшталту саламяных павукоў, саламяных коней, якія няблага глядзяцца ў гасцёўнях катэджаў ці кватэр з вялікай жыллёвай плошчай. Менавіта па такія адметныя вырабы народнай творчасці пакупніку-турысту давядзецца пабегаць і пашукаць іх у спецыялізаваных месцах продажу.

На жаль, няма ў Мінску і свайго Арбата, своеасаблівай "сувенірнай" вуліцы, дзе можна без цяжкасцяў знайсці ўсё, што душы турыста даспадобы, а менавіта наша, нацыянальнае, ад гарэзлівага брыля да кубачкаў з малюнкамі беларускай сучаснасці.

Сувенір — тавар ходкі. Чым болей прапаноў, тым большы выбар і верагоднасць яго набыцця пакупніком. Таму, калі наладзіць трывалыя сувязі паміж народнымі майстрамі і калектывамі, якія спецыялізуюцца на рамёствах, то ад гэтага будзе толькі карысць, як майстрам, так і гандлярам, а ўрэшце — дзяржаве.

Уладзімір ШУГАВЕЕЎ

Некаторыя пытанні кніжнай этыкі

Штодня вірлівае кніжнае жыццё ставіць перад аўтарамі, чытачамі і непасрэдна самімі супрацоўнікамі выдавецтваў шмат складаных пытанняў. Многія з іх мы ўжо абмяркоўвалі з прадстаўнікамі айчыннага кніжнага свету і пачулі самыя розныя, нават супярэчлівыя думкі. Зараз звернемся да некаторых уласнабеларускіх прыкладаў, а таксама да вопыту нашых кампетэнтных суседзяў, перш за ўсё расіян і украінцаў. Сёння ў нашым полі зроку — некаторыя этычныя праблемы кніжнай справы...

Увага, кантрафакт!

Адзін з самых надзённых момантаў кнігавыдавецкай этыкі — праблема кантрафактнай кнігі. Яна датычыцца, перш за ўсё, вучэбнай літаратуры. Той, хто здаваў экзамены за курс базавай ці сярэдняй школы, купляў кніжкі для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання, памятае, наколькі шмат прапаноў паступала ад гандляроў так званых кніжных развалаў, прыватных выдаўцоў з зусім невядомай маркай.

Памятаю, як адносна нядаўна, гадоў з дзесяць таму, сам здаваў у школе гісторыю Беларусі. Вядома ж, хацелася набыць кнігу танней. Як высветлілася, сквапны плаціць двойчы. Пазнаёміўшыся з тэкстам "білетаў" (назву выдавецтва я наўмысна не называю), хутка знайшоў шэраг недакладнасцяў, якія так і кідаліся ў вочы. Вядома ж, вяртаць не пайшоў — не было сэнсу.

Нізкаякасная вучэбная літаратура ад невядомых прыватнікаў, літаратура без грыфа Міністэрства адукацыі — гэта адно. Зусім іншае — выданне папулярных дапаможнікаў пад маркай агульнавядомага выдавецтва. Падробка, крадзеж, ашуканства...

У мінулым годзе інфармацыйнае агенцтва РосБалт (www.rosbalt.ru) паведаміла пра першы судовы працэс у дачыненні да кантрафактнага падручніка. Паведамлялася, што напрыканцы 2005 года ў Санкт-Пецярбургу і Ленінградскай вобласці было канфіскавана каля 90 тыс. экземпляраў псеўдападручнікаў. Адным з пацярпелых было найбуйнейшае расійскае выдавецтва "Просвещение".

У матэрыялах выніковай прэс-канферэнцыі па гэтай справе адзначана, што літаральна кожны дзесяты падручнік на расійскім рынку — падробка! Дарэчы, у 2006-м эксперты ацэньвалі агульны расійскі штогадовы тавараварот падручнікаў на суму больш як 100 млн. долараў ЗША.

У выніку аператыўных мерапрыемстваў падробкі знішчаны, а кнігавыдавец-злачынца атрымаў 3 гады пазбаўлення волі ўмоўна з выпрабавальным тэрмінам у 1 год. Тыя людзі, якія дапамаглі следству інфармацыяй, прэміраваныя грашыма ад выдавецтва "Просвещение" ў памеры 5 працэнтаў канфіскаванага накладу (а гэта немалая сума).

Супрацоўнікі "Просвещения" не толькі заахвочваюць, але і папярэджваюць лістамі буйныя друкарні, вядуць "Чорную кнігу" кантрафакта!

На думку тагачаснага намесніка гендырэктара выдавецтва "Просвещение" Мікіты Галалобава, кантрафактныя падручнікі друкуюцца ў дробных прыватнікаў ці ў тых выдавецтвах, якія маюць незагружаныя прадукцыяй магутнасці, што засталіся яшчэ з савецкіх часоў. Паліграфісты, як і рэалізатары з вышэйзгаданых намі кніжных кірмашоў, асабліва не цікавяцца зместам — грошы на першым плане. Адсюль і карані праблемы...

Нагадаем, што праблема кантрафакта датычыць і беларускіх кнігавыдаўцоў. Той, хто сачыў за нашымі гутаркамі з кіраўнікамі буйных дзяржаўных выдавецтваў, памятае гутарку з дырэктарам "Народнай асветы" Ларысай Мінько ("ЛіМ", №40, 6.10.2006). Тады Ларыса Іванаўна зазначыла, што супрацоўнікі выдавецтва сутыкаліся з падробнымі зборнікамі па матэматыцы, якія былі выдадзены пад маркай "Народнай асветы". Пірацкая кніжка — гэта дрэнная якасць выканання паліграфічнага прадукта, незастрахаванасць ад памылак у тэксце і, як вынік, удар па іміджы выдавецтва.

Дадамо, што выкарыстанне нізкаякаснай паперы, размыты тэкст у кантрафактных вучэбных дапаможніках можа адгукнуцца на здароўі вучня — перш за ўсё псуецца зрок.

Што каштоўнага можа ўзяць для сябе кніжны свет Беларусі з вышэйзгаданых фактаў? Безумоўна, нягледзячы на невялікія адносна Расіі памеры кніжнага рынку, нам таксама трэба паклапаціцца пра эфектыўную барацьбу з кантрафактнымі падручнікамі. А таксама зрабіць, напрыклад, у Інтэрнеце сваю "Чорную кнігу", куды заносіць усіх нядобрасумленных выдаўцоў на аснове афіцыйных звестак Міністэрства інфармацыі Беларусі.

Тонкая рыса сакральнасці

Вялікія этычныя праблемы могуць узнікаць на ніве самастойнага выдання рэлігійнай літаратуры, без узгаднення з афіцыйнымі прадстаўнікамі царквы...

Нядаўна ў Інтэрнеце прачытаў артыкул украінскага протаіерэя Ігара Рабко (апублікаваны ў газеце "Летопись православия", Запарожжа), прысвечаны якраз аднаму з этычных аспектаў кнігавыдавецкай дзейнасці — выданню і продажу псеўдаправаслаўнай літаратуры.

Аўтар зрабіў высновы пасля азнаямлення з кніжнай прадукцыяй у папулярных гандлёвых кропках свайго горада.

Як прыклад святар прыводзіць зборнікі рэцэптаў быццам бы ад цар-квы, выданні з казкамі-прыпавесцямі, месца якім, паводле словаў аўтара артыкула, у аддзеле фантастычнай кнігі, а не рэлігійнай. Таксама ім заўважаны кнігі пра жыццё вялебных пакутнікаў, бяздумна скампіляваныя з немаведама якіх крыніц...

Вельмі цікавай падаецца фінальная думка артыкула: "Сучасны рынак кніжнай прадукцыі выразна зарыентаваўся на нашы жарсці і лёгка закамуфліраваў іх пад духоўнасць. Шкада толькі, што мы іх не заўважаем. Альбо не хочам заўважаць." Адна з іх — прага. Часам рэлігійная кніга насамрэч можа ацэньвацца як бізнес-праект, які ў некаторых выдаўцоў не патрабуе экспертнай ацэнкі якасці зместу. Такім чынам, нядобрасумленныя кнігавыдаўцы пераступаюць тонкую рысу паміж мірскім і сакральным...

У адным з нядаўніх інтэрв'ю, якраз прысвечаным праваслаўнай кнізе ў жыцці беларускага грамадства, мы адзначылі, што сёння на Беларусі ўсё ж можна набыць кнігі, зместяк якіх выклікае сумненне ў прадстаўнікоў Беларускай праваслаўнай царквы. Думаю, што варта параўнаць рэлігійную кнігу без блаславлення экзархата з падручнікам без грыфа Міністэрства адукацыі. Ці захочаце вы набываць літаратуру без кніжных знакаў якасці? Тым больш, рэлігійную...

Сюрпрызы пад плёнкай

Добра, калі пра змест кнігі можна даведацца пагартаўшы выданне ў краме. Тады ў кампетэнтнага чытача ёсць шанц не натрапіць на кніжнае пустазелле. Апошнім часам як на кірмашах, так і ў крамах можна знайсці наглуха зацэлафаненыя кнігі, з якімі пакупнік не мае магчымасці азнаёміцца. Але...

Кнігалюбы маглі заўважыць, што так упакоўваюць і дарагія альбомы па жывапісе. Плёнка абараняе ад пашкоджанняў, адбіткаў пальцаў на глянцавай вокладцы. Такія кнігі можна параўнаць з іншай медыя-прадукцыяй — кампакт-дыскамі. За якасць "ліцэнзіёнкі" адказвае і вытворца, і рэалізатар...

Але ёсць на беларускім рынку зацэлафаненая "мастацкая" (збольшага, графаманская) кніга, зместяк якой схаваны знарок. Звычайна гэта літаратурная спекуляцыя на аснове вольнага трактавання сюжэтаў папулярных кінафільмаў, прычым узровень зместу зусім нешэдэўральны. Атрымліваецца нейкі флірт з чытачом, само сабой паўстае пытанне: "Ці этычна выдаваць такую літаратуру?" Пакуль што, на жаль, гэта ўласная справа кожнага кнігавытворцы.

Мы разгледзелі толькі некаторыя аспекты этыкі кніжнага свету, пакінуўшы астатняе для далейшага разгляду. Трэба вызначыць, прыкладам, мяжу паміж гістарычнай літаратурай пра Другую сусветную вайну і схаванай прапагандай фашысцкіх каштоўнасцяў, даследаваць праблему пераманьвання аўтараў выдаўцамі-канкурэнтамі; пытанні этыкі мастацкага афармлення літаратуры ды інш. І няхай сёння некаторыя з іх падаюцца не такімі абвостранымі, але праз нейкі час кніжнікі з імі могуць непасрэдна сутыкнуцца...

Сяргей ДУБОВІК

Фотакалаж аўтара

Велічная справа

Юрый Чарняк — аўтар 70 экспазіцый і 40 мастацкіх канцэпцый музеяў на Віцебшчыне, у тым ліку Марка Шагала, Пятра Машэрава, Міністэрства ўнутраных спраў, "Віцебскэнерга", Лукомльскай ГРЭС, воінаў-інтэрнацыяналістаў і іншых.

Вось які запал энергетыкі ў мастака! Які размах працавітасці і творчага натхнення, якая любоў да жыцця, да сяброў, які нязгубны аптымізм!

15 лютага Віцебскі музей воінаў-інтэрнацыяналістаў традыцыйна наведваюць салдаты, што ваявалі ў Афганістане, маці загінуўшых там сыноў, былыя саветнікі па вядзенні вайны ў Афганістане, карэспандэнты, таму з гэтай нагоды ў сваім нарысе хачу расказаць і пра гэты музей, і пра яго стваральнікаў.

У 1990 годзе Ю. Чарняк задумаў велічную справу жыцця — стварыць музей воінаў-інтэрнацыяналістаў. Тры гады калектыў натхнёных людзей пад кіраўніцтвам Юрыя Сямёнавіча рабіў немагчымае — працаваў апантана, без святочных дзён, па 16 — 18 гадзін.

Хай розныя людзі па-рознаму гавораць пра вайну ў Афганістане, але мужнасць і рашучасць — якасці самі па сабе дастатковыя — будуць жыць стагоддзямі.

Цікавасць да Афганістана ў мастака-экспазіцыянера з'явілася тады, калі ён ад сястры даведаўся, што яго пляменнік дапамагае пушчуністам, хазарэйцам і чараймакам "будаваць сацыялізм". Да Ю.Чарняка ішло шмат інфармацыі, і ў сэрца мастака закралася надзея расказаць праўду і выклікаць спачуванне да загінуўшых, цікавасць да беззапаветнай адвагі герояў. Гэта была вельмі цяжкая вайна, а вораг — жорсткі і смелы. А як жа інакш? Маленькім жыхарам Афганістана ўжо пры нараджэнні спачатку даюць зброю, а потым — імя. Юрыю Сямёнавічу стварэннем гэтага музея хацелася выклікаць і маленне, і пакаянне ў нашага народа.

Спачатку мастак зрабіў эскіз-макет музея і запрасіў да сябе ў майстэрню начальніка аддзела культуры В. Кібісава.

Сын Чарняка, Алег, таленавіты гітарыст, сядзеў у суседнім пакоі і спяваў афганскія песні — ствараў эмацыйны фон. Расчулены В. Кібісаў прыняў эскіз. "Такі музей патрэбен нам", — прамовіў ён.

Але ж макет — гэта толькі "гузік" да паліто, а на "паліто" патрэбна было назбіраць шмат матэрыялаў. І вось тут мастаку дапамагло ўменне аб'ядноўваць вакол сябе таленавітых людзей. Так, напрыклад, у Доме піянераў Першамайскага раёна ўжо быў створаны Ларысай Відус пакойчык, прысвечаны памяці "афганцаў", і яна падаравала шмат каштоўных экспанатаў будучаму музею. У Баравусе, у ваенным гарадку, быў таксама музей, які расказваў пра вайну ў Афганістане. Калі наша віцебская 103-я дывізія пакідала Афганістан, яна вывезла з яго многія трафеі: гарматы, міны, гранатамёты — увесь "антураж" той страшэннай вайны. Навуковы супрацоўнік гэтага музея пайшоў Ю. Чарняку насустрач і падарыў для яго новага музея ваенную калекцыю. Былы саветнік у Афганістане Валерый Чкалаў, як мог, дапамагаў свайму сябру Юрыю Сямёнавічу: знаходзіў сем'і загінуўшых, размаўляў з імі, пераконваў, што пісьмы і асабістыя рэчы воінаў павінны быць у музеі. Чарняк праводзіў у жыццё мастацкую канцэпцыю, а Чкалаў — ідэйна-тэматычную: было прачытана па некалькі разоў каля 700 пісем загінуўшых, але ж з іх трэба выбрать адзін — два сказы, ды такія, каб яны краналі сэрцы.

Пад музей вылучылі памяшканне ў жылым доме, пабудаваным для сваіх сем'яў "афганцамі": двух- і трохпакаёвыя кватэры аб'ядналі, і на плошчы 136 кв.м закіпела праца.

...Трэба было расказаць пра 711 загінуўшых на вайне ў Афганістане беларусах, пра 40 памерлых адразу пасля вайны, пра 870 воінаў, якія засталіся інвалідамі, у мірны час вайна "дагнала" яшчэ 10 тысяч салдат, столькі ж памерла ў апошнія гады ад ран і хвароб. Ды вось стварэнне такога жалобнага музея давялося "замарозіць" на некалькі год. Справа пайшла толькі тады, калі М. Федарчук (у той час мэр горада) пазнаёміўся з задумкай афганцаў і ўзяў музей на баланс аддзела культуры гарвыканкама.

Дырэктарам музея стаў удзельнік вайны ў Афганістане І. Мажайцаў, навуковым супрацоўнікам — былы саветнік па вядзенні вайны ў далёкай краіне В. Чкалаў, загадчыцай фондаў — Л. Відус.

Пра прычыны вайны, яе гісторыю, а таксама жыццё афганцаў расказвае першая зала. У ёй знаходзяцца мужчынскае і жаночае адзенне, галаўныя ўборы, упрыгожанні, зброя і прылады працы, на наш погляд, вельмі прымітыўныя. Якая памылка — будаваць сацыялізм у краіне, дзе 80 працэнтаў насельніцтва — качэўнікі, дзе ўся зямля належыць памешчыкам.

Другая зала прысвечана 103-й віцебскай паветрана-дэсантнай дывізіі. У ёй знаходзяцца шлемы і бронежылеты (вельмі цяжкія, асабліва летам у спякоту), камсамольскія білеты, запісныя кніжкі і дзённікі, гімнасцёркі з запечанай крывёю нашых байцоў, карта з усімі савецкімі заставамі і карта "духаў".

Трэцяя зала мемарыяльная: у ёй на падлозе ляжыць чырвоны палас, нібы пралітая на зямлю кроў маладзенькіх салдат, бо іх гінула шмат, асабліва на пачатку вайны. Столь абклеена маскіровачнай сеткай, сцены ў знак жалобы пафарбаваныя ў чорны колер, у гільзах, стылізаваных пад вазы, стаяць чырвоныя гваздзікі. Вельмі важна, каб мастацкія сродкі стваралі адпаведны настрой, але яшчэ важней, каб стэнды былі запоўнены ўрыўкамі пісем, каб яны краналі сэрцы.

Немагчыма без слёз чытаць ліст 19-гадовага М. Ключонка, які ён напісаў свайму бацьку: "Татачка, калі я вярнуся дадому, я буду цалаваць зямлю, дрэвы, кветкі, татачка, я буду даражыць кожным мігам свайго жыцця. Татачка, няма нічога на свеце даражэй, чым праца і сям'я. Тата і Вы будзеце мной ганарыцца". Праз 38 дзён хлопец загінуў...

Калі ўваходзіш у музей, кідаецца ў вочы вялізны стэнд: "За 20 хвілін да смерці. ТАСС". На ім "Наіўны хлопчык з сіняй казкі — Ён апантана верыць дню". Чаму яму выпаў такі жорсткі лёс?

Я згодная з экскурсаводам Віктарам Шыршовым, былым "афганцам", цікавым і мужным чалавекам, які пры развітанні мне сказаў: "Гэта нялёгка — кожную раніцу пачынаць свой працоўны дзень, гледзячы на прыгожага юнака, амаль хлопчыка, які загіне праз 20 хвілін. Але ж подзвігу ў жыцці заўсёды застаецца месца".

Калі выходзіла з музея, зноў паглядзела ў вочы салдаціку, які загіне праз 20 хвілін. Кінула ўзрушаны погляд на скульптуру А. Гвоздзікава "П'ета", на карціну А. Скавародкі "Маці перад партрэтам загінуўшага сына", на графічныя работы Кісялёва "Дума пра сябе", "Такое кароткае пісьмо".

Непадалёк ад музея, яго працягам з'яўляецца помнік віцебскага скульптара Івана Казака воінам-інтэрнацыяналістам.

...Памірае 20-гадовы дэсантнік-парашутыст. ... Над юнаком узвышаецца каплічка, увянчаная.

...Можна па-рознаму адносіцца да вайны ў Афганістане: была яна інтэрнацыянальным абавязкам ці супрацьстаяннем дзвюх сістэм — Амерыкі і Савецкага Саюза? Ці павінны былі маці аддаваць сваіх, часам адзіных дзяцей на чужую вайну? А можа, трэба было біць у набат, збіраць подпісы, змагацца за сваіх сыноў? Гэты музей (дарэчы, адзіны на тэрыторыі былога СССР) — толькі подступ да праўды, да пакаяння, да малення...

Наталля САЛАЎЁВА

Дзеці і літаратура

Прызнаюся: люблю “памышкаваць”, трапіўшы ў бібліятэку ў пошуках кнігі, адрасаванай дзецям. Дый дома цягнецца рука да шуфляды, дзе месцяцца творы І. Сяркова, І. Навуменкі, К. Чорнага, М. Лынькова пра вайну. У творах памянёных аўтараў зашмат болю, расцяглага смутку.
Канечне, віной таму — памяць.

І сёння бачу той гаршчок з бульбай, выхаплены маці з печкі, і тыя паходы па ўмерзлай галашчокам дарозе па дзёркі з сястрой на патачны заводзік па пераапрацоўцы бульбы.

І пісалі пра гэта, пра сваё дзяцінства Л. Дайнека, М. Парахневіч, У. Глушакоў, Я. Брыль, І. Шамякін, У. Караткевіч, І. Навуменка...

Прызнаюся яшчэ ў адной сваёй слабасці: не пераношу на дух тых, хто бачыць у праявах дзяцінства негатыўнае. Такі тып існуе.

Шмат гадоў знаёмы я з настаўнікам пачатковых класаў М. П. з гарадской школы. Пры сустрэчы М. П. з'едліва смяецца — прачытаў верш паэта, які ўслаўляе рэчку, дзе бацькі пасля працы змывалі пыл, бруд і пот.

— Што новага сказаў, мо чулі, паэт яшчэ пра экалогію? — цікавіцца настаўнік, шамкаючы клёцкамі-губамі. Кажа мне:

— Ахмурэла дзіцячая літаратура, на паэтычным шнуры адна балотніца.

Няўжо і праўда няма сёння каму завіхацца ў дзіцячым цэху?

Няпраўда! Дзіцячая літаратура існуе.

Пазнаёмцеся з цудоўнымі вершамі таленавітага М. Пазнякова, празаічнымі творамі Г. Чарказяна, А. Бутэвіча, А. Бадака, П. Васючэнкі, Я. Каршукова, А. Масла, паэтычнымі — М. Чарняўскага, Р. Баравіковай, І. Муравейкі, В. Шніпа, В. Жуковіча.

Раіса Баравікова слушна пісала на старонках часопіса “Маладосць”:

“Калісьці грымела наша проза, потым шырокую славу мела наша паэзія, а вось прыкметы гэтага ёсць у дзіцячай літаратуры, і, улічваючы, што ва ўсім свеце літаратура для дзяцей даволі-такі дэфіцытная рэч, мы можам някепска пра сябе заявіць”.

У 1970 гады попытам у чытачоў карысталася паэзія А. Лойкі, К. Камейшы, В. Жуковіча. Свет дзіцячага ўспрымання багаты на колеры, фарбы, адценні. Гэту асаблівасць дзіцячага мыслення разумеў Я. Крупенька, які зместам твораў сцвярджаў: кожная пара года адметная, прывабная для дзіцячай уцехі, звонкіх гульняў. Трэба толькі пільна прыглядацца, і тады адкрыеш для сябе нешта новае, цікавае, чаго раней не заўважаў і не ведаў. Маю на ўвазе верш “Цішыня”, дзе сказана:

Стаміўся вецер,
Нібы трактарыст
Пад галаву паклаў свае далоні.

Я. Крупенька, забыты на сёння, не паддаваўся спакусе вылучыць на першы план знешнія адзнакі праявы.

Малюнак пэўнай з'явы ў Я. Крупенькі ажывае за кошт выяўлення і паказу ўнутраных сувязяў паміж прыродай і чалавекам.

Аўтар ажыўляў і адухаўляў прадметы, выкарыстоўваючы дынамічную форму дыялога.

Валодалі вершам народнага складу Р. Семашкевіч, П. Прануза, В. Макарэвіч. Напрыканцы стагоддзя вывеў на футбольнае поле сваіх герояў празаік А. Камароўскі (“Пенальці”, Мінск, “Ураджай”, 2001 г.).

Ёсць сёння здабыткі і ў галіне дэтэктыўна-прыгодніцкага жанру.

Прыгоды, як “якасць эстэтычнага шэрагу” (вызначэнне вядомага даследчыка А. Вуліса), займае значнае месца ў творах М. Лынькова (сфармуляваў рамантычны стыль героіка-патрыятычнай аповесці, разглядаючы праблему гераічнага як псіхалагічна-сацыяльную), У. Караткевіча (выявіў дыялектыку сувязі агульнага і адзінкавага, адшукаўшы карані нацыі ў гісторыі), Л. Дайнекі, які давёў форму рамана да метафары, падаўшы прыгоду праз гісторыю). А вось празаік М. Чаргінец у сваіх творах дэтэктыўна-прыгодніцкага жанру прадставіў сімбіёз прыпавесці і сімволіка-алегарычнай умоўнасці.

І ўсё ж я падзяляю настальгію Р. Баравіковай. Менавіта ў 60—70 гады актывізавалася крытычная думка, праблемамі дзіцячай літаратуры стала займаліся крытыкі і літаратуразнаўцы — М. Яфімава, Р. Літвінаў, Ю. Канэ, М. Смолкін, С. Марчанка, Э. Гурэвіч, Я. Герцовіч, М. Барсток, В. Атрашкевіч. З'яўляліся ў друку нават манаграфіі пра творчасць В. Віткі, З. Бядулі, Я. Маўра.

Сёння крытыкаў і літаратуразнаўцаў, якія б займаліся вывучэннем стану дзіцячай літаратуры, са свечкай днём не адшукаеш. Хто ж ратуе становішча? Адсутнасць увагі да праблем дзіцячай літаратуры спрабуе кампенсаваць, бадай, толькі часопіс “Маладосць”.

Вось і хачу акрэсліць праблему: прапагандыстам дзіцячай літаратуры павінен стаць сам пісьменнік. Але зазначу: ягоны жыццяпіс павінен прыцягнуць увагу дзяцей.

У мяне ёсць нямала прыкладаў у абарону сваіх тэзісаў. У свой час у наш райцэнтр прыязджаў з Мінска Мікола Чарняўскі. Крыштальна чысты чалавек, абаяльны, шчыры. Ён наведваў школы, дапамагаў рэдакцыі райгазеты “Сцяг працы” выпусціць літаратурную старонку, даючы дарогу пачаткоўцам. У выступленнях далучаў слухачоў школьнай аўдыторыі да лёсу творцаў — Янкі Купалы, Якуба Коласа, М. Лынькова, П. Броўкі. Дзеці палюбілі паэта, ахвотна набывалі яго паэтычныя зборнікі.

Па шляху пісьменніка сёння пайшла мар'інагорская паэтэса В. Савасцюк, аўтар кнігі для дзяцей “Арэлі на вясёлцы” (1966 г.), калектыўнага зборніка “Самавар у лесе” (1995 г.). Вольга Уладзіміраўна — часты госць у Мар'інагорскай СШ № 2, у сваёй Пухавіцкай СШ, дзе некалі вучылася, бывае. Сёння яна шукае ў школах таленты, далучае дзяцей да прыгажосці.

Пра сілу эмацыянальнага ўздзеяння асобы пісьменніка на вучняў магу меркаваць, нагадаўшы прыезд у Светлаборскую СШ паэта Ганада Чарказяна.

Выхаванне эстэтычнага густу — найпершы клопат пісьменніка. У сувязі з гэтым мне хочацца нагадаць 60-я гады. Я працаваў тады ў васьмігадовай школе на Палессі. Вёска была ў 100 км ад Пінска. І вось у гэту глухмень прыехаў з Мінска пісьменнік, сустрэўся з вучнямі. Руднянцы ў тыя гады на вочы цягніка не бачылі, тым больш жывога пісьменніка. Пісьменнікам гэтым быў Мікола Гіль, які і прапанаваў мне распачаць дыскусію па праблемах дзіцячай літаратуры на старонках газеты “Літаратура і мастацтва”.

— Пішыце артыкул, пільнуючыся прынцыпу: выхаваўчае, пазнавальнае значэнне дзіцячай літаратуры, — кансультаваў мяне Мікола Сымонавіч, дадаўшы: — У першую чаргу ўсё ж трэба будзе ў артыкуле звярнуцца да праблем эстэтычнага выхавання сродкамі літаратуры.

Артыкулам маім “Чым будуць абавязаны” і распачыналася на старонках тыднёвіка сорак гадоў таму дыскусія, якая цягнулася паўгода.

Завяршаючы артыкул, мушу падкрэсліць: дзіцячая літаратура не мае права быць гэткім лёгкім вабікам у наш няпросты час. Яна павінна жывіцца з чыстых крыніц нацыянальнага беларускага духу.

Браніслаў ЗУБКОЎСКІ

Фота К. Дробава

Два аўтары — адна тэма

Што мяне радуе ў сённяшнім беларускім кнігавыданні, дык гэта ярка акрэсленая цяга прыватных выдавецтваў і саміх літаратараў рабіць тое, што і раней характарызавала беларускую літаратуру. Ужо даўно нікога не здзіўляе беларускамоўная вершаваная кніга, выдадзеная за ўласны кошт. Радуюць абсягі краязнаўчай літаратуры, якая прыходзіць да чытача па-беларуску з прыватных выдавецтваў. І нават кнігі ўспамінаў, літаратурнай крытыкі выдаюцца прыватным чынам.

Вось і ў Брэсце пабачыла свет “кніга абразкоў пра Васіля Вітку, ягоны час, сяброў”, напісаная пісьменнікам з Жабінкі Расціславам Бензяруком і сынам класіка беларускай дзіцячай літаратуры Вісарыёнам Крысько. Чаму менавіта ў Брэсце? Відаць, пра гэта парупіўся Расціслаў Бензярук. Варта заўважыць, што брэсцкая “Акадэмія” праз сваю цікавасць да сур'ёзных кніг, да творчасці аўтараў багатага культурнага рэгіёна набывае ўсё большую вядомасць. А астатняе тлумачэнне — ва ўступным слове Расціслава Бензярука: “...гады тры назад пры сустрэчы прапанаваў Вісарыёну Крысько напісаць успаміны пра яго бацьку — Васіля Вітку.

Вісарыён Крысько, доктар па прафесіі, сумняваўся ў сваіх пісьменніцкіх здольнасцях, але мне ўдалося пераканаць яго напісаць успаміны. І, як выявілася, нездарма...

Летась, калі быў у Мінску, зайшоў да Крысько. Вісарыён Цімафеевіч прыняў мяне надзвычай гасцінна, ветліва і паказаў свае ўспаміны. Напісанае спадабалася з першых старонак. Імпанавалі ўменне аўтара заўважыць нешта такое, што іншыя, можа, і не ўбачылі б, ледзь прыкметная ўсмешка, добры гумар (ці не віткаўскія) ды цудоўнае валоданне роднай мовай. У кожным радку апісваўся нейкі факт з бацькавага жыцця.

Трымаючы ў руках такое багацце, я зразумеў, што артыкула, якім я першапачаткова хацеў адзначыць 95-годдзе Віткі, занадта мала: трэба было рабіць кнігу.

Так нарадзілася задума сумеснай кнігі ўспамінаў. Першая частка яе — “Ядлоўцавы посах” — напісана Вісарыёнам Крысько, а другая — “Магія слова” — мною”.

Зусім не трэба фальшывіць ці перабольшваць, калі ахарактарызаваць гэтую кнігу наступным чынам: чытаецца на адным дыханні. Сын пісьменніка, нягледзячы на тое, што нарадзіўся ў 1937 годзе, узнаўляе ў памяці даваеннае жыццё сям'і Крысько. Пэўна ж, для многіх стане адкрыццём той факт, што ў “37-м бацьку выключылі з камсамола і выгналі з рэдакцыі “Чырвонай змены” “за страту пільнасці і лібералізм”...” Вісарыён Крысько сведчыць: “Сяброў стала менш, але нас не пакінулі ў бядзе браты Лыньковы: Рыгор узяў на сваё імя тэрміновую работу і перадаў яе бацьку. Той пачаў перакладаць творы Чэхава і, сумесна з Рыгорам, паэму Маякоўскага “Добра!”

Хоць бацьку аднавілі на працы праз дзевяць месяцаў, жыць было цяжка. Гаспадыня прыватнага дамка па вуліцы Розы Люксембург, якая здавала нам пакойчык, спалохалася, пагнала з кватэры “лішэнца” і яго сям'ю. Тады Міхась Ціханавіч Лынькоў дамогся праз Літфонд, каб нас пасялілі ў флігельчыку вартаўніка пры Доме творчасці ў Пухавічах. У гэты час бацька захварэў на раматус і пачаў хадзіць з кіёчкам”. У біябібліяграфічным слоўніку “Беларускія пісьменнікі” пазначана, што паэма Маякоўскага ў 1940 годзе пабачыла свет асобнай кнігай. Перакладчыкі — Рыгор Лынькоў і Цімох Крысько.

Сын пісьменніка досыць цікава расказвае пра ад'езд з Беларусі ў чэрвені 1941 года, пра першыя пасляваенныя гады. Лаканічныя ўспаміны пра Эдуарда Самуйлёнка, Кузьму Чорнага, Міколу Лобана яскрава дапаўняюць ужо вядомыя нам біяграфіі знакамітых літаратараў. Асабліва кранаюць нататкі, дзе расказваецца пра Случчыну, пра Еўлічы, якія выправілі ў вялікі свет Васіля Вітку.

“Магія слова” — раздзел кнігі, напісаны Расціславам Бензяруком, — лагічна ўкладваецца ў канцэпцыю выдання. Пісьменнік сабраў свае “зярняты памяці” пра мудрага і ўважлівага літаратурнага настаўніка, з якім яму давялося сутыкнуцца на ніве шчыравання ў дзіцячай літаратуры. Расказвае Р. Бензярук пра знойдзеную Віткам назву яго казкі — “Зайцаў кажушок” (спярша было “Зайцава футра”). З лёгкай рукі Цімоха Васільевіча твор гэты пачаў падарожжа па “Вясёлцы” і школьных падручніках. Была і перадача ў тэлевізійнай “Калыханцы” паводле гэтай казкі.

Вісарыён Крысько сведчыць: “Сяброў стала менш, але нас не пакінулі ў бядзе браты Лыньковы: Рыгор узяў на сваё імя тэрміновую работу і перадаў яе бацьку. Той пачаў перакладаць творы Чэхава і, сумесна з Рыгорам, паэму Маякоўскага “Добра!”

У абразках Расціслава Бензярука ёсць і пра тое, як Цімох Крысько стаў Васілём Віткам, гісторыя стварэння легендарнай казкі “Вавёрчына гора”, іншыя дэталі творчай і жыццёвай біяграфіі дзіцячага пісьменніка і сапраўднага педагога.

Адно шкадаванне. Кніга пра заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, літаратара, чыя творчасць адзначана Міжнародным ганаровым дыпломам імя Ганса Хрысціяна Андэрсена, аўтара “Чытанкі-маляванкі”, “Беларускай калыханкі” і яшчэ многіх кніг, выдадзена накладам усяго толькі...55 асобнікаў. Можна, безумоўна, у чарговы раз абурацца, можна і вінаватых пашукаць сярод безуважных чыноўнікаў ад адукацыі, культуры і г.д. Ды хіба ж толькі ў чыёйсьці вінаватасці справа?! А ці не лепей катораму з нашых аўтарытэтных літаратурна-мастацкіх часопісаў перадрукаваць успаміны сына вядомага пісьменніка, бо тыражы ж, дзякуй Богу, маюць яны не 55 асобнікаў? Мо тады кніжачку і на радзіме Васіля Віткі на Случчыне заўважаць, як і па ўсёй Беларусі... Мо станецца падзеяй гэтая публікацыя і для рупліўцаў дзіцячых бібліятэк, якія, канечне ж, Вітку, яго творчасць шануюць і кнігі цудоўнага нашага казачніка юнаму чытачу для знаёмства найперш раяць.

Мікола МІРШЧЫНА

Вечная суладнасць

На базе СШ № 24 прайшла сустрэча з пісьменніцай Зінаідай Дудзюк. Арганізатар мерапрыемства Ганна Цыпрынюк падрыхтавала выставу кніг і зарыентавала аўдыторыю на цікавы дыялог. Пытанні вучняў былі скіраваны на веданне творчасці пісьменніцы. Знаёмства з новай кнігай “Кола Сварога” прывяло да думкі, што вывучэнне славянскай міфалогіі — справа цікавая і патрэбная, бо раскрывае невядомыя старонкі, дапамагае зразумець сваё ў кантэксце сусветнага.

Паэтычнае слова Зінаіды Дудзюк гучала шчыра і нязмушана. Дзеці чыталі вершы са зборніка “Так і не”, “Падданыя кахання”.

Пазнаёміліся вучні і з раманам “Год 1812”, дзе адлюстраваны гістарычныя падзеі на тэрыторыі Беларусі.

Паэтэса да ўсяго навакольнага падыходзіць з адкрытай душой. Вершы яе, як споведзь сэрца, дзе усё проста: “а калі раптам і трапляю ў цень, дык не бяда — часова ўсё на свеце...”

Прырода малюецца залатымі і блакітнымі фарбамі, бо ў ёй — гармонія, вечная суладнасць. Родныя краявіды ў вершах яскравыя і запамінальныя.

Пачуццё любові да Бацькаўшчыны, мовы, культуры народа — вось тое важнае, на што звярталася ўвага падчас сустрэчы і чаму вучыць творчасць Зінаіды Дудзюк.

Ніна ДРЫК

Мастацкая праўда

Праблема мастацкай праўды заўжды была на ўвазе і тэарэтыкаў літаратуры, і яе крытыкаў, і, безумоўна, саміх творцаў. Хемінгуэй характарызаваў мастацкую праўду як "штосьці сапраўды праўдзівае, а іншы раз і больш праўдзівае, чым сама праўда". Арыстоцель сцвярджаў, што мастацтва — не капіраванне жыцця, а яго верагоднасць, спецыфічнае праектаванне найбольш магчымага варыянта. Бабель гэтаксама падкрэсліваў, што мастацкай гісторыі зусім не трэба быць падобнай да жыцця, гэта само жыццё імкнецца быць падобным да добра прыдуманай гісторыі. ...Шчыра кажучы, добрых, светлых, змястоўных і аптымістычных гісторый, якія маглі б прэтэндаваць на статус, так бы мовіць, сучаснага "жыццёвага арыенціра", сёння літаратуры яўна бракуе.

«Полымя» № 3

Мастацкая праўда паэзіі Вольгі Русілкі ў вялікай ступені атаясамліваецца з "жаночай праўдай":

Гэта як подых
лёгкага летняга ветру.
Гэта як дотык
пеннай пяшчоты прыбою.
Гэта як водар
спелага спеўнага бору...
Супраць бяды заклінанне —
наша з табою каханне.

У гэтым жа ключы ўвасабляецца мастацкая праўда Валянціны Паліканінай:

Якое шчасце — пакахаць,
Гадзін не заўважаць і сутак.
Кахаць — як водар удыхаць
З блакітных сэрцаў
незабудак.

Каханне — сонечны матыў
Над змрочнай стыласцю
паўстанка.
І той — вар'ят,
хто задушыў
Душы хвалюючае танга.

Рубрыка "Палымянскі дэбют" прадстаўляе паэтычную творчасць дзевяцікласніка сталічнай школы № 51 Паўла Барахвостава. Юны паэт мысліць высокімі матэрыямі, усе вершы гучаць урачыста — "на нястрымнай надломленай ноце", некаторыя дароўніваюцца да прысягі:

І плача свет наш у нудзе:
"Збаўлення час, ты дзе,
ты дзе?!"
Чакаць нядоўга, грэшны свет,
На зломе эраў ты стаіш:
Ідзе здалёк да нас Паэт,
Каб за цябе пайсці на крыж.

З паўгадовым перапынкам (папярэднія "фільмы" друкаваліся ў 2006 г. у №№ 7, 8) часопіс працягвае публікацыю кінарамана Валянціны Коўтун "Спасам пакліканыя", прысвечанага "подзвігу святой Апякункі беларускага народа Еўфрасінні Полацкай". ...Прыгадалася, як некалькі год таму на філфаку БДУ праходзіла творчая сустрэча Аляксея Дударава са студэнтамі. Дыялог з аўдыторыяй драматург пачаў з пытання: "Хто з вас любіць чытаць п'есы?" Сярод прысутных, якіх было не менш як сотня чалавек, ніхто не падняў руку. Дудараў іранічна ўсміхнуўся і сказаў: "Я таксама не люблю. П'есы трэба глядзець у тэатры..." Па-мойму, слушнае меркаванне.

Бытуе думка, што творы малых жанраў — гэта спроба пяра, "разведка", а ўжо буйныя — пэўны паказчык. Можа, і так. Толькі абразкі Леаніда Левановіча "І смех, і слёзы, і любоў" мне асабіста прыйшліся па гусце нават больш, чым некаторыя ранейшыя раманы аўтара. Лаканічныя гісторыі складаюцца пераважна з яркіх аўтабіяграфічных эпізодаў, знаёмяць з цікавымі жыццёвымі сітуацыямі. Імпануе гэтаксама апавядальная манера пісьменніка — ураўнаважаная, удумліва-памяркоўная, шчырая, выклікаюць прыязнасць героі — сумленныя і добрыя людзі.

Калі *мастацкая праўда* Леаніда Левановіча зараджае аптымізмам, то апавяданні Валянціны Кадзетавай, дзе ўвасоблены негатыўныя з'явы нашага жыцця, выклікаюць пачуцці кардынальна супрацьлеглыя. Сюжэты ўсіх трох твораў адлюстроўваюць *страшную праўду* — жорсткую, амаль драпежную чалавечую сутнасць: у адным апавяданні — расправу прадаўшчыц з цяжарнай жанчынай, што скрала ў краме кавалак масла; у другім — помслівыя здзекі пакрыўджанай нявесткі з паралізаванай свякрухі; у трэцім — абыякавасць сына да маці...

Часопіс працягвае друкаванне дзённікаў Івана Шамякіна.

Рубрыка "На паверцы — імёны" прысвечана Алесю Звонаку.

У полі зроку "Школьнага фа-культатыва" — драматургія Мікалая Матукоўскага.

У артыкуле "Парадоксы нашага жыцця" Таццяна Шамякіна разглядае некаторыя з'явы сучаснасці "з аднаго боку... з другога боку". Аўтар падкрэслівае, што жыццё "ўсё на парадоксах, і ў кожнай з'яве можна бачыць яе генезіс, развіццё, заняпад — элементы ўсіх этапаў. Гэта цяжка — так бачыць, але неабходна: каб жыць, выжываць, адчуваць сябе шчаслівым. <...> Задача даследчыка — калі не разбурыць грамадскія сучасныя міфы, то хоць бы згадаць пра іх".

"Крытыка і літаратуразнаўства" прадстаўлена артыкуламі Серафіма Андраюка "Мікола Лупсякоў" і Евы Лявонавай "Беларускія алюзіі ў творчасці Уладзіміра Караткевіча".

«Маладосць» № 3

Мастацкая праўда маладых празаікаў даволі змрочная. Абодва апавяданні Зараславы Камінскай характарызуюцца трагедыйным светаадчуваннем. У творы "Цыбуліна", які аўтар раіць чытаць "седзячы ў сталоўцы, у адзіноце" — трагедыя вынікае з вялікай любові: бацька так моцна любіць дачку, так перажывае за яе лёс (дазволю сабе заўважыць — без аніякіх падстаў), што яго наведвае "крамольная думка: хай дачка памрэ зараз — маладая і шчаслівая. Нейкі хуткі няшчасны выпадак! Ляжа ў труну разам з марамі, ідэямі, надзеяй, каханнем, сытая. Без болю, нянавісці і пасляродавага тлушчу. Ніхто не пахавае яе лепш за яго. І можна будзе сфатаграфаваць хаўтуры, здымак наклеіць у альбом, каб потым вечарамі разглядаць з жонкай малюнкі светлага жыцця іх дзіцяці". Дзякуй Богу, бацька перадумаў. Вырашыў урэшце так: "Жыві, дачка, я не вызвалю цябе ад гэтага цяжару. І не буду больш прасіць для цябе смерці — бацькі павінны быць жорсткімі. <...> Ты будзеш жыць замест мяне, змагайся, будзь моцнай, а я... пакуль змагу — буду гатаваць табе боршч".

Другі твор — "Чорна-белае апавяданне" — аўтар рэкамендуе чытаць "у ванне, седзячы на халоднай падлозе. І каб з крана пакрыху капала вада" — увасабляе трагедыю з-за "не-любові". Гераіня не кахае і пакутуе ад таго, што не здольна на гэтае пачуццё. ...Верагодна, я не праніклася "пакутлівай праўдай" Зараславы Камінскай якраз па той прычыне, што не выканала парады аўтара (наконт сталоўкі, ванны і вады з крана). Але, падаецца, калі сюжэты надуманыя, а пафас штучны, то твор не закране нават калі чытаць яго пад гукі пахавальнага маршу.

Маладосцеўскі "Фантаст" змясціў тры апавяданні Марыі Шамякінай. Тут гэтаксама валадарыць змрок. Сімволіка сюжэтаў пераважна інфернальная, пафас — эсхаталагічны. Як на маю думку, то такія ўзоры творчасці нядрэнна было б друкаваць з папярэджаннем, накшталт "Оставь надежду всяк сюда входящий"...

Асноватворнымі эпізодамі аповесці Алеся Бычкоўскага "Анамалія" сталіся глабальныя катастрофы XX стагоддзя — Чарнобыльская катастрофа і падзеі Вялікай Айчыннай вайны. У час армейскіх вучэнняў, выконваючы загад вайсковага начальства, сяржант Вацлаў Кравец трапляе ў "анамальную Зону" і нечакана здзяйсняе вандроўку ў часе: пераносіцца з 2015 года назад у мінулае, апынаецца ў 1943-м. Тут яму даводзіцца перажыць шмат розных выпрабаванняў: палон, допыты, уцёкі... Дзіўна тое, што, нягледзячы на "трагічную фактуру", у аповедзе гучаць недарэчныя іранічна-гуллівыя інтанацыі, некаторыя перыпетыі выглядаюць гратэскава-карыкатурнымі, персанажы — шаржавымі. Тым не менш да пародыі твор не дацягвае, бо праблемы, якія закранае аўтар, у "гумарыстычным ключы" не вырашаюцца.

У артыкуле "Зорныя дарогі "Фантаста" Серж Мінскевіч аналізуе некаторыя ўзоры беларускай фантастыкі, што былі надрукаваны ў "Маладосці" за апошнія гады. Нягледзячы на тое, што аўтар публікацыі дастаткова памяркоўна ставіцца да "запазычанняў" эпізодаў адным з беларускіх майстроў жанру з твора амерыканскага пісьменніка, сам гэты факт выклікае вялікую прыкрасць. Усё ж фантастыка — бязмежнае поле для аўтарскага самавыяўлення, для эксперыментаў і сапраўднага эксклюзіву... Няўжо і тут нельга, не папасвіўшыся на чужых палетках, узгадаваць сваю індывідуальную *мастацкую праўду*?

Публікацыя "За свой народ, за шчасце беларусаў..." прысвечана 125-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы. Імя беларускага Песняра ўганаравана ў вершах Максіма Лужаніна, Яўгеніі Янішчыц, Юрася Свіркі, Міколы Мятліцкага, Петруся Макаля, Алеся Бачылы, Еўдакіі Лось і Віктара Шніпа.

Драматургію прадстаўляе ў "Маладосці" гістарычная драма "Людвіка і Фабіян" Людмілы Рублеўскай і Віталя Скалабана, якая "распавядае пра гісторыю кахання Людвікі Сівіцкай, добра вядомай чытачам як пісьменніца Зоська Верас, і Фабіяна Шантыра, члена Часовага рабоча-сялянскага Савецкага урада Беларусі, паэта, рэвалюцыянера. Ён быў расстраляны ў 1920 г., рэабілітаваны Пракуратурай Рэспублікі Беларусь у 1992 г. Публікацыя прымеркавана да 120-годдзя з дня нараджэння Ф. Шантыра, што адзначалася ў лютым 2007 г."

Сярод іншых матэрыялаў часопіса — інтэрв'ю Маргарыты Аляшкевіч з літаратуразнаўцам Ганнай Кісліцынай.

Рубрыка "У дапамогу школе" прапануе артыкул Марыі Верціхоўскай "Усе яго чакаем, і ніхто не ведае, як ён выглядае...: Роздумы пра школьныя праблемы і вобраз настаўніка ў найноўшай літаратуры".

У публікацыі Алеся Карлюкевіча "Любіць жыццё — бачыць прыгажосць" аналізуецца альбом-манаграфія Юрася Малаша "Патаемнае наіўных мастакоў Беларусі".

Рубрыка "Культура" прапануе чытачам артыкул Ірыны Клімковіч "Любім, можам — пераможам", дзе гаворка ідзе "пра сям'ю мастакоў Крыштаповічаў. У гэтай сям'і малююць усе, і гэта не перабольшванне — глядзець на свет праз прызму фарбаў і выяўленчых вобразаў — іх спосаб мыслення".

«Нёман» № 3

Паэзію "Нёмана" распачынае цыкл патрыятычных вершаў Міколы Мятліцкага "Совершает жизнь свой вековечный круг" (пераклад з белар. Б. Спрынчана). Сярод твораў Міхася Башлакова (пераклад з белар. А. Цяўлоўскага) дамінуе пейзажная лірыка. Яўгенія Жываглода, відавочна, натхнілі на творчасць узоры рускай класічнай паэзіі, бо тэматыка, вобразная эстэтыка і нават лексіка вершаў "Кавказ", "Утёс" і іншых міжволі выклікае ў памяці то радкі пушкінскага "Кавказского пленника", то пэўныя ўрыўкі з лермантаўскага "Мцыри".

Завостранымі рысамі, спецыфічнай чорна-белай кантрастнасцю характараў персанажаў, лаканічнай выразнасцю дыялогаў, контурнымі абрысамі дэкарацый, у якіх адбываюцца дзеянні, раман Алены Паповай "Пузырёк воздуха в кипящем котле" падобны да графічнага малюнка. Падзеі бяруць адлік "где-то в глубинах семидесятых", кола герояў паяднана своеасаблівым калегіяльным сяброўствам, пераважная большасць іх — супрацоўнікі маладзёжнай рэдакцыі тэлебачання. У кожнага з персанажаў — свае прынцыпы і жыццёвыя мэты, кожны па-свойму сцвярджаецца ў жыцці. Але ўсе яны — выхаванцы савецкай эпохі, і гэта іх з'ядноўвае больш, як што іншае. Усе яны імкнуцца вырвацца за межы пэўнай сістэмы (здавалася б, сацыяльна-палітычнай, а на самай справе — унутрана-асабовай, індывідуальнай), кожны шукае свой сімвалічны ключ ад дзвярэй, шукае выйсця...

Эсэ Янкі Сіпакова "Зелёный листок на планете Земля" — гэта сапраўды, як засведчыла "падназва" рубрыкі, "портрет Беларусі". З адчувальнай гордасцю, з любоўю і шчырым захапленнем аўтар апавядае пра наш край, пра нашых людзей, пра нашу унікальную культуру... Эсэ, багатае гістарычнымі фактамі, этнаграфічнымі звесткамі, лічбамі, статыстычнымі дадзенымі, насамрэч чытаецца з цікавасцю, выклікае пачуццё гонару за ўласную прыналежнасць да сумленнай і высакароднай нацыі... Але, шчыра кажучы, некаторыя сцвярджэнні неяк разыходзяцца з рэальнай сітуацыяй. Вось, напрыклад: "На белорусском языке разговаривают более 8 миллионов человек — по данным переписи населения Беларуси, которая прошла в 1989 году, 82 процента населения своим родным языком назвали белорусский. Даже представители других национальностей признались, что говорят по-белорусски: русские, татары, евреи". ... Відавочна, гэта адно мастацкая праўда.

Рубрыка "Впервые в "Нёмане" прадстаўляе апавяданне Віталія Шэлестава "Цинковая битка". У творы ўвасоблена кранальная, па-свойму драматычная гісторыя першага дзіцячага сяброўства. Два хлопчыкі рознага ўзросту, але ў чымсьці з падобнымі лёсамі. "Что же всё-таки нас сближало? Наверное, в первую очередь одиночество". Пабудаваны ад першай асобы, аповед прыпадабняецца да спавядальнага маналога. "Мы не клялись в вечной дружбе и не божились всегда и во всём друг другу помогать, и тем не менее всячески старались на деле показать, что в любой момент готовы на взаимное самопожертвование". Але па волі абставін сяброўству не наканавана было стаць доўгім...

Сёння ў школах існуе практыка "прымусовых" экскурсій. Пераконвае, напрыклад, вучань, што ўжо не раз наведваў пэўны музей ці выставу, а настаўнік апелюе: загад, распараджэнне, справаздачнасць... І змушаны школьнік па трэцім-пятым разе выслухваць адно і тое ж. Прыгадалася гэта з той нагоды, што ад абодвух эсэ Анатоля Валахановіча ўражанне — як ад "прымусовай" экскурсіі. Выкладзеныя факты — вядомыя, стыль — апісальны... Напрыклад, у эсэ "Дождь" — гаворка пра дождж, які, як вядома, ідзе фактычна паўсюль — "И в Бирмингеме, и в Лондоне, и на берегах Темзы, и у колонны адмирала Нельсона на Трафальгарской площади, и у Вестминстерского дворца сечёт и сечёт без устали..."; "Вот и Хельсинки — столица Финляндии — и снова дождь, дождь, дождь...". Рэзюме: "Дождик вымочит, а красно солнышко высушит! И снова восторжествовала радость жизни!" Такая вось *"незатейливая" праўда...*

У рубрыцы *"Публіцыстыка"* друкуецца нарыс Ганны Александровіч "Необходимый человек", прысвечаны вясковаму фельчару Сяргею Іванавічу Шклярэўскаму. У матэрыяле "Кормчий" Міхаіл Шэлехаў аналізуе здзяйсненні "великого кормчего своего народа — полководца, вождя, философа, поэта" Мао Цзэдуна. Назва публікацыі Мікалая Малішэўскага гаворыць сама за сябе — "Технологии выборов без выбора, или Как уши машут ослом".

Сярод матэрыялаў рубрыкі "Літаратурная крытыка" — рэцэнзія Надзеі Сенатаравай "И радость, и счастье, и грусть..." на кнігу паэзіі Генадзя Пашкова "Тваім святлом благаславёны"; артыкул Валерыя Грышкаўца "Любовь с привкусом, или Цветут цветы провинции", прысвечаны 60-годдзю Георгія Марчука; рэцэнзія Івана Капыловіча "Пусто без правды и добра" на паэтычны зборнік Эдуарда Скобелева "Крымская тетрадь".

Рубрыка "Літаратуразнаўства" прадстаўляе артыкул Тэрэзы Голуб "Янка Купала и Якуб Колас. Некоторые итоги текстологической работы".

Лада АЛЕЙНІК

Аляксандр БЫКАЎ

ПЯРУН НА ЗЫХОДЗЕ ЛЕТА

Там, дзе мурог спрадвеку зеляней,
Цяпер дзірван скарэлы пад нагамі.
Ён прарастае за сцяной залеў
Замест рамонкаў колкімі дзядамі.

А хочацца, каб ля чужой мяжы
Жыцця гадзіннік запаволіў стрэлкі.
Спынюся і з расхрыстанай душы
Я выцягну пакутлівыя стрэмкі.

Але душэўных мне ці хопіць струн,
Каб падтрымаць мелодыю Сусвету,
Як ачышчальны прагрыміць пярун
Прарочай песняй на зыходзе лета?..

КРУМКАЧЫ

Як жа раптам
Раскрычаліся з начы
У старым, здзічэлым парку
Крумкачы.

Чорнай хмарай
Ўвесь запоўнілі прасцяг.
Адчуваюць,
Што яны тут не ў гасцях.

Ім прывольна.
І гуртуюцца ізноў,
Каб не выпусціць мой ранак
З кіпцюроў.

Вось таму
І раскрычаліся з начы...
Не аддам свайго вам ранку,
Крумкачы!

* * *

Дзве з'явы ў жыцці
Заўжды маё сэрца натхнялі,
І цяжка сказаць,
Што патрэбна паэту найперш:
Ці неба начное,
Дзе зоркі вісяць, як каралі,
Ці позірк жанчыны,
Што просіцца з раніцы
Ў верш?

* * *

Быццам стаміўшыся, раптам
Сонейка села за край...
Свет, што напоўнены гвалтам,
Ранак не верне няхай.

Хай застануцца навечна
У сутарэннях начных
Нашы дарэмныя спрэчкі
І баявыя мячы.

Ўздых, такі светлы, дзіцячы,
Пад карагодам планет.
Толькі з прадонняў гарачых
Ўсё яшчэ цягнецца след.

Толькі ў бяздонні Сусвету
Вечныя зоркі мігцяць,
Толькі не спіцца паэтам,
Каб аб каханні спяваць.

ГАЛІНКА БЭЗУ

Няхай імпэту не стае —
Не той гарэза, —
Табе пакіну на стале
Галінку бэзу.

З нябёсаў майскіх, праз гады,
Святло пральецца.
У белай квецені сады
Бяруць за сэрца.

Шлях ад нязгаданых сустрэч
Да вуснаў дрогкіх —
Які ён доўгі насамрэч.
Які кароткі...

Калі душу ізноў кране
Гук паланеза,
Прымі, як колісь, ад мяне
Галінку бэзу!

ЭСКІЗ

Як абрус-саматканка —
Родны край на світанку.
Палявыя дарогі
І бацян басаногі.
Ў хаце — познія госці,
Спяць крыжы на пагосце.
А пад грушай старэнькай
Я — шчаслівы, маленькі...

МАТУЛІ

Зламалася нясцерпна-хрустка
Душа, як звонкая страла...
Вянцом няношаная хустка
Лягла паверх твайго чала.

Самотна ў хаце і няўтульна,
І прывід мроіцца ў кутку...
Як без цябе, мая матуля,
Ажыць і сэрцу, і радку?

Віка ТРЭНАС

ЭКЗІСТЭНЦЫЙНЫ ПЕЙЗАЖ

наглытацца з ракі тваёй душы
спакою і цішыні
вада празрыстая, аж бачныя на дне
каменьчыкі тваёй пяшчоты

з ласкавасцю ўсміхаецца Буда
усе дарогі свету
скручаныя ў абаранак часу
кінутыя да яго ног

у небе, афарбаваным захадам сонца,
мне бачацца водбліскі
нашага
татэмнага
вогнішча
ты зноў у маім быцці

{ГЛЫТОК МАРСКОГА ПАВЕТРА}

шлях да цябе пакручасты,
быццам горная сцяжынка,
заблытаны,
быццам лабірынт на выспе Крыт,
быццам сутарэнні падземнага горада,
быццам пасма тваіх валасоў,
ускудлачаных маёй
жартаўлівай рукою,
шлях да цябе не спыняецца ніколі.
падстаў сваю душу наросхрыст
вясновому моцнаму ветру,
дыхай да цемры ў вачох
на поўныя грудзі,
ледзь не зубамі я выдзірала цябе
з кіпцюроў
ненаеднага лёсу,
мы нарэшце на беразе дзікага,
дзікага мора.

ТУТЭЙШАЯ ЭКЗОТЫКА

памаранчавы бераг падміргвае
марнаю марай
гэта люты. А лета вяртаецца
здзеклівым рэхам
ім здаецца, што вершы пісаць –
быццам лузгаць гарэхі
зробяць дзіркі ва ўсмешках сваіх,
ды не трапіць дарма ў рай

мне не верыцца ў танныя пафасы,
коскі і кропкі
ў цемрадзь родных вачэй
і ў тужлівую менскую слоту
скокнуць з даху зімы і ў вясну б
уварвацца з лёту
там за спінай пачуць крок
да болю знаёмы таропкі

ценем ляжа на цёплы пясок
вечаровая змора
век не вывучу так як належыць
ніводнае мовы
мне вядома. Старое не можа
прыкінуцца новым
і ніводнае наша акно не выходзіць
на мора.

* * *

чарговыя здрады ўсяго толькі
зграйкі сняжынак
у цёплую восень драбнюткія
белыя птушкі
ці жнівеньскі дожджык з гаркавых
чырвоных слязінак
вось новы аб'ект,
двортэр'еры наставілі вушкі

сачыце, лавіце бялявых і шэравокіх
я маю ў дзіравай кішэні квіток удачы
я маю знутры тое,
што вы схавалі вонкі
пранізлівы вецер
мне валасы кудлачыць

ёсць новыя выразы твару,
кацячыя рухі
надзейная зброя і поўная
вершаў абойма
назаўтра мне хтосьці сагрэе
азяблыя рукі
назаўтра ўзыходзіць сонца
ў тваіх абдоймах

Іван КАПЫЛОВІЧ

* * *

Ты пакліч мяне, даль палявая,
Як найблізкага сябра пакліч!..
Я за тое сябе дакараю,
Што чужыя мы часам былі.

Грэшны я — траціў час
на пустое:
Вельмі часта ішоў не ў той бок —
Пазбаўляўся міжволі спакою,
Калі думак разблытваў клубок.

Папрашу цябе, даль палявая,
Ты маё пакаянне прымі:
Я за тое сябе дакараю,
Іншы раз што душою крывіў.

Уваскрэсну я зноў, акрыяю,
Разгарыцца агонь уваччу:
Даль мая — мая доля святая —
Ёю ўзрушаны я і маўчу.

* * *

Я стэпавы вецер сустрэну —
Да мора з ім разам пайду,
Убачыць хачу перамены —
Дзён шэрых спыніць чараду.

Мо ўрэшце суцішыць ён буры,
Якія матляюць мой лёс,
Хачу каб настрой мой пануры
У бездань марскую ён знёс.

ВАЛУНЫ

Сустракаюць мяне валуны
На парозе майго даўгалецця.
Уплятаюцца думкі-суквецці
Ў гэты лёс валуновы зямны.

Ураслі яны ў грудзі зямлі,
Гэта повязь з гадамі не рвецца.
Як і мне — нікуды
не падзецца
Валунам ад сцюдзёнай зімы.

Ім падмуркам — узлобкі, палі,
Лебяды дзе так многа, палыну:
Ад трывог і сумненняў астыну,
З валуном размаўляю калі.

У адну непарыўную ніць
Звяжа час валуны і быліны:
Неаднойчы свет
сыдзецца клінам
Вось на гэтай зямлі,
дзе мне жыць.

* * *

За сабой пакідаю масты,
Да якіх мне ісці давядзецца.
Ах, чаму сэрца моцна
так б'ецца?!
Я — палоннік штодзённай
вярсты.

Мне і дня не пражыць без таго,
Каб не весці з Палессем
размову.
Я ніколі не буду гатовы
Жыць у пасынках лёсу свайго.

Ні адлегласць, ні час —
не мяжа,
Што адпрэчыць
ад радасных думак:
Блаславёны Палессе
прытулак,
Дзе загойвае раны душы.

Я прыйду, я прыйду шчэ не раз
Да ягоных узлескаў, дубровaў:
Пра свой боль гаварыць
буду з борам,
Покуль светлы
не скончыцца час.

Фота Канстанціна Дробава

Профіль Фартуны

Апавяданне

Валерый ГАПЕЕЎ

Генадзь нарадзіўся ўдачлівым — матчынага малака яму хапіла ажно да чатырох гадоў. І — пайшло. Хто больш карасёў наловіць? Генадзь. Хто поўны кошык баравікоў прынясе? Генадзь. У каго ўрокі не пытаюць, калі ён іх не ведае? У Генадзя. Ён адзіны білет экзаменацыйны вывучыў — і яго выцягнуў. Таму Сяргей, які аж да апошняга іх школьнага званка быў заўсёды побач, і не здзіўляўся, што надалей у Генадзя не пайшло, а пакацілася. Сам Сяргей увесь чэрвень бегаў у калгас на працу, а па вечарах сядзеў над падручнікамі, бо з білетамі экзаменацыйнымі яму ніколі не шанцавала. Генадзь жа дняваў на возеры, вечар і добрую палову начы бавіў у вясковым клубе. Яму і з паступленнем пашанцавала: нечакана адшукаўся нейкі забыты сваяк, які ўзяўся паклапаціцца аб паступленні хлопца.

Адвучыўся Генадзь у інстытуце лёгка і бесклапотна. Не тое, што Сяргей. І калі пасля атрымання дыплома Сяргей вымушаны быў паехаць па размеркаванні ў далёкі райцэнтр, то Генадзь лёгка ўладкаваўся ў сталіцы.

Яны сустракаліся ў сваёй вёсачцы, сувязі не гублялі. Сяргей цягнуў лямку інжынера на заводзе, а вось Генадзь стаў ужо кіраўніком фірмы. Справы яго ішлі ўгору: ён не сам прыязджаў цяпер да бацькоў, а яго прывозілі, ды яшчэ пад аховай двух дзецюкоў. Было ў яго ўсё, што трэба: жонка з нагамі ад плячэй, уласны дом трохпавярховы (адзін паверх пад зямлёй) і ўсё астатняе.

Сяргей не зайздросціў. Ну, Фартуна так павярнулася: тварам да Генадзя, а да яго, Сяргея, скажам так, не зусім спінай, а ў профіль. Гледзячы па-філасофску на сваё жыццё-быццё, Сяргей зрабіў выснову, што адным у жыцці ўсё даецца лёгка, яны і ў латарэі выйграюць, другім – за кожнай капейчынай трэба да зямлі нахіліцца, а ў трэціх – што ні робяць, як ні б'юцца, а ўсе здабыткі – як вада праз пальцы. Сяргей адносіў сябе да другіх, таму не крыўдаваў на жыццё, што прымушала яго карпець і пацець, каб атрымаць нейкую драбніцу. У гэтым, зрэшты, быў пэўны сэнс: можна хоць праверыць на ўласнай скуры, чаго ты варты.

У сорак гадоў Сяргей меў двухпакаёўку, пасаду галоўнага інжынера, дваіх дзяцей і рана распаўнелую жонку. Яшчэ — добра з'езджаны "Масквіч", на які, дарэчы, грошы ён пазычаў у Генадзя.

І нічога істотнага далей жыццё не абяцала, акрамя звычайных турбот: дзяцей трэба вывучыць, потым жаніць — замуж аддаць, дапамагаць, унукаў песціць. Усё ясна, хоць расклад складай.

Двух заробкаў ледзьве хапала, каб выкруціцца, не скаціцца ў яміну даўгоў, апрануць-абуць дзяцей. Самі неяк абыходзіліся, хоць жонка іншы раз капрызіла. А Сяргею дык было даволі зручна і ў дзесяць гадоў таму купленым касцюме.

Генадзь патэлефанаваў перад каталіцкімі Калядамі.

— Прывітанне! Як там стаіць твой завод? Зоя яшчэ колькі кілаграмаў набрала? Колькі папруг звёў на дзіцячых спінах? — пасыпаў жартаўлівымі пытаннямі.

— Здароў, здароў, — злёгку разгубіўся Сяргей, бо тэлефанаваў да яго Генадзь зусім рэдка. — Завод стаіць, Зоя таўсцее, а дзеці пад папругу ўжо не кладуцца. Як у цябе справы?

— О, у мяне, як заўсёды — поўны ажур, — рагатнуў Генадзь. — Я да цябе, у сэнсе, у ваш райцэнтр прыехаць хачу, ёсць там адна справа. От, зайду, пасядзім, паўспамінаем, як ментузоў у канаве лавілі, як Зойку тваю пужалі. Помніш?

— Помню, помню, — адказаў Сяргей, і нейкая ніякаватасць пачала вярэдзіць душу. Незразумела адкуль з'явілася нечаканае прадчуванне нечага непрыемнага, а следам за ім кволае сарамлівае жаданне, каб Генадзь не прыязджаў. Але дадаў Сяргей з ранейшай інтанацыяй:

— Калі прыедзеш?

— От на Каляды і чакай. Гатуй добры стол! На пару начэй мяркую застацца...

Сяргей паклаў трубку, прайшоў на кухню. Адчыніў шырэй фортку акна, закурыў. Гэтае сваё права — курыць на кухні — Сяргей адстойваў мо гады тры. Адстаяў. Пераканаў жонку, што курыць на лесвічнай пляцоўцы — гэта значыць не паважаць тых, хто жыве побач, хто ідзе па лесвіцы. Зацягнуўся, страсянуў попел у вымытую попельніцу (гэта Зоя стараецца шторанiцы) і зразумеў, адкуль узяўся ў душы той неспакой, тая незадаволенасць.

Зоя... З чаго гэта Генадзь прыгадаў менавіта тое, як яны ў дзяцінстве пужалі па вечарах Зою, суседку Генадзя? Ды і было гэта толькі раз, па яго ж, Генадзя, прыдумцы. Так даўно было...

Зоя тады была невялікай, паўнаваценькай дзяўчынкай. Генадзь яе за нешта не любіў, заўсёды чапляў. А вось Сяргею Зоя падабалася. Хоць у іх вёсачцы на дваццаць хат і выбіраць не было з каго. Сябраваць Сяргей з Зояй пачалі класа з пятага, і пакрысе, з гадамі іх сяброўства перарасло ў тое пачуццё, з якім спяшаюцца ў ЗАГСы.

Навошта Генадзю ўспамінаць той дурны выпадак?

Яны тады удвух схаваліся за вуглом хаты. Зоя прыцемкамі вярталася з дзявочых пасядзелак. Яны і скокнулі прама прад ёй з крыкам і рыкам. Яна, трынаццацігадовая дзяўчынка, не закрычала тады, і не рванулася ўбок. Стаяла, а па шэрай асфальтаванай дарожцы з-пад яе ног разбягалася ўшыркі цёмная пляма.

— А-га-га-га! — зарагатаў Генадзь.

І толькі тады Зоя пабегла. А Сяргею стала сорамна. Ён не думаў, што іх жарт можа так прынізіць дзяўчынку.

Прабачэння Сяргей у яе папрасіў праз тыдзень. Яна прабачыла. І, дарэчы, ніколі ў іх сумесным жыцці не прыгадала таго выпадку.

...Дым цягнуўся праз фортку, нетаропка пацягнуліся і думкі Сяргея. Рашэнне прынята — трэба рыхтавацца. На навагоднія святы даўно вызначана сума, размеркаваны кожны рубель. І цяпер тыя кароткія гудкі ў тэлефоннай трубцы загучалі ў галаве здзеклівым: "Дзе? Дзе? Дзе?" Дзе ўзяць грошай?

Свайго сябра, кіраўніка саліднай фірмы, у якога целаахоўнікі атрымоўваюць столькі, колькі Сяргею не зарабіць і за год, цешчынай самагонкай і галубцамі, у якіх мясам толькі крыху пахне, частаваць не будзеш.

З жонкай прагаварылі за поўнач.

— Нічога, Каці купім не джынсы, а калготы, Віцьку пад ёлку не плэер пакладзём новы, а дыск. Табе б кашулю новую купіць, у той ужо каўнерык нікуды не варты... — думала-прапаноўвала Зоя.

— Гальштук павяжу, не будзе відаць каўнерыка, — адазваўся Сяргей. — Ды ўвогуле, чаго тут мне выхарошвацца? Як жыву, так жыву. Ты мо курыцу ў маці папросіш, сяголетку?

— Папрашу. Казала, адна не нясецца. Засячэ...

— А ўвогуле, нядрэнна было б табе крыху пахудзець, — нечакана для сябе закончыў Сяргей размову.

Жонка аж галаву прыўзняла:

— З якога ляду пра гэта загаварыў? Генадзева цытра ў вачах стаіць?

— Ну, чаго ты так на яе? Ты ж яе ў госці чакаеш... Цытра... Стройная, ды і ўсё.

— Бо цытра і ёсць. Бабе ўсё, што мае, дадзена, каб дзяцей раджаць, а не для таго, каб юр задавальняць... А дарэчы, ён сказаў, што не адзін, а з жонкай будзе?

— Не... Не ўспамінаў пра сваю жонку нічога. Толькі пра цябе спытаў, колькі ты тут яшчэ кілаграмаў набрала.

— То, можа, увогуле адзін будзе... Колькі набрала, столькі набрала... Добра, я сама пра гэта думала. Нешта мяне разнесла, — раптоўна прымірэнча закончыла Зоя. — Пачну худзець... А будзе Генадзь хутчэй адзін, ён такі. Ды рыхтавацца трэба, як для дваіх...

Але Генадзь патэлефанаваў яшчэ раз, нібы спецыяльна дзеля таго, каб сказаць, што прыедзе адзін.

...Ён не ўвайшоў — уварваўся ў кватэру: шумны, гаманлівы, можа, і празмерна вясёлы.

— Гэй, хто тут ёсць? Чаго госця не сустракаюць ля парога з караваем? Зоя, ты што там у дзвярах завязла? — сунуў каротка руку Сяргею, перадаў Зоі вялікую сумку. — Здароўце, здароўце. Там, Зойка-зайка, сёе-тое для стала святочнага. Ну, а дзе вашы хамуты?

— У школе пакуль, — Сяргей зразумеў, што Генадзь пытаўся пра дзяцей.

— На вось, ім падарункі, аддасі, — Генадзь тыцнуў Сяргею яшчэ нейкі пакет. — Хлопцу плэер класны, японскі, дзяўчыне набор касметыкі. Не абы-які, фірменны. Так, гатуйце стол, мне трэба скокнуць па справах, увечары буду. Салют! — і знік за дзвярыма.

— Усё такі ж, — паківала галавой Зоя.

— Які? — раўніва, бо адчуваў нейкую асуджальнасць у голасе жонкі, спытаў Сяргей.

— Ды які быў: шумны, лёгкі, цэнтр сусвету. Ветрагон, — махнула Зоя рукой.

— Ну, у гэтага ветрагона мы грошы пазычалі, а не ён у нас, — пакрыўдзіўся за сябра Сяргей. — Ты яго нечага недалюбліваеш?

— А за што яго любіць? Ён твой сябар?

— Сябар, вядома.

— Сябар, бо вас толькі двое аднагодкаў у вёсцы было. Хочаш-не хочаш, няма з кім больш гуляць.

— Слухай, я не разумею! — павысіў голас Сяргей. — Навошта ты пачынаеш высвятляць тое, што і так ясна? Навошта ты ўсчала гэту тэму?

— Так, прадчуванне ў мяне нейкае нядобрае, — ціха адказала Зоя. — Не варта было б казаць, ды скажу: не хачу я такога госця. Ды яшчэ на тры дні.

— Ну, ты... — Сяргей захліпнуўся ад крыўды. — Умееш сапсаваць настрой.

— Не бойся, не сапсую, — адмахнулася Зоя. — Я сёння ў начную іду. Нагатую вам і пайду. Сядзіце хоць усю ноч, успамінайце, гаманіце.

— Як у начную? Табе ж...

— А я замянілася. Папрасілі мяне, — рэзка адказала Зоя і пайшла на кухню.

Сяргей з хвіліну стаяў у прыхожай з пакетам у руках. Не ведаў, што казаць Зоі, як сябе паводзіць.

Зоя гатавала на кухні, ён глядзеў тэлевізар. Было а сёмай гадзіне вечара. Генадзь яшчэ не прыйшоў.

— Ну, у мяне там усё гатова, салаты ў халадзільніку, дзеці накормленыя, гарачае разагрэеш, бульбу зварыш, яна абабраная. — Зоя стаяла ўжо каля люстра ў прыхожай, напамажвала вусны. — Скажаш, што я прыношу свае прабачэнні. Ды не пі многа, я бачыла, што ён гарэлку нейкую замежную прывёз, лепш ужо сваёй, беларускай частуйцеся, а то яшчэ будзе заўтра галава расколвацца. Бялізна для госця на другой паліцы ў шафе, я сабрала. Усё, я пабегла...

Генадзь прыйшоў каля дзевяці вечара.

Дамогся, каб спачатку пакаштавалі ягоную гарэлку.

— Дзівак, ты такое ніколі не піў! Чысцейшая! Ніякіх пахмелляў.

Недзе з гадзіну ўспаміналі сваіх знаёмых, аднакласнікаў.

— Ат, не атрымалася з нашага класа нічога! — махнуў рукой Генадзь. — Усе надзеі школы цяпер вось як ты, марнеюць недзе на заводзіках. Хоць бы якая знакамітасць была, хоць бы пісьменнікам хто стаў, паэтам, у космас злётаў!

— Ну, у людзі многія выбіліся, — запярэчыў асцярожна Сяргей, бо яму здавалася, што выпітае пачало дзейнічаць на Генадзя занадта хутка, і голас ягоны стаў не толькі моцным, але і выклік у ім нейкі загучаў.

— Ха, у людзі! Ну, хто, хто, скажы, акрамя мяне ў людзі выбіўся? — Генадзь наблізіў свой твар да Сяргея, пырснуў слінай. — Хто?

— Гледзячы як што разумець...

— Ага, як што разумець... — Генадзь наліў у шклянкі гарэлку, падчапіў на відэлец кавалачак вэнджаніны. — Чалавек — гэта мяса. О, бачыш, такое вось мяса. А я што раблю?

Ён імкліва перакуліў шклянку ў рот, павольна, нават тэатральна захапіў зубамі кавалак мяса з відэльца, моцна сціснуў сківіцы.

— Бачыў? Бачыў, што я магу зрабіць з чалавекам? Ты ведаеш, колькі сёння чалавек каштуе, такі, як ты? Прафесіянал запатрабуе сама многа 500 баксаў. А нейкі алкаш заб'е цябе і за 50. Ага!

"Зусім ап'янеў", — падумаў Сяргей, усё больш трывожачыся, што ў словах сябра пачалі гучаць злыя ноткі. "Нешта ўсё ж не склалася ў яго жыцці, нешта яго не задавальняе, на нешта ён злуе... Можа, што ягоная жонка зацяжарыць не змагла? Ды гэта ж ужо другая..."

Генадзь наліў зноў, выпіў, не чакаючы Сяргея. Адкінуўся на спінку канапы, закурыў.

— Людзі... Усе гной, калі без грошай. Перада мной сцелюцца, на калені падаюць, за руку хапаюць! А як у вёску прыеду? Глядзяць... А то ж — я ж для іх ветрагонам быў, а цяпер — наце, укусіце за зад майго джыпа! Паважаць пачалі. І зайздросцяць! Усе зайздросцяць! Ух, як ім хочацца на маім месцы быць, ці хоць у сябрукі, як ты вось, запісацца!

Сяргея разанула гэта "запісацца". І хоць не хацелася пярэчыць Генадзю, бачачы яго стан, але сказаў, як мага спакойней:

— Ну, мне асабіста запісвацца да цябе ў сябры не даводзілася. Нас жыццё запісала.

— Ага, жыццё... — Генадзь нечакана скрыгатнуў зубамі. — А ты мне зайздросціш?

Ён пытаўся з выклікам, чакаючы і патрабуючы станоўчага адказу.

— Я не зайздрошчу чужому шчасцю, — нейтральна адказаў Сяргей.

Генадзь памаўчаў, потым махнуў у бок пляшкі:

— Налівай!

Ён выпіў зноў хутка, адным узмахам рукі, не чакаючы, пакуль налье сабе Сяргей. Адмахнуўся ад Сяргеевага: "Закусвай".

— Думаеш, я п'яны? Ага, думай... Думай. І я во думаў, усе гэтыя гады думаў: ты прыкідваешся, га? Перада мной такі раўнадушны, а як сам з сабой застаешся — кусаеш жа локці, га? Ад зайздрасці... Ці, можа, ты на самай справе не зайздросціш? Можа, ты, у гэтай шпакоўні жывучы, шчаслівы? Шчаслівы, га? Ну, скажы!

Ён выкрыкваў словы, і цяпер у іх ясна гучала зусім нечаканая для Сяргея злосць. Сяргей зазірнуў у вочы Генадзю і раптоўна зразумеў: ён не п'яны. Ні цёню хмелю не было ў вачах, толькі раздражнёнасць і нянавісць.

Сяргея спалохала гэта нянавісць. Яму хацелася адно імгненне адказаць так, каб супакоіць невядома з якой прычыны раззлаванага сябра. Бо ў дапытлівым крыку Генадзя ўгадвалася прычына яго раздражнення — сам Сяргей. А гэта было тым больш незразумела. І таму палохала. Але тут жа ўнутры Сяргея ўзнялося супраціўленне: чаго яму баяцца, ды яшчэ ў сваёй хаце? Ён упэўнены: нічога такога, з-за чаго можна было б раззлавацца яго сябру, ён не рабіў. І чаму ён павінен падладжвацца пад Генадзя? Таму, што ён госць? Ну, то і хай сабе. Паважаць госця — не значыць заглядваць яму ў вочкі. І Сяргей адказаў, можа, і задужа рэзка:

— Колькі ў мяне таго шчасця ні ёсць — яго мне хапае. І яно — маё.

Генадзь як быццам чакаў менавіта гэтага тону. Ён неяк хіжа ўсміхнуўся, умомант стаў спакойным і працягнуў знарок п'янавата:

— Было ваша, стала наша...

Сяргей не мог не заўважыць не проста здзеклівасці, а нават прыхаванай пагрозы ў голасе. Генадзь супакоіўся так нечакана, што хочаш-не хочаш, а трэба было разумець, што сваім крыкам ён раней імкнуўся менавіта вывесці Сяргея з раўнавагі, сапсаваць яму настрой, нават спалохаць.

— Нешта я цябе не разумею, — сказаў Сяргей напружаным голасам.

— Што, спалохаўся? — засмяяўся Генадзь. — А я цябе вось зразумець хачу... Усе гэтыя гады мяне мучыць: чаму?

— Што — чаму?

Генадзь сам пацягнуўся да бутэлькі, наліў гарэлку ў вялікую шклянку, на гэты раз адпіў нетаропка глыток, смакуючы пітво.

— Я цябе ва ўсім пераганяў. І на рыбалцы, і ў грыбах, і ў футболе. Ну, вучыліся мы аднолькава. Мне ва ўсім шанцавала, усё мне само ў рукі давалася, а ты, каб хоць кроплю майго мець, карпеў. Майму шанцунку ўсе зайздросцілі, мной захапляліся. А ты — не! Ты мяне ніколі не паважаў, як належала. І нават потым, грошы ў мяне пытаючы, ты іх так браў, быццам мне пазыку рабіў... Памятаеш, у восьмым класе, у калгас мы бегалі? Цябе мужыкі з сабой клікалі стагі ў балоце кідаць. А мяне — не! А ў дзевятым за цябе, каб у памочнікі ўзяць, два камбайнёры паспрачаліся. А мяне ніхто браць не хацеў. Я выгляд зрабіў, што сам не хачу. Ты вінаваты!!! У інстытуце: цябе некуды ўсё выбіраюць, вылучаюць, дэкан на пятым курсе з табой за руку вітаўся... Ты мне сонца засціў, разумееш?! З дзяцінства самага! Гэта пра цябе казалі: ах, які сур'ёзны, які старанны! Гэта мяне табой тыцкалі, у прыклад ставілі. Га, хай пра тое сёння ўспомняць! Хто сёння ты, і хто я? Я даказаў!

— Думаеш, твае грошы за цябе робяць табе павагу? — запытаў Сяргей, разгублены гэтай споведдзю. — У чым я табе яшчэ дарогу перайшоў, акрамя тых далёкіх стагоў у балоце? Трэба ж так запомніць такую вялікую крыўду... — Сяргей пацісну плячыма.

— А я ўсё запамінаю! Усё, кожненькую драбніцу. Я гэтыя драбніцы адна да адной, як саломінкі ў куль, збіраю. Прыйдзе час — спатрэбіцца. Вось і спатрэбілася... Чым яшчэ ты мне дарогу перайшоў? Зойкай!

— Ты што? — Сяргей на самай справе разгубіўся. — Ты ж на Зойку ўвагі ніколі не звяртаў!

— Я не звяртаў...— Генадзь пачаў казаць праз сціснутыя зубы. — Яна на мяне ўвагі не звяртала! Яна мной грэбавала яшчэ з тае пары, калі без трусоў бегала. А з табой вось пасябравала... А калі б не ты, думаеш, утрымалася б яна, не пабегла б за мной, як іншыя? Яна, як з табой знюхалася, недзе з пятага класа мяне ўвогуле ненавідзець пачала. Да гэтага хоць баялася, бо ведала: я мог такую штучку ўтварыць! Ха, я яе ў прыбіральні разоў

(Заканчэнне на стар. 15)

Арт-пацеркі

Музей “Брэст тэатральны” адкрыўся ў СШ № 12 (з тэатральна-эстэтычным напрамкам) горада над Бугам. Архіўныя дакументы, афішы, праграмы спектакляў, рэцэнзіі, эскізы мастакоў да пастановак, касцюмы, фрагменты дэкарацый, фота акцёраў і сцэн са спектакляў... Каля дзвюх тысяч экспанатаў, прадстаўленых у новым музеі, утвараюць гістарычную панараму тэатральнага жыцця берасцейцаў — ад XVI ст. (першае ўпамінанне пра трох акцёраў-скамарохаў, якія ладзілі імпрэзы на вуліцах горада, датуецца 1566 годам). У аснове музея — прыватная калекцыя кіраўніцы школьнага гуртка “Гісторыя тэатра” Ганны Кавалёвай, якая перадала ў дар школе больш як 1.200 экспанатаў (праграмкі, рэцэнзіі і да т.п.), што збірала на працягу чатырох дзесяткаў гадоў. Можна лічыць, што мастацтвам сцэны яна захапілася дзякуючы бацькам: маці яе доўгі час была касірам тэатра, бацька працаваў тут у ахове. Стварэнне музея “Брэст тэатральны” — адметная з’ява ў культурным жыцці вобласці. Ён паспрыяе паглыбленаму вывучэнню сцэнічнага мастацтва ў гэтай школе, да таго ж, тут плануецца рабіць экскурсіі для ўсіх аматараў тэатра, тэматычныя выстаўкі, сустрэчы з акцёрамі.

Новы недзяржаўны тэатр пад назвай “Другое искусство” з’явіўся ў Мінску. Паказ яго прэм’ернага спектакля “Выканаўца жадання” паводле аднайменнай п’есы Андрэя Курэйчыка адбыўся ў Палацы прафсаюзаў. Прадзюсер Сяргей Аўсянік, рэжысура Сяргея Кавальчыка; у пастаноўцы занятыя артысты розных тэатраў. “Пікантнасць” і унікальнасць падзеі ў тым, што незалежны камерцыйны тэатр пачаў сваё жыццё з пастаноўкі твора беларускага драматурга: нават дзяржаўныя калектывы да нашай нацыянальнай драматургіі звяртаюцца не надта часта. Кажуць, новы тэатр будзе папулярызаваць сучасную айчынную драматургію. А наступны паказ “Выканаўцы жадання” плануецца на 21-22 красавіка.

Двухактовы мюзікл для дзяцей і дарослых “Прыгоды брэменскіх музыкантаў” — нядаўняя прэм’ера Беларускага дзяржаўнага музычнага тэатра. Гучыць папулярная музыка Генадзя Гладкова, і на сцэне разгортваюцца падзеі трох мультфільмаў: “Брэменскія музыканты” (створаны пры канцы 1960-х), “Па слядах брэменскіх музыкантаў” (1972) ды “Новыя брэменскія” (2001). Рэжысёр-пастаноўшчык

Настасся Грыненка напісала арыгінальнае лібрэта паводле сцэнарыяў Васіля Ліванава і Юрыя Энціна, сучасную музычную аранжыроўку стварыў Леў Карпенка. Дырыжор-пастаноўшчык спектакля — Мікалай Макарэвіч, з хорам працавалі Святлана Пятрова і Ганна Маторная. Балетмайстар — Дзмітрый Якубовіч, сцэнограф — Андрэй Меранкоў, мастак па касцюмах — Юлія Бабаева. У “Прыгодах...” — сапраўднае сузор’е артыстаў, сярод якіх Ілона Казакевіч, Ірына Шыцікава, Кацярына Дзегцярова, Дзмітрый Якубовіч, Дзяніс Нямцоў... У ролі Дурнаватага Караля пакуль адзіны выканаўца — Аляксандр Асіпец. На здымку побач з ім — сталічная школьніца Крысціна Святлічная ў вобразе Трубадура-малодшага.

С. ВЕТКА
Фота К. Дробава

Вячаслаў Шамшур нарадзіўся ў 1942 годзе ў вёсцы Пціцкія Міёрскага раёна Віцебскай вобласці. Вучыўся ў вячэрняй школе, скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педінстытута, аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР. Кандыдат мастацтвазнаўства, прафесар, член Беларускага саюза мастакоў. Навуковыя даследаванні спалучае з творчай працай: адзін з аўтараў 6-томнай “Гісторыі мастацтва Беларусі”, аўтар манаграфіі, шэрагу вучэбных і метадычных дапаможнікаў, шматлікіх навуковых артыкулаў па гісторыі мастацтва. Стварыў серыі графічных работ: “Дарога на Міёры”, “Віцебск і Віцебшчына”, мноства асобных твораў у тэхніках пастэлі і лінарыту. Асобнае месца ў творчасці В. Шамшура займае яго родная Міёршчына. Працуе мастак у Віцебскім дзяржаўным універсітэце, выкладае тэорыю мастацтва, малюнак, дэкаратыўна-прыкладное мастацва. Да 65-годдзя В. Шамшура ў вестыбюлі абласной бібліятэкі разгарнулася юбілейная выстава.



Міёршчына, зямля натхнення

— Вячаслаў Вячаслававіч, усё лепшае ў нас — ад Радзімы і маці. Раскажыце пра свае карані — продкаў, родныя мясціны.

— Маё пасляваеннае дзяцінства прайшло сярод цудоўнай прыроды Міёршчыны, сярод зычлівых і лагодных людзей. У мяне былі вельмі добрыя бабулі, дзядулі, маці (бацька не вярнуўся з вайны), уся радня. Бацькі майго бацькі, Шамшуры, жылі ў Пціцкіх, недалёка ад Мацюкоўскага возера, а бацькі маці — Сушкі (па мянушцы “кавалі”) — на беразе маленькай, але шустрай рэчкі Гавенічы, што ўпадае ў возера Трубенец. На беразе стаяла кузня, дзе працавалі мае дзед і дзядзька. З нейкай асалодай і захапленнем я назіраў, як непакорлівае жалеза, распаленае ў горне, пад ударамі молата ператвараецца ў падковы, клямкі, дэталі плугоў і іншыя дзівосныя рэчы. І так хацелася хутчэй падрасці, каб усё гэта рабіць самому.

— Ці памятаеце вы свой першы мастацкі твор?

— Так, вельмі добра памятаю сваю першую спробу далучыцца да мастацтва. Аднойчы цёплай сонечнай раніцай маці надзела мне бялюткую новую кашульку, доўгую, аж да каленяў, і сказала: “Ідзі, будзеш скакаць, пырхаць, як белы матылёк”. І я паскакаў, папырхаў па садку, па лужку, сцежках і канаўках. Але хутка нешта мне не спадабалася, асабліва доўгі і роўны падол гэтай кашулі. Узяўшы цішком нажніцы, па нізе я выразаў зубчыкі, дзірачкі, розныя ўзоры. Карацей кажучы, увесь падол аздобіў адмысловымі карункамі і быў вельмі задаволены сваім “мастацтвам”. За гэтае “мастацтва” маці з бабуляй падрыхтавалі для мяне дубец для добрай лупцоўкі. Я схаваўся ў клець, і ўсё неяк абышлося.

— А настаўнікі ў школе заўважылі вашу схільнасць да мастацтва?

— У школе мае схільнасці да малявання настаўнікі заўважылі вельмі хутка. На жаль, у адзінай тады міёрскай школе не было спецыяліста па выяўленчым мастацтве, але былі яго аматары. З вялікай цеплынёй і ўдзячнасцю ўспамінаю завуча школы Аляксандра Капітанава і выкладчыка гісторыі Пятра Салоху. Гэта яны арганізавалі гурток выяўленчага мастацтва, дзе я даведаўся, што маляваць трэба толькі з натуры альбо па памяці. Гэта яны захавалі мае першыя спробы. І я маляваў-маляваў вясковыя хаты, краявіды, нацюрморты, усё навакольнае жыццё: як бабуля абірае бульбу, як дзед возіць сена.

Вельмі прыхільна да маіх захапленняў адносіўся дзед Шамшур. Ён быў даволі адукаваны для таго часу чалавек, добра ведаў літаратурныя творы і заўсёды ставіў мне ў прыклад героя апавядання Серафімовіча — пра тое, як бедны вясковы хлапчук ляпіў з гліны ў сатырычным выглядзе сваіх аднавяскоўцаў, як яго за гэта ганялі, як потым ён стаў знакамітым мастаком, прыязджаў у вёску ў дарагім гарнітуры, залатых акулярах, і усе з ім раскланьваліся.

— Амаль усё месца ў вашай творчасці займае родная Міёршчына і Міёры. Няўжо і цяпер, у сталым узросце, вы натхняецеся вобразамі дзяцінства?

— Цяпер я жыву і працую ў Віцебску, але дарагія мясціны, дзе прайшло маё дзяцінства, не даюць мне спакою. Іх цудоўныя, сонечныя вобразы заўсёды стаяць у маіх вачах і часта сняцца. Таму невыпадкова з’явілася серыя лінарытаў “Дарога на Міёры”.

— Мне вельмі падабаюцца вашы лінарыты, напрыклад, “Старыя таполі”: глыбіня прасторы, эмацыйная напружанасць буйнага ветру, закручаныя кроны дрэў, “фартэпіянныя ўсхліпы” вады, яе рабізна і хвалі, імклівыя воблакі ствараюць адчуванне музыкі Баха. Скажыце, а тэхніка лінарыту вельмі складаная?

— Паводле эскізу на лінолеуме спецыяльнымі разцамі выразаецца адпаведная выява, ствараецца так званая друкарская дошка. На яе валікам накочваецца фарба, прыкладваецца папера і моцна прыціраецца (можна лыжкай або спецыяльнай прыладай). Калі ёсць друкарскі станок, адбітак робіцца на ім. З адной друкарскай дошкі можна зрабіць да тысячы адбіткаў, і ўсе яны будуць арыгіналамі — мастацкімі творамі. На жаль, многае з адлюстраванага ў маіх творах ужо страчана: калісьці старыя дарогі, што вялі да Міёр, былі абсаджаныя вялізнымі раскідзістымі вербамі. Яны стваралі сваімі галінамі велічныя брамы: у іх добра было ў спякоту адпачыць.

У лінарыце “Вецер у вербах” паказана гэтая дарога. Але сёння гэтых лоз вы не ўбачыце — яны знішчаныя.

— Мне вельмі падабаецца лінарыт “Вецер у вербах”: гэта і паэтызацыя роднага краю, і рамантычнае жаданне дарог — здаецца, вецер нагуляецца з вершалінамі вербаў і заціхне ў ласкавых абдымках узбочын.

— Цяпер я працую ў тэхніцы пастэлі, але тэма Міёр і наваколля не пакідае мяне і, спадзяюся, не пакіне.

— Няшмат мастакоў працуе ў тэхніцы пастэлі. У чым яе асаблівасці?

— Пастэль — графічны і жывапісны матэрыял, вядомы з XVI стагоддзя. Назва паходзіць ад італьянскага слова “pastello”, што азначае “цеста”. Гэта спрасаваныя пігменты ў выглядзе рознакаляровых палачак. Імі малююць на паперы, картоне, палатне, замшы і іншых асновах. Пастэллю, у адпаведнасці з задумай, можна ствараць як графічныя, так і жывапісныя работы. Колер іх не змяняецца з цягам часу і застаецца чысты і светлы, але пастэль баіцца механічнага ўздзеяння, і таму яе захоўваюць пад шклом.

— Мне вельмі падабаюцца вашы работы ў тэхніцы пастэлі. І “Стары аранжавы дом”: мяккія, цёплыя фарбы будынка і шаравата-сінія, халодныя адценні дрэў, снегу, нябёсаў. І “Віцебск. Зімовая раніца”: залатыя ад сонца дахі, пяшчотнае неба, лагодныя вершаліны. І наогул, калі глядзіш на вашы карціны, адчуваеш такі эмацыйны ўздым, такую душэўную радасць, што хочацца танчыць, спяваць і складаць вершы. Вялікі дзякуй за светлае натхненне і шчырую любоў да Радзімы.

Наталля САЛАЎЁВА

На здымках: В. Шамшур і яго работы “Віцебск. Зімовая раніца”, “Стары аранжавы дом”, “Старыя таполі”.

Самы мажорны фэст

Пры канцы сакавіка галоўны “пастаўшчык” эстрадных зорак і работнікаў сферы культуры — Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў — распачаў чарговы фестываль “Арт-мажор”. Сёлета яму споўнілася 15 гадоў.

Фестываль мастацтваў “Арт-мажор”, які атрымаў сваю непаўторную назву ў 2003 годзе, уяўляе сабой своеасаблівую справаздачу, публічную атэстацыю вучэбных калектываў, творчых кафедраў і факультэтаў універсітэта мінскімі гледачамі. Гэта вельмі важна як для студэнтаў, так і для выкладчыкаў: першыя паказваюць, чаму яны навучыліся, а другія — хто гэтаму навучыў. Для студэнтаў “Арт-мажор” — амаль білет у будучыню. “Ужо заўтра ўдзельнікі фестывалю будуць несці беларускую культуру і народную творчасць у малыя, сярэднія і вялікія гарады”, — сказала прарэктар па мастацкай творчасці і выхаваўчай рабоце універсітэта Святлана Майсяйчук на адкрыцці юбілейнага “Арт-мажора”.

А само ўрачыстае адкрыццё сёлетняга фестывалю адбылося ў Клубе імя Ф. Дзяржынскага. Распачаў праграму цудоўным папуры ансамбль “Капрычыо”. Пасля задаў жару ансамбль акардэаністаў “Туці”. Перад паўнюткай залай выступілі таксама народныя артысткі Беларусі Наталля Гайда і Наталля Руднева, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Ларыса Рыдлеўская, фольк-медыа-гурт “Неруш”, фальклорны гурт “Гуда”.

У рамках фестывалю, які працягнецца амаль да канца траўня, запланавана больш як 10 канцэртаў. Яны прадставяць дасягненні кафедраў мастацтва эстрады, тэатральнай творчасці, духавой музыкі, харэаграфіі, народна-інструментальнай творчасці ды інш. Гледачы ацэняць майстэрства ансамбляў “Валачобнікі”, “Талака”, “Грамніцы”, “Баламуты”. Канцэрты, як ужо вядома нашым чытачам, праходзяць у Маладзёжным тэатры эстрады, Клубе імя Ф. Дзяржынскага, у Вялікай зале Белдзяржфілармоніі. А 25 траўня ў Цэнтральным доме афіцэраў адбудзецца ўрачыстае завяршэнне акадэмічнага года і гала-канцэрт фестывалю мастацтваў “Арт-мажор 2007”.

Прыватная калекцыя спрабуе нас «to back»

Абрэвіятура “СССР” зрабілася брэндам. Выраз “back in the USSR” (міжволі прыгадаеш гучанне знакамітага бітлоўскага хіта!) у папулярнасці не адстае ад яе. Таму і назва выстаўкі жывапісу “Back in USSR: партрэт на фоне эпохі” падалася асабліва прыцягальнай, тым болей, што прадстаўляла яна прыватную калекцыю Іны і Аляксандра Радаевых.

Як мяркуе Таццяна Бембель, дырэктар Гарадской мастацкай галерэі твораў Л. Шчамялёва, дзе экспанавалася калекцыя, гэтая выстава з’явілася значнай падзеяй у мастацкім жыцці сталіцы. Па-першае, дэманстраваўся вельмі вартасны матэрыял. А па-другое, упершыню была прадстаўлена шырокаму колу людзей калекцыя, цалкам сфарміраваная ў Беларусі. Прыватная калекцыя твораў мастацтва доўгі час не разглядалася як адмысловая цэласнасць. Але, між іншым, менавіта прыватная ініцыятыва калекцыянавання запачаткавала найбуйнейшыя мастацкія зборы ў многіх краінах.

Уладальнікі прадстаўленай калекцыі Іна і Аляксандр Радаевы збіраюць жывапіс толькі 5 гадоў. Але падбор уражвае аўтарскімі імёнамі: І. Ахрэмчык, В. Цвірка, Я. Красоўскі, І. Стасевіч, В. Жолтак, С. Каткоў і многія іншыя. Калекцыя насамрэч мае нейкую цэласнасць — у колерах, стылях, тэхніках, — можа, гэта адбітак індывідуальнасцяў саміх калекцыянераў.

Выстава зрабіла ўражанне своеасаблівай серыі партрэтаў. Сталявары, брыгадзіры, даяркі і настаўніцы — вось героі сабраных палотнаў. Але, шчыра кажучы, партрэты даяркі часоў Хрушчова і даяркі сучаснай наўрад ці будуць адрозніваццa ў сваёй сутнасці. Выстава пазіцыяніравалася як “партрэт на фоне эпохі” — дык вось эпоха тая, на жаль, не вельмі адчувалася. Можа, таму, што сам я чакаў крыху большай эпатажнасці, чырвані ды “серп-і-молатнасці” ад назвы “Back in USSR”?

Алесь КІРЫКОВІЧ

Дзевятая Паўлінка Арнольда Памазана

27 сакавіка ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы адбылася ўрачыстая вечарына з нагоды Міжнароднага дня тэатра. Сапраўднае свята мастацтва, вечных каштоўнасцей жыцця, духоўнасці пачалося яшчэ ў фае тэатра — узнёслай мелодыяй гасцей сустракалі тамтэйшыя музыкі. Складвалася ўражанне, быццам сам будынак дыхае прадчуваннем значнасці і прыгажосці гэтай падзеі.

Першым прысутных на вечарыне павіншаваў міністр культуры Беларусі Уладзімір Матвейчук, зазначыўшы: "У Беларусі 29 тэатраў, у якіх працуе больш як 4000 чалавек, за 2006 год пастаўлена каля 1600 спектакляў. Дзяржава стараецца ўважліва адносіцца да гэтай галіны мастацтва. Распрацаваныя праграмы рамонту і рэканструкцыі тэатраў, наладжваюцца фестывалі з удзелам розных тэатральных калектываў. Сёлета дзевяць таленавіцейшых дзеячаў беларускай сцэны атрымалі вышэйшыя дзяржаўныя ўзнагароды".

А колькі цёплых, шчырых слоў было сказана пра тэатр!

"Тэатр вечны, неўміручы, бясконцы, — з захапленнем прамовіў старшыня Беларускага саюза тэатральных дзеячаў, вядучы айчынны драматург Аляксей Дударай. — Усе людскія нягоды: войны, тэрарызм, катаклізмы — ад маральнага разбэшчвання чалавека. А галоўная роля мастацтва — актыўна разбураць зло, выхоўваць духоўнасць, чысціню і дабрыню".

"Тэатр — маё жыццё, асалода, грэх...", — сказаў вядомы беларускі кампазітар Уладзімір Кандрусевіч, які ў гэты дзень стаў лаўрэатам прэміі імя Л. Александроўскай. Хочацца назваць і іншых герояў урачыстасці: прэмія імя Е. Міровіча была ўручана рэжысёру Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра Генадзю Мушперту, акцёр Драматычнага тэатра Беларускай Арміі Ігар Фільчанкаў узнагароджаны прэміяй імя І. Буйніцкага, прэміяй імя Л. Мазалеўскай ганараваны мастак Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек Валерый Рачкоўскі, прэміяй імя Кандрата Крапівы — тэатральны крытык, доктар філалагічных навук Таццяна Арлова.

"Крыштальную кветку", вобразна кажучы, "з вяночка Паўлінкі" атрымала актрыса Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага Вераніка Пляшкевіч, "Крыштальная зорка" засвяцілася ў руках артысткі-вакалісткі Беларускага дзяржаўнага музычнага тэатра Людмілы Станевіч, а "Крыштальны анёлак" шчасліва "прызямліўся ў Гародні": яго атрымаў рэжысёр Гродзенскага тэатра лялек Алег Жугжда.

А галоўная тэатральная ўзнагарода — "Крыштальная Паўлінка" — вядзе свой радавод з 1992 года. Самай першай яе атрымала славутая Стэфанія Станюта. У свой час шчаслівымі ўладальнікамі "Крыштальнай Паўлінкі" станавіліся Расціслаў Янкоўскі, Барыс Герлаван, Святлана Акружная, Марыя Захарэвіч, Наталля Гайда, Віктар Чарнабаеў, Генадзь Аўсяннікаў і інш.

У гэтым годзе за адданасць нацыянальнаму тэатру, шматгадовую творчую дзейнасць прызам "Крыштальная Паўлінка" ганараваны народны артыст Беларусі, акцёр Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Арнольд Памазан. Трымаючы ў руках прыгожую і крохкую статуэтку, герой вечарыны расчулена прызнаўся: "Я 32 гады ў ролі Быкоўскага. І ў мяне было восем Паўлінак, і ўсіх я кахаю. Гэтая — дзевятая — пакахала мяне. І цяпер заўсёды будзе са мною..."

Ірына ГРЫГАРАН

На здымку: народны артыст Беларусі А. Памазан з узнагародай.

Фота К. Дробава

Тры прэм'еры

Колькі разоў даводзілася чуць, што ў мастацкім жыцці сталіцы бракуе харэаграфічных уражанняў. Асабліва гэта датычыць сучаснага танца. Прадзюсерскі цэнтр "Мэджык" бярэцца змяніць сітуацыю. Пры падтрымцы цэнтра на сцэне Цэнтральнага дома афіцэраў адбыліся прэм'еры танцспектакляў "Дах", "Зіма" і "Дэ. Рэ." тэатра "D.O.Z.SK.I".

Тэатр сучаснай харэаграфіі "D.O.Z.SK.I" ў айчынным данскантэксце ўзнік зусім нядаўна — у 2005-м, аднак адразу прыцягнуў увагу як "неспакушанага гледача", так і прафесіяналаў. Дзіўная, на першы погляд, назва калектыву (чытай проста: "Доскі") — абрэвіятура з пачатковых літар прозвішчаў і імёнаў яго стваральнікаў Дзмітрыя Залескага і Вольгі Скварцовай. Дарэчы, абое яны з Віцебска, а гэта значыць, узраслі на славутым тамтэйшым IFMC (International Festival of Modern Choreography). Менавіта гэтая акалічнасць задае "нефарматны" тон іх самавыяўленню.

Адметнасць спектакляў новага тэатра вызначаецца арганічным узаемадзеяннем харэаграфічнага і тэатральна-драматычнага мыслення, бо кожны з кіраўнікоў калектыву праз сваю адукацыю і артыстычны вопыт уносіць у пастаноўкі асабісты творчы досвед (Д. Залескі мае харэаграфічную адукацыю, а В. Скварцова — тэатральную). Іх сумесныя творы — гэта, хутчэй, пластычныя спектаклі, чым харэаграфія ў яе звычайным разуменні. Прынамсі, працэс збліжэння танца і тэатра сёння назіраецца ва ўсім свеце (як тут не згадаць славутага Ё Стромгрэна, які літаральна ўзрушыў публіку на IFMC год таму!). Між іншым, у нас пакуль такіх эксперыментаў няшмат. Найбольш яскрава ў гэтым плане вылучыліся П. Адамчыкаў (пастаноўкі "Болей, чым дождж", "С. В." у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы) ды "інжэставец" В. Іназемцаў.

Кожны з паказаных спектакляў варты асобнай гаворкі. Калі "Зіма" і "Дэ. Рэ." створаныя ў творчым тандэме, дык "Дах" — пастаноўка В. Скварцовай. І не такая ўжо яна і прэм'ерная, бо не адзін сезон ішла ў рэпертуары студэнцкага тэатра Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Але кожны раз аўтар дадае да свайго твора штосьці новае, больш адточваецца і майстэрства выканаўцаў — выпускнікоў акцёрскага аддзялення акадэміі. Дах — не толькі рэальнае месца дзеяння, паяднальнае для ўсіх герояў, але і сімвалічны вобраз спектакля. Гэта нейкая прамежкавая прастора, край, рубеж і пачатак чагосьці абсалютна новага, невядомага. Самае страшнае тут — адважыцца на першы крок, крок у бездань...

Эмацыйная танальнасць твора надзвычай насычаная і выбухова небяспечная ў адрозненне, скажам, ад "Зімы" з яе стрыманай, прыхаванай экспрэсіяй. Пластычная "нешматслоўнасць", статычныя, падобныя да стопкадраў, мізансцэны агаляюць асноўны "балючы нерв" спектакля, галоўную тэму: трагедыю чалавечай адзіноты. Назва ўспрымаецца метафарай унутранага холаду, які скаваў ільдом не толькі цела, але і пранік у сэрца, паралізаваў душу.

Дарэчы, матыў адзіноты, адчужанасці — тое, што яднае гэтыя, на першы погляд, вельмі розныя пастаноўкі, робіць іх непарыўным ланцужком адзінага дзеяння. Сюды ўпісваецца нават "Дэ. Рэ." (або, папросту кажучы, "Дзень нараджэння") з яго камедыйна-парадыйнымі інтанацыямі. Здавалася б, тут ёсць усе прыкметы свята: імяніннік, "адвязная тусоўка", танцы да ўпаду тварам акурат у торт (!) з крэмавымі ружачкамі. Але за агульнай вясялосцю, за мноствам дасціпных пластычных знаходак і "прыколаў", якія шчодра сыплюцца на гледача, бы з рога дастатку, раптам праступае пранізлівы чэхаўскі матыў — "все любят, но никто не любим". Фінал балета нечаканы. На сцэне ў поўнай адзіноце застаецца герой урачыстасці. Шумная кампанія, песні-танцы — усё гэта, як аказалася, спарадзілі "віртуальныя гульні" ягонага розуму.

Аднак у каго і адбыўся сапраўдны Дзень нараджэння, дык гэта ў тэатра "D.O.Z.SK.I". І гасцей сабралася шмат: зала Цэнтральнага дома афіцэраў ледзь умясціла ўсіх ахвочых.

Святлана УЛАНОЎСКАЯ

Фота Ю. Будзько

Лічба і факт замест журы

Конкурсы, прызы, намінацыі — да гэтага ўсе прызвычаіліся. "Журы падкупленае!", "Суддзю на мыла!", — вельмі рэдка ўсе аднагалосна пагаджаюцца з вынікамі той ці іншай імпрэзы. Асабліва гэта датычыць спаборніцтваў у сферы шоу-бізнесу. Колькі, напрыклад, было спрэчак наконт фіналу "Еўрафэсту"!

Добры спосаб выяўляць пераможцаў вынайшла кіраўніцтва сеткі музычных крамаў "Містэрыя гуку". Не так даўно чарговы раз было праведзена ўручэнне узнагарод музыкантам. Адзіны і галоўны крытэрый пры падвядзенні вынікаў — колькасць прададзеных дыскаў ці аўдыёкасет таго ці іншага выканаўцы. "Радыйнасць", наяўнасць відэакліпаў, стылістычны напрамак — гэта ўсё не мае ніякага значэння.

У гэтым годзе дзейнічае 6 намінацый. У кожнай намінацыі ёсць тры пераможцы. Такім чынам, мы можам бачыць асноўных лідэраў музычнага рынку.

Трэба дадаць, што сёлета пры падвядзенні вынікаў улічвалася не проста колькасць прададзеных музычных носьбітаў, але і іх кошт. Вядома, аўдыёкасета каштуе значна танней за кампакт-дыск. Дыскі каштуюць таксама па-рознаму. Гэтае змяненне ў спосабе падліку вельмі спадабалася Зміцеру Вайцюшкевічу, пераможцы ў намінацыі "Незалежная музыка — альбом года". Кошт яго дыскаў звычайна даволі высокі.

Пераможцам у галоўнай намінацыі "Альбом года" ўжо другі раз названы гурт "J:морс" з сваім апошнім альбомам "Босиком по мостовой". Перамога ў намінацыі "Рок-альбом года" — за ім жа. "Мяркую, наступны альбом мы запішам толькі ў 2008 годзе, таму ў наступным конкурсе наша месца вакантнае", — пажартаваў Уладзімір Пугач.

З 2-га на 1-е месца падняўся гурт "Тяни-толкай" у намінацыі "Поп-альбом года". Адзін з удзельнікаў "талкайцаў" Павел Тараймовіч запэўніў, што ў наступным разам яны будуць імкнуцца да "Альбома года".

Стваральніцы лепшага сінгла "Merry Poppins" не змаглі прысутнічаць на цырымоніі з прычыны сваёй занятасці ў Маскве. Атрымліваць узнагароду прыляцеў іх прадзюсер Яўген Калмыкоў. Не прысутнічаў і пераможца ў намінацыі "Хард-рок/метал альбом года" гомельскі гурт "Rasta". Дырэктар гурта Вадзім Хоміч паведаміў, што "Rasta" цяпер большую частку часу праводзіць за мяжой. У англамоўнага гурта заключаны кантракт з адным з еўрапейскіх лэйблаў. "Таму нас вельмі прыемна здзівіла тое, што нашу творчасць так высока ацанілі і ў роднай краіне", — сказаў Вадзім Хоміч.

Калі гаварыць пра поўны спіс пераможцаў, то ён выглядае так:

"Альбом года"
1. J:морс, ***"Босиком по мостовой"***.
2. Тяни-Толкай, ***"Как же долго я тебя искал"***.
3. Алена Грышанава, ***"Любовь не убивают"***.

"Сінгл года"
1. Merry Poppins, ***"Merry Poppins"***.
2. Bez Bileta, ***"Popravka 22"***.
3. Indiga, ***"Заенька"***.

"Поп-альбом года"
1. Тяни-Толкай, ***"Как же долго я тебя искал"***.
2. Алена Грышанава, ***"Любовь не убивают"***.
3. Аляксей Хлястоў, ***"Потому что я люблю"***.

"Рок-альбом года"
1. J:морс, ***"Босиком по мостовой"***.
2. Пётр Ялфімаў, ***"Я хочу..."***.
3. Ляпис Трубецкой, ***"Мужчины не плачут"***.

"Хард-рок/метал альбом года"
1. Rasta, ***"The Age Of Movement"***.
2. Zet, ***"Radzima.com"***.
3. Drum Ecstasy, ***"H.D.M."***.

"Незалежная музыка — альбом года"
1. Зміцер Вайцюшкевіч / WZ-Orkiestra, ***"Танга з ружай"***.
2. Стары Ольса, ***"Гераічны эпас"***.
3. CherryVata, ***"Где!?"***.

Трэба заўважыць, што гэтыя дадзеныя абапіраюцца на продаж музычнай прадукцыі толькі ў сетцы "Містэрыя гуку". І хаця яна ахоплівае значную частку музычнага рынку, але ўсё ж існуюць і іншыя сеткі. У мінулым годзе кіраўніцтва "Містэрыі гуку" прапаноўвала крамам-канкурэнтам аб'яднацца і зрабіць сумесны падлік прададзеных носьбітаў беларускіх выканаўцаў, але прапанова засталася без увагі.

А. СЛОНІК

Установа адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі»

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад (да 5-ці гадоў) прафесарска-выкладчыцкага складу (для тых, хто мае мінскую прапіску) з далейшым заключэннем кантракту ў выпадку выбрання на тэрмін, вызначаны Наймальнікам:

— кафедра харэаграфіі:
прафесар — 1

— кафедра філасофіі:
дацэнт — 1

— кафедра спецыяльнага фартэпіяна:
загадчык кафедры — 1
прафесар — 1
дацэнт — 1

— кафедра фартэпіяна:
старшы выкладчык — 1

— кафедра струнных народных інструментаў:
дацэнт — 1

— кафедра харавога дырыжыравання:
старшы выкладчык — 1

— кафедра моў:
старшы выкладчык — 1

— кафедра альта, віяланчэлі і кантрабаса:
выкладчык — 0,25

— кафедра аркестравага дырыжыравання:
дацэнт — 0,5

Наша слова з XI стагоддзя

Напрыканцы мінулага года ў выдавецтве «Беларуская навука» пры садзеянні НАН Беларусі і непасрэдным удзеле Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы выйшаў першы аб'ёмісты (больш як 900 старонак) том «Гісторыі беларускай літаратуры XI—XIX стагоддзяў». Давайце разам пагартаем іх, гэтыя старонкі. Ужо змест дазваляе зразумець, што да навуковай працы прыклалі розум, веды і душу каля 20 слынных беларускіх навукоўцаў (некаторыя з іх з'яўляюцца аўтарамі двух і трох артыкулаў). Невялікую, але ёмістую і ў добрым сэнсе жывую, зацікаўленую прадмову напісаў выдатны даследчык беларускай даўніны Вячаслаў Чамярыцкі (ён жа і навуковы рэдактар гэтага тома). Дакладна прадуманы падзел выдання на часткі.

«Літаратура эпохі Сярэднявечча: XI—XV стагоддзі». У гэтым раздзеле чытач мае магчымасць пазнаёміцца з артыкулам «Ранняе Сярэднявечча», дзе па-новаму асэнсоўваюцца месца і лёс нашых продкаў, тое, што яны чыталі, вусна альбо пісьмова ў рукапісах складалі, як уяўлялі свет вялікі і сябе ў вобразах, як паўплывалі на іхнюю культуру хрысціянства, а з ім і пісьменнасць. Тут падаецца аналіз агромністай ролі летапісаў, дзелавых запісаў, якія нараджаліся на патрэбу жыцця ў сувязі з эканамічнымі і гандлёвымі, культурнымі сувязямі нашых продкаў з суседзямі. З духоўных запатрабаванняў узнікалі тэксты набажэнстваў, павучанні і казанні, жыціі святых, апокрыфы. Неацэнную ролю для спазнання гісторыі, вобліку ўсходніх славян мела «Аповесць мінулых гадоў», новаму даследаванню якой у раздзеле адводзіцца вялікая ўвага. Як і пераасэнсаванню «Жыція Еўфрасінні Полацкай», «Жыція Аўрамія Смаленскага», «Слова пра манаха Марціна», творчасці царкоўнага і літаратурнага дзеяча сярэдзіны XII стагоддзя К. Смаляціча, які зрабіў значны ўклад у развіццё тагачаснай публіцыстыкі, Галіцкага-Валынскага летапісу (першыя звесткі пра ўтварэнне прыкладна ў 1246 годзе ВКЛ). У гэтым жа раздзеле побач з персаналіямі (К. Тураўскі, Г. Цамблак) аналізуюцца «Слова пра паход Ігара», тэксты эпохі позняга Сярэднявечча (граматы, «Судзебнік» Казіміра 1468 года, так званая «Літоўская метрыка», «Жыціе трох віленскіх пакутнікаў», перакладныя творы, «Хаджэнне Ігнація Смаляніна», «Пахвала вялікаму князю Вітаўту», «Пахвала гетману Канстанціну Астрожскаму» і інш.). Раздзел заканчваецца даследаваннем часу і ўмоў напісання, а таксама зместу ўласна беларускіх летапісаў («Летапіс вялікіх князёў літоўскіх»).

Наступная частка кнігі мае загаловак «Літаратура эпохі Адраджэння. XVI стагоддзе». Тут знаходзім уступнае слова пра новы перыяд у развіцці беларускай дзяржаўнасці і культуры, даследаванні, прысвечаныя Ф. Скарыне, М. Гусоўскаму, С. Буднаму, А. Рымшу, Г. Пельгрымоўскаму, і асобныя артыкулы «Хронікі» («Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага», «Хроніка Быхаўца»), «Публіцыстычная літаратура» (творчасць К. Русіна, «Размова паляка з ліцвінам» А. Ратундуса, шматлікія творы Мікалая Радзівіла, В. Цяпінскага, А. Волана, Л. Сапегі і інш.). Мабыць, не кожны з нас здолее шмат сказаць пра паэзію XV стагоддзя. Таму ў гэтай частцы тома свае веды можна значна пашырыць дзякуючы даследаванню «Паэзія», прасачыўшы творчы лёс Л. Мамоніча, Я. Вісліцкага (адзін з першых у паэме «Пруская вайна» сродкамі паэзіі адлюстраваў Грунвальдскую бітву 1410 года), П. Раізія (напісаў каля 1 200 твораў), Я. Мылія, Б. Гіяцынта, Ф. Градоўскага, Я. Радвана (цікавая ягоная паэма «Радзівіліяда.»), Я. Каханоўскага, Я. Зарэмбы, М. Чаховіча, Ц. Базыліка, С. Лаўрэнція і многіх іншых.

Заключныя раздзелы тома прысвечаны літаратуры эпохі барока (канец XVI — першая палова XVIII стагоддзяў). Гаворка пачынаецца аглядным артыкулам «На рубяжы эпох», у якім акрэсліваюцца грамадска-палітычная і культурная сітуацыя ў Еўропе, Польшчы і ВКЛ таго часу, што натуральна вядзе да знаёмства з наступным даследаваннем «Палемічная літаратура». У ім апавядаецца пра ўспрыманне тагачасных рэлігійных спрэчак (Брэсцкая унія 1569 года), разглядаюцца тэзісы К. Астрожскага пра ўмовы задзіночання хрысціянаў, палеміка уніята П. Скаргі і нязгоднага з вызначэннем дамінуючай ролі рымскіх біскупаў Х. Філалета, С. Зізанія, а таксама пра асветніцкую працу і апанента М. Смятрыцкага Л. Зізанія, палемістаў А. Мужылоўскага і Я. Руцкага, дзейнасць ініцыятара рэфармавання традыцыйнай праваслаўнай сістэмы адукацыі, публіцыста С. Косава. «Палемічная літаратура — унікальная з'ява нацыянальнай мастацка-эстэтычнай і духоўнай культуры, — зазначае аўтар гэтага артыкула. — Паводле колькасных і якасных параметраў — багацця жанраў, літаратурных формаў, ступені ўплыву на важнейшыя сферы жыцця грамадства — яна належыць да асноватворных відаў пісьменства. Феномен узнікнення аграмаднай у колькасных і якасных адносінах мастацкай палемічнай спадчыны Беларусі канца XVI — першай паловы XVIII стагоддзяў тлумачыцца той акалічнасцю, што нашы продкі для пераадолення, «знясцця» натуральных супярэчнасцяў і непазбежных канфліктаў — сацыяльных, этнічных, канфесійных, міжнародных — абіралі не сілавыя збройныя метады, не шлях фізічнага знішчэння ворага, а пераносілі барацьбу ў інтэлектуальную сферу, надавалі ёй формы свабоднай, адкрытай дыскусіі на старонках друкаваных і рукапісных твораў».

У заключнай частцы чытач зможа бліжэй пазнаёміцца з асобамі і творчасцю І. Пацея, М. Смятрыцкага, Л. Карповіча, А. Філіповіча, Я. Пратасовіча, С. Рысінскага, С. Полацкага, Ф.У. Радзівіл. Іншыя публікацыі дазволяць скласці большае ўяўленне пра паэзію, гісторыка-мемуарную літаратуру, драматургію, перакладную, рэлігійную і свецкую літаратуру, творы позняга барока: усё разам пацвярджае вядомы тэзіс пра тое, што XV—XVI стагоддзі — сапраўды «залаты век» беларускай мовы і культуры.

У даследаванні маюцца паказальнікі імёнаў, спіс выкарыстанай літаратуры (каля 500 назваў), што робіць выданне па-навуковаму грунтоўным, пазнавальным і патрэбным кожнаму, хто жадае беларускую даўніну ведаць глыбей (шкада, наклад яго невялікі — 1 000 асобнікаў).

Генрых ДАЛІДОВІЧ

Беларускі руплівец з Маладзечна

У 2005 годзе ў выдавецтве "Мастацкая літаратура" ўбачыла свет даволі аб'ёмная кніга, дваццаць дзевяць друкаваных аркушаў, "Я тут бачу свой край..." Кніга гэта пра літаратурную Маладзечаншчыну. Своеасаблівая анталогія Маладзечанскай зямлі ад яе мінуўшчыны да нашых дзён, якая ахоплівае значны пласт гісторыі і літаратурнага жыцця багатага на таленты краю. Пачынаецца яна ўспамінамі Міхала Агінскага, вершамі Тамаша Зана, Янкі Купалы, Якуба Коласа. Чытач таксама знаёміцца з творчасцю вядомых і маладых літаратараў. Укладальнікам гэтай цудоўнай кнігі "Я тут бачу свой край..." з'яўляецца Міхась Казлоўскі.

І вось у 2006 годзе М. Казлоўскі выдае ўжо сваю кнігу "Галасы разбуджаных птушак". Літаратурныя партрэты і роздумы над кнігамі. А ў гістарычна-біяграфічных нарысах расказваецца пра лёсы забытых дзеячаў былой Заходняй Беларусі.

У літаратурных партрэтах "Свой крыж несучы", "І падала зерне ў ралю", "Летапісец нашай славы" М. Казлоўскі апавядае пра пісьменніка Пятра Бітэля, якому давялося зведаць усе жахі сталінскіх лагераў і які там пераклаў на беларускую мову паэму Адама Міцкевіча "Пан Тадэвуш", пра вядомага краязнаўцу і пісьменніка Генадзя Каханоўскага, гісторыка Міколу Ермаловіча.

З П. Бітэлем, Г. Каханоўскім і М. Ермаловічам М. Казлоўскі доўгія гады сябраваў, і таму літаратурныя партрэты гэтых вядомых людзей атрымаліся вельмі вобразнымі і яскравымі.

Добра помніцца, калі летам, адразу ж пасля выхаду кнігі М. Казлоўскага "Галасы разбуджаных птушак", у Цэнтральнай бібліятэцы імя Максіма Багдановіча праходзіла яе прэзентацыя. У той вечар чытачы сказалі аўтару шмат цёплых і добрых слоў, пажадалі яму яшчэ больш творчых поспехаў.

Вядома, што М. Казлоўскі — асоба таленавітая.

А мне хочацца расказаць яшчэ пра адну творчую рысу М. Казлоўскага. Ён не толькі таленавіты пісьменнік і публіцыст, але і выдавец. Напрыклад, ён выдаў кнігу "Творы" Хведара Ільяшэвіча, паэта і празаіка, які жыў у Заходняй Беларусі і якому лёс наканаваў усяго 38 гадоў.

Дзякуючы няўрымслівай апантанасці М. Казлоўскага ў 2005 годзе выходзіць з друку кніга нашага самабытнага драматурга Івана Козела "Над хвалямі Серабранкі".

А яшчэ на рахунку выдаўца М. Казлоўскага дзве кнігі паэзіі і прозы Віктара Шніпа, Людмілы Рублеўскай, Уладзіміра Корзуна і Кастуся Харашэвіча.

Кіруючы літаратурным аб'яднаннем "Купалінка" пры Маладзечанскай газеце, М. Казлоўскі стараецца перадаць літаратарам-пачаткоўцам любоў да мастацкага слова, вучыць іх шанаваць і берагчы родную мову, настойліва шукае ў іх творчасці зярняткі таленту. І як вынік — Лідзія Гардынец мае свой першы зборнік вершаў, радуецца сваёй кніжцы другая паэтка, Ала Клемянок. М. Казлоўскі — шчыры руплівец, які ўлюбёны ў сваю родную Бацькаўшчыну. Ён выдае гісторыка-краязнаўчы і літаратурна-мастацкі часопіс "Куфэрак Віленшчыны". Публікацыі ў гэтым часопісе прысвячаюцца ў асноўным гісторыі, краязнаўству, фальклору, этнаграфіі, прапагандзе творчасці мясцовых пісьменнікаў і мастакоў.

У часопісе надрукаваны "Крокі майго жыцця" Г. Каханоўскага, успаміны жонкі Б. Тарашкевіча В. Ніжанкоўскай-Тарашкевіч, гістарычны раман "Развал" Пятра Бітэля, ліставанне З. Верас, А. Клімовіча, П. Мядзёлкі, М. Ермаловіча ды іншыя цікавыя матэрыялы.

Ужо выдадзена адзінаццаць нумароў часопіса. Усе прыхільна сустрэты чытачамі. Пра "Куфэрак Віленшчыны" вельмі хораша адгукнуліся такія вядомыя пісьменнікі, як Н. Гілевіч, Я. Брыль, А. Ліс, В. Жуковіч.

Янка ГАЛУБОВІЧ

На здымку: М. Казлоўскі і Р. Баравікова.

Аўтара выратуе сціпласць

"Пісьменнік, канечне, павінен зарабляць, каб мець магчымасць існаваць і пісаць, але ён ні ў якім выпадку не павінен існаваць і пісаць для таго, каб зарабляць".

К.Маркс.

Жыццёвыя ўрокі

Сустрэўся з колішнім дэканам факультэта, дзе вучыўся.

— Чытаў-чытаў тваю рэцэнзію.

— На вашага калегу? – удакладніў я.

— Так. Некалі таксама быў яршысты. У рожкі са старымі цягнула. Жыццё навучыла, што можна, а што – не.

— Напрыклад?

— Навошта пакрыўдзіў старога чалавека? Ну, піша вершы – і хай піша. Даваў пачытаць – звычайная пасрэднасць. Калі паэт выдае зборнік за ўласныя, часта не лішнія ў сям'і, грошы, ён гэта робіць не дзеля нас, а дзеля найперш сябе. Уласнай патрэбы душы. Асабліва, калі ўзрост "пад шэсцьдзесят" ці болей. Зараз ён з табою не вітаецца...

— Затое рыхтуе новую кнігу. Для Вечнасці... – кінуў я.

- Зразумей, гэты чалавек ні на што сур'ёзнае не прэтэндуе. Ён проста хоча пакінуць пасля сябе след. А ты ў лоб б'еш. Нельга... Помню, у нас на факультэце пры незабыўным У.К. была традыцыя: калі нехта напісаў рэцэнзію – абавязкова нёс спярша яму. Скажа: добра – можна друкаваць. Не – значыць, не варта.

Карцела спытаць тады: "Няўжо і мне, грэшнаму, трэба прыносіць свае "неудобные" опусы на зацвярджэнне розным "незабыўным" прафесарам, каб тыя альбо наклалі вета, выбракаваўшы злосную ерась, альбо дазволілі "ісці з мірам"? Абсурд несусветны. Ды яшчэ пад маркай гульні ў прыстойнасць і гуманізм.

Упэўнены на сто працэнтаў, і ніхто не пераканае мяне ў адваротным: кнігу не выдаюць толькі дзеля сябе, аўтару заўсёды хочацца зваротнай сувязі, з тым жа чытачом, без якога ўся "пісаніна" страчвае ўсялякі сэнс. Зразумела, што не ўсе ўмеюць толькі хваліць. Друкаванне – гэта заўсёды рызыка. Адважыўся – пасля не крыўдуй. Літаратурнага смецця хапала ва ўсе часы. На жаль, лекавых сродкаў ад паэтычнай дыярэі пакуль няма...

У пошуках ідэальнага чытача

У маім сціплым творчым багажы ёсць дзве рэцэнзіі, за якія мне па-сапраўднаму соромна. Напісаныя дзеля эксперыменту, яны былі разлічаны на ідэальнага чытача. Паводле задумы, ён павінен быў адшукаць за знешняй хвалебнай церухой адваротны сэнс. Даволі арыгінальна і эфектна. Але эксперымент не ўдаўся. Спадзеў на ідэальнага чытача не апраўдаўся. Усё ўспрынялі ўсур'ёз, горш за тое – знаёмыя пісьменнікі залічылі мяне ў здраднікі нацыянальным інтарэсам Літаратуры. Ад тых двух опусаў я не адмыўся да сённяшняга часу і, думаю, іх цень будзе заўсёды праследаваць як сімвал "непаслядоўнай палітыкі" і памылкова абранай тактыкі наіўнага, прычым паталагічна, маладзёна-максімаліста. Так разбураюцца міфы і прыходзіць горкі жыццёвы вопыт.

А зрэшты, што тут кепскага? Калі разабрацца, дык уся вінаватасць палягае ў адным: крытык шукаў ідэальнага чытача і, на жаль, не знайшоў яго, у выніку чаго высмеяў сябе сам. Праблема сучаснай літаратуры – адсутнасць уласнай адказнасці за напісаныя словы. Надрукаваўся ў часопісе – хораша на душы, выдаў кнігу – яшчэ лепш. Ці чытае нехта ўсё гэта, акрамя саміх аўтараў? Вопыт маіх назіранняў сведчыць , што каля 90 працэнтаў чытачоў часопісаў – гэта тыя, хто там надрукаваўся. Атрымліваецца вакуум. Паэты – асобна, чытачы – таксама. Адны пішуць для сябе, другія для сябе жывуць, не абцяжарваючы галаву тым, што пішуць першыя.

Адзінае, што ў сучасным грамадстве не выклікае сумневу, - класіка. За ёю можна надзейна схавацца ад безлічы сённяшніх невылечных графаманаў, пакінуўшы іх сам-насам з сабою. Калі ігнаруеш – выклікаеш гнеў і неразуменне. Заканамерная высноваа: ідэальны чытач не праверанаю часам літаратуру не чытае (даруйце за таўталогію), але ён настолькі няўлоўны, што вымушае працягваць яго нястомныя пошукі, каб канчаткова не расчаравацца ў людзях як істотах разумных.

Дзе вы, шамякіны?..

У газетах часта можна сустрэць абстрактныя развагі пісьменнікаў на тэму: "Чаму нас не чытаюць?". Заўсёды вінаваціць знешнія абставіны: сацыяльную неўладкаванасць, дэвальвацыю духоўных каштоўнасцей, эканамічныя законы рынку, няўдзячных чытачоў, чыноўніцкую няўвагу... Пры гэтым дружна замоўчваюць сваю (першасную!) ролю ў гэтай, ледзь не апакаліптычнай, сітуацыі. Адказ на "метафізічнае" пытанне аб нечытанні ляжыць на паверхні.

Калі знаёмішся са зместам літаратурна-мастацкіх часопісаў, ствараецца адчуванне, што нашы празаікі жывуць у іншай рэальнасці, іншым часавым вымярэнні... Найчасцей пісьменніцкая ўвага скіравана ў далёкае гістарычнае мінулае, да падзей Вялікай Айчыннай вайны або да фантастычных росшукаў у бязмежных прасторах Сусвету... Што адсутнічае ў гэтым небагатым тэматычным ланцужку? Правільна: непрычасаная сучаснасць! Паўсюль – суцэльная "бясклсавасць" персанажаў, іх штучная адарванасць (абарона?) ад жыццёвых рэалій канкрэтнага, сённяшняга дня... Героі жывуць у віртуальна-выдуманым свеце пісьменніка, пазбаўленым яскравых атрыбутаў часу, які проста не адчуваеш. Адсюль вынікае, што галоўнай адметнасцю сучаснай айчыннай літаратуры з'яўляецца яе парадаксальная несучаснасць. Неадпаведнасць задачам бурнай эпохі, кажучы мовай сацрэалізму.

Можна колькі заўгодна крытыкаваць Івана Шамякіна за кан'юнктуршчыну і "прыстасавальніцкае" творчае крэда ў выбары тэм, аднак ніхто не аспрэчыць, што якраз гэтага нам сёння і не хапае, паколькі без асэнсавання надзённай сучаснасці нельга рухацца наперад. Сёння ж відавочны недаравальны прастой у гэтай сферы. Калі хто і бярэцца, то настолькі асцярожна, што гэтай асцярожнасцю звычайна ўсё і абмяжоўваецца.

Крый Божа, увесну не вернуцца на родныя палеткі буслы, дык у пісьменнікаў скончацца ўсе тэмы, якія так ці інакш круцяцца вакол каларытнага нацыянальнага сімвала, зашмальцаванага да непрыстойнасці. У шматлікіх апавяданнях дзеянне разгортваецца вакол мясцовай жыўнасці на фоне ідылічна-пастаральна-лірычнай рэчаіснасці – заходу чырвонага дыска сонца за край зубчастага бору ды гаманлівага шэпту крыніцы... Акрамя гэтага, сёння ў пісьменніцкім асяроддзі стала надзвычай модна ўзнаўляць карціны паганскага мінулага, ажыўляючы шматлікіх багоў... Куды падзеліся звычайныя людзі? Няўжо яны нецікавыя ў зменлівых варунках непрадказальнай сусветнай палітыкі? Гэта – нестандартна, нетрадыцыйна. Куды прасцей "загнаць" у чарговы твор якога-небудзь старажытнага князя, бажка або партызана...

Хіба дрэнна, узяўшы, скажам, на ўзбраенне Дырэктыву № 2 аб дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату, паказаць у рамане ці аповесці чыноўніка, які не можа працаваць без валакіты і фармалізму? Складана? А лёгкіх шляхоў сучаснасць не прапануе. Менавіта сваёй праблемнасцю, часавай прысутнасцю яна і цікавая патэнцыяльнаму чытачу, які імкнецца адшукаць у літаратурным творы адказы на балючыя пытанні развіцця грамадства і сваё месца ў ім. Але пісьменніцкія прапановы заканчваюцца чарговым алергічным рыкам каровы, ад чаго чытач бяжыць, як ад птушынага грыпу... Вось вам і адказ на пытанне "Чаму нас не чытаюць?".

Сяргей ГРЫШКЕВІЧ

У паэта Міколы Маляўкі мноства сапраўды добрых і цудоўных твораў. Сярод іх нямала, як я лічу, хрэстаматыйных. Але, зыходзячы не з таго спрошчанага паняцця хрэстаматыйнасці, што дае нам тлумачальны слоўнік, а з іншага: здольнасць твора ўсхваляваць, выклікаць роздум, стварыць адпаведны настрой і — помніцца праз многія гады. Пра адзін з такіх вершаў — «Школьны жаўрук» — мой аповед.

РЭАЛЬНАСЦЬ І ЛІТАРАТУРА

«У свет ішлі з любоўю і дабром...»

Увогуле ж, што да мяне як чытача, дык хрэстаматыйныя творы самых розных жанраў ёсць ці не ва ўсіх нашых паэтаў і празаікаў. Тут найперш маю на ўвазе тых, каму пашчасціла праявіць сябе ў літаратуры ў часы, калі яна была запатрабаваная грамадствам, калі кнігі выходзілі ў дзяржвыдавецтвах, дзе была высокакваліфікаваная рэдактура, а пра сённяшняе «баляванне» літбездарства, «народжанага» многімі прыватнымі выдаўцамі, ніхто і не думаў. Але вярнуся да «Школьнага жаўрука».

Чаму я спыніўся менавіта на гэтым творы Міколы Маляўкі?..

...Аднойчы халодным дажджлівым асеннім днём меўся патэлефанаваць адной знаёмай настаўніцы-пенсіянерцы, зямлячцы ў адну з вёсак на Магілёўшчыне. У Валянціны Міхайлаўны Н. (прозвішча не называю) быў дзень нараджэння. Падумалася, што ў такое надвор'е ёй, мабыць, сумна ў пустой, можа, як след не прапаленай хаце: жыве зараз адна, дзеці разляцеліся. Уявілася: сядзіць ля акна, пазірае праз мокрую шыбу на старую школу, у якой з кожным годам усё менш і менш вучняў і якая ў хуткім часе, калі ў жыцці вёскі нічога не зменіцца, — састарэе, а можа, і наогул знікне, як, між іншым, шмат дзе па ўсёй нашай зямлі ўжо састарэлі, а то і пазнікалі многія і многія вёскі. Думалася: мабыць, яна ўяўляе, як тады самі настаўнікі заб'юць вокны школы дошкамі і, быццам пахаваўшы штосьці вялікае і светлае, самотныя, разыдуцца па хатах, кожны думаючы пра адно: чаму так здарылася... А можа, будзе інакш: местачкоўцы ператвораць школу, у якой вучыліся самі і іх дзеці, у які склад ці наладзяць там «забягалаўку», спаганіўшы яе, як колісь людзі паганілі храмы... Хаця, падумалася: скрозь, як колісь пісаў Мікола Капыловіч, жывуць людзі. А яны ў большасці разумныя і мудрыя. Дык, паразважаючы, адзначаць, што жыццё ўвогуле някепска наладзілася, што зараз надаецца шмат увагі адраджэнню вёскі, дэмаграфічным праблемам, і школу тую зберагуць... Мабыць, што б там ні было, а мы не так ужо і «знелюдзелі», як іншым разам пераконваеш сябе, бачачы якую-небудзь жыццёвую недарэчнасць, «плод» нашых агульных неабдуманых дзеянняў...

Я не толькі хацеў павіншаваць Валянціну Міхайлаўну з днём нараджэння, але яшчэ даведацца, ці помніць хто з яе былых вучняў, што сёння ў яго настаўніцы дзень нараджэння? І наогул, ці віншуюць... Чаму? Ды здаецца, нешта ў нашым новым часе мы не вельмі шануем настаўнікаў. А што да пісьменнікаў, то годных новых літаратурных твораў пра педагогаў чамусьці няма, быццам і не яны нас вучылі. А ў сённяшніх вучняў даўно ўжо не такія інтарэсы і памкненні, як, напрыклад, у вучняў майго пакалення, і невядома, добра гэта ці кепска і як будзе далей.

Што пра шанаванне, дык неяк расказала мне Валянціна Міхайлаўна такі выпадак. Ішла яна вясною з райцэнтра ў вёску з паліклінікі (добрых вёрст дзесяць) па гразі — ніводнага спадарожнага грузавіка: звычайна калгасныя вадзіцелі спыняюцца, усіх падбіраюць. А тут — легкавік абганяе. Саступіла. Бачыць: едзе яе былы вучань з адным пасажырам. Не ўзяў... «Я і сама не села б у брудных боціках. Але навошта ён пра мяне маці сказаў? Тая ж, ведама, прасцячка, жанчынам разнесла: «Руку — тырк!.. Ага, вазьмі такую караўку, калі з чалавекам едзеш. А той жа чалавек майго Віціка на свеце трымае, ён яго хазяін ажно з-за мяжы!» «А што ж гэта за вучань?» — спытаў я. «Вучань выдатна вучыўся і ў школе, і ва універсітэце. Зараз працуе ў адной замежнай арганізацыі (назвала). Я не крыўдую на яго... Не крыўдую ні на каго з былых вучняў, калі не заўважаюць. Вядома, у кожнага свой клопат. А што адзін такі, другі такі — мы, настаўнікі, вінаватыя, не змаглі навучыць».

Згодны я з ёй тут ці не, гаварыць не буду. Але сказаў Валянціне Міхайлаўне ўсім нам вядомае. Маўляў, у жыцці нярэдка так бывае: выдатнік становіцца чалавекам такім, што за вярсту абыдзі яго, а іншы троечнік ды ціхоня — добразычлівым ды надзейным. І, калі ўжо так, то нейкія там замежныя арганізацыі або пасады, крэслы, якія важныя яны не былі б, яшчэ нікому з нас не прыбавілі ні розуму, ні таленту... Што ж датычыць «узяў — не ўзяў» у легкавік, дык тут агульная наша праблема па сённяшнім часе: адсутнасць павагі, выхаванасці, спагады да чалавека наогул. А з другога боку... Кожны раз, калі даводзіцца ехаць па тэрыторыі рэспублікі, бачыш, асабліва раніцою, як настаўнікі, дакладней, настаўніцы (іх жа — большасць сярод педагогаў), ідуць ад сваёй вёскі, дзе закрылі школку, у суседнюю, дзе яна яшчэ ёсць. І мала хто з іх спыніцца, каб падняць руку, маўляў, падвязі, незнаёмец. Спыняешся, запрашаеш у машыну і бачыш ніякаватасць. Пачынаеш гаварыць — гаркота: чаму ж мы часам да іх так няўважліва...

І вось набраў нумар яе тэлефона. Настаўніца падняла трубку. Толькі паспеў павітацца, як пачуў:

З вакацый летніх,
Як з-за мора,
Ён прылятаў такі адзін.
Спяваў у школьным калідоры,
Змаўкаў на сорак пяць хвілін.

Прачытаўшы гэты радок, Валянціна Міхайлаўна змоўкла. Так колісь рабіла мая настаўніца рускай мовы і літаратуры Ганна Кузьмінічна Бялянава. Яна, чытаючы, абавязкова напамяць, вершы рускіх і беларускіх паэтаў, часта не ўключаныя ў хрэстаматыі (што ў падручніках, мы чыталі самі), заўсёды спынялася на радку, які, як зараз разумею, патрабаваў працягу, развіцця тэмы, засяроджваў нашу дзіцячую ўвагу на тым: а што далей...

Імгнення хапіла, каб, як любяць казаць паэты, ускалыхнуліся кругі маёй даўно не юнай памяці. І праз безліч напластаванняў «добрага і рознага» ўспомнілася і мая родная Скачкоўская школа. Калі па будынках, дык так: першы — звычайная вясковая хата ў першым класе... Затым — невялікі, ужо новы дамок, дзе я вучыўся з другога па чацвёрты класы. І, нарэшце, вялікая, прасторная будыніна (з 5 па 10 класы), з паралельнымі класамі, кабінетамі, з найвыдатнейшай для пасёлка бібліятэкай. (Калі пра бібліятэку, дык па тым яшчэ надта бедным часе ў нас меліся літаральна ўсе кнігі беларускіх пісьменнікаў, што тады выдаваліся ў рэспубліцы, а таксама руская класіка. Лесаўчастак дапамагаў школе не толькі набываць літаратуру, але і яшчэ шмат чым). А як вобраз — усе тры — адна школа. Бо — адны сябры-таварышы, адна першая настаўніца і потым адны і тыя ж настаўнікі-прадметнікі. І — адзін ва ўсіх трох будынках «школьны жаўрук», які паўсюль «спяваў» аднолькава, запрашаючы на ўрок і з урока, пакуль недзе ў дзевятым класе наогул не знік, выціснуты электразванком. (Казалі, наш званок забраў на захаванне нехта з настаўнікаў).

— Дык гэта ж верш яшчэ з майго юнацтва! — здзіўлена ўсклікнуў я.

— Так, — прамовіла Валянціна Міхайлаўна. — Кніга Міколы Маляўкі «Круг», 1977 год. А я чытаю яго па апошняй аўтарскай рэдакцыі 2003 года, з "Настаўніцкай газеты". Тут званок асацыіруецца з жаўруком. Гэта — цудоўна! І ведаеш, я яго заўсёды чытаю калегам і былым вучням ці проста знаёмым людзям, хто на дзень настаўніка віншуе мяне са святам. І што цікава, просяць, каб прадыктавала. Дыктую і думаю: цікавяцца гэтым вершам, бо ўсе мы са школы. Помніш, як у Янкі Сіпакова: «Усе мы з хат»? А я дадам: і — са школы...

Івана Данілавіча, Янку Сіпакова, маецца на ўвазе яго крылаты выраз, адкуль мы ўсе, я помніў. Падумаў: як хораша Валянціна Міхайлаўна спалучыла свой выраз з выразам, сказаным гадоў сорак таму пісьменнікам і які мы, у тым ліку і я, не стамляемся пры нагодзе цытаваць: каб помнілі, хто мы, адкуль...

— Слухай далей, — сказала яна:

Пасля ў гняздзе —
У руцэ старожкі.
Ізноў стараўся,
Тут як тут:
Прасіў, каб я ля школьнай дошкі
Чытаў радкі пра родны кут.

Мне ж прыгадаўся мой родны кут, такім, як быў у школьныя гады. Але мой родны кут ствараўся маімі бацькамі разам з землякамі, былымі воінамі і партызанамі, адразу пасля вайны: першыя хаты ў 1946 яны паставілі каля векавога бору, які з трох бакоў акружаў паселішча і прадпрыемства — лесаўчастак. Я помню, за нашай сядзібай, выток тады яшчэ не знішчанай меліяратарамі рэчкі Добасны... Помню новыя прасторныя хаты пасялкоўцаў... Ля кожнай — маладыя сады... І вядома ж — новую школу. А ўзнікла яна так: пасля вайны сем'і ўсе былі маладыя. Пайшлі дзеці, і ўжо мой 49-ты год — адразу два паралельныя класы. Вось тады лесаўчастак аддаў пад школу былы будынак рабочага інтэрната, прыбудаваўшы да яго прасторны, з вялікімі вокнамі, трохсценак. У гэтую новую школу, прайшоўшы з намі дзве папярэднія школкі, прыйшоў і «школьны жаўрук»... Прынёс яго першы дырэктар Іван Фаміч Шаноль. У новую школу прыйшлі і новыя настаўнікі-прадметнікі: маладыя выпускнікі педінстытутаў, энергічныя рамантыкі 60-х — Валянцін Іосіфавіч Сівакоў, Зінаіда Якаўлеўна Сівакова, Ганна Кузьмінічна Бялянава, Ніна Аляксееўна Капусціна, Пятро Іванавіч Капусцін... Разам з нашымі першымі настаўнікамі, калі з маёй, то з Зінаідай Аляксандраўнай Худалей, радаваліся яны за вучняў і за сябе: свая новая школа ў пасялкоўцаў.

І яшчэ запомнілася, што нашы бацькі, якія шмат чаго пабачылі ў жыцці (між іншым, і па Еўропах пераможцамі пахадзілі), перад настаўнікамі здымалі шапкі, што ніколі не рабілі ні перад адным вялікім начальнікам, што час ад часу ажно з самой сталіцы прыязджалі на лесаўчастак, які тады «грымеў» па ўсёй рэспубліцы: перадавое прадпрыемства галіны.

Школа мая існавала ажно да канца мінулага года. Аслаб, прыйшоў у заняпад лесаўчастак: і лясы вакол павыразалі, і пасёлак састарыўся, прыйшоў у заняпад.

Я не буду гаварыць, колькі каго вялікіх і важных выхавала мая школа: ёсць шмат прыстойных сапраўдных людзей, дзе б і кім яны ні працавалі, ёсць і... не вельмі.

Ізноў пасля паўзы, Валянціна Міхайлаўна з тым жа прытоеным сумам чытала верш далей:

Пакуль жывы —
Звінець ён будзе,
Дажджлівай восенню,
Зімой
Маленькіх лёгкіх не застудзіць
Званок — жаўрук чароўны мой.

«Цікава, а якія былі настаўнікі ў паэта Міколы Маляўкі?» — падумалася мне. У яго кнізе «Старая зямля», выдадзенай у 2005 годзе паліграфкамбінатам імя Якуба Коласа, пазначанай, як «Санеты, спавітыя дзеразой», тыражом усяго 500 экземпляраў, шэраг твораў, прысвечаных ім. Трэба сказаць, што кніга ўся пра «родны кут». Помніце, менавіта «радкі пра родны кут» прасіў званок чытаць Міколку «ля школьнай дошкі»? Радкі ж тыя, як ведаем, са славутай коласаўскай Мікалаеўшчыны. З той часткі зямлі беларускай, якая праз бессмяротную «Новую зямлю» ўвайшла і пакуль яшчэ, дзякуй Богу, уваходзіць у свядомасць нашых дзяцей і ўнукаў, перш за ўсё са школы. Той «Новай зямлі», якую, аказваецца, сёння некаторыя людзі, нават якія літаратарамі лічацца, спрабуюць не прызнаць...

«Старая зямля» Міколы Маляўкі, ужо сёння бачна, — з'ява ў нашай літаратуры апошніх гадоў. І гэтую кнігу паэта ніхто не «раскручвае», ды, думаю, і не будзе. Але для паэта важна, калі яго твор, напісаны столькі гадоў таму, і сёння жыве сярод людзей, як, скажам, верш, «Школьны жаўрук»...

Упэўнены, што жыве гэты твор і ў сэрцах настаўнікаў паэта з мікалаеўскай школы, тых, хто, дзякуй Богу, яшчэ сярод нас і хто некалі вучыў хлапчуком Міколку Маляўку. І — у сённяшніх, маладых і не вельмі. Прозвішчы яго настаўнікаў — у санеце «Як вырай успамінаў, дум маіх...» Гэтыя настаўнікі вучылі будучага слыннага паэта «любіць жыццё» і людзей. Зрэшты, яны вучылі яго ўсяму таму няхітраму і разам з тым найскладанейшаму — самому заўжды заставацца між людзей чалавекам.

Я не магу зараз цытаваць санеты, прысвечаныя настаўнікам, бо зусім парушу пабудову майго, як кажуць некаторыя нашы «продвинутые», «тэксту». Але назаву некаторыя з іх: «Спрыяла ўсім нам дзецям, як свая» (прысвечаны Юліі Сяргееўне Тупяневіч, як прызнаецца сам паэт, яго любімай настаўніцы), «На пенсію збіралася не раз», «На ўроках не стаяла цішыня», «Яснеў за краявідам краявід», «Прынесла мне настаўніца вясну» і інш.

Дык вось, настаўнікі, названыя паэтам у гэтых санетах «кнігі лёсу адной вёскі» і не названыя, менавіта праз роднае беларускае слова ды праз зразумелае нам рускае слова на сваіх уроках (не толькі літаратуры) далучалі дапытлівага хлапчука Міколу Маляўку да цудоўнага, да сапраўдных духоўных скарбаў нашых народаў. І безумоўна, далучылі да гэтага многіх сваіх вучняў — сённяшніх хлебаробаў, сейбітаў, вайскоўцаў, урачоў — усіх, хто ў прыватнасці, дзякуючы іх, настаўнікаў, намаганням, годна ідзе па зямлі...

А далей верш той гучыць так:

Даўно я з дзён вучнёўскіх вырас,
Але і ў снег і на дажджы
Спявае шчыра ён
У выраі
Маіх гадоў,
Маёй душы.

Ну, што ж, канечне, такія радкі «збіраюцца» творцам у адзін верш і «сэрцам і душой». І Мікола Маляўка «збіраў» іх з таго самага першага імгнення, калі пачуў, як «спявае» «школьны жаўрук». Яны жылі ў яго душы з тых часоў, калі, не саромячыся (настаўнік — не адбі ахвоту дзіцяці наогул тварыць), нёс свае кволыя вершы Юліі Сяргееўне Тупяневіч. А яна, настаўніца, «вучыла думаць, летуценіць, верыць...»

Дабром і святлом да людзей азвалася ўсё тое потым у душы паэта і грамадзяніна Міколы Маляўкі. Сёння яе вучань — лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі "Мастацкая літаратура" за кнігу "Сядзіба, або Хата з матчынай душой". А, у дадзеным выпадку, яго канкрэтны верш — «Школьны жаўрук» — у душы невядомай яму настаўніцы, ды і ў маёй душы. Падумалася, вось так хаця б па адным творы было ў тых сённяшніх самадзейных паэтаў, якіх «напладзіў» наш прыватны выдавец, і большасць з якіх не ведае нават элементарнай тэхнікі вершаскладання, не кажучы ўжо пра адсутнасць у іх хоць якіх творчых здольнасцей... Тых «паэтаў», каго ў школе не змаглі навучыць разуменню, што такое сапраўдная літаратура. (Але, навучы, калі, сёння ўрокаў па роднай мове і літаратуры столькі, што — сорамна казаць.) А ўвогуле, і ўсяму іншаму вучыць не проста, калі мы, самі, не надаём настаўнікам той статус, якога яны заслугоўваюць.

Уладзімір САЛАМАХА



На здымку: Мікола Маляўка, Мікалай Семяняка, Зінаіда Камароўская на свяце "Каласавіны", 2005 год.

P.S. Нядаўна мне пазваніла Валянціна Міхайлаўна і сказала, што пасялкоўцы разабралі маю школу. Маўляў, сёння дзяцей у некалі вялікім пасёлку мала, дык яны ходзяць у суседнюю вёску або ездзяць у райцэнтр. Хацеў спытаць, можа яна ведае ў каго цяпер з настаўнікаў або былых вучняў наш школьны званок — а магчыма, некалі пасёлак адродзіцца (ёсць жа праграма адраджэння вёскі, дзяржава заклапочана дэмаграфічнай сітуацыяй, далейшым павелічэннем дабрабыту насельніцтва і г.д.). Але не спытаў: а раптам... Так, мы, людзі, калі знішчаем гнёзды, пра птушак не думаем.

У.С.

Выдаўцы Украіны патрабуюць крэдытаў

Як пісала ўжо наша газета, Украіна на выставе “Кнігі Беларусі-2007” атрымала статус ганаровага госця. Практычна да ўсіх аналагічных імпрэзаў у суседняй краіне мае дачыненне Украінская асацыяцыя выдаўцоў і кнігараспаўсюджвальнікаў.

Спачатку Украінская асацыяцыя дзяржаўных выдавецтваў, а цяпер згуртаванне прадпрыемстваў усіх форм уласнасці, гэта арганізацыя існуе з 1994-га года і аб’ядноўвае 140 з 970 зарэгістраваных ва Украіне выдавецтваў. Падчас мінскага форуму карэспандэнт “ЛіМа” сустрэўся з прэзідэнтам Украінскай асацыяцыі выдаўцоў і кнігараспаўсюджвальнікаў Аляксандрам АФОНІНЫМ.

— Гістарычна і геаграфічна мы не можам адмаўляць тую адзіную прастору, на якой знаходзяцца Беларусь і Украіна. І сёння кніга, мабыць, з’яўляецца адзінай зарукай аднаўлення і зберажэння традыцый, узаемападтрымкі і ўзаемапавагі нашых народаў, — упэўнены Аляксандр Васільевіч. — Мы ехалі ў Мінск з адным жаданнем: як мага хутчэй вярнуць тое разуменне, якое існавала раней паміж нашымі народамі і якое апошнім часам дужа заўважна страчваецца. Канечне, могуць існаваць стасункі на дзяржаўным узроўні, але без людскіх паразуменняў, без усталявання шчыльнай духоўнай сувязі паміж народамі нам існаваць будзе надзвычай складана.

Кожная культура ўзбагачаецца за кошт іншых культур. І сёння вяртанне ўкраінскай кнігі на тэрыторыю Беларусі і беларускай — на тэрыторыю Украіны ёсць тым самым узбагачэннем. Мы мусім наноў вяртацца адно да аднаго, бо шмат страцілі за апошнія шаснаццаць гадоў.

— Што ўразіла на мінскім кірмашы ў гэтым годзе?

— Тое, што мінская выстава натуральна набывае выгляд і характар міжнароднай. Сёння тут значна больш прадстаўнікоў замежных краін. Гэта вельмі добра, бо ў нашай традыцыі апошніх гадоў выстава завецца міжнароднай, калі на ёй прысутнічаюць украінцы, беларусы і расіяне. Але калі мы абмяжоўваемся толькі блізкімі сувязямі, на мой погляд, нельга лічыць гэта міжнародным форумам. А калі прысутнічаюць краіны больш далёкага замежжа, Заходняй Еўропы, азіяцкіх, афрыканскіх краін — тады мерапрыемства маштабнае. Сёння мінская выстава таксама набывае такія рысы, і я думаю, што цягам бліжэйшых гадоў яна стане яшчэ больш паспяховай міжнароднай выставай.

— Ці бываюць мерапрыемствы такога маштабу ва Украіне?

— Такога, ці нават крыху большага маштабу, ва Украіне наладжваецца толькі адна выстава — гэта Львоўскі форум выдаўцоў. Другая, якую неяк можна параўнаць з мінскай імпрэзай, — харкаўскі “Свет кнігі”, які адбудзецца 26—28 красавіка. Ён таксама даволі прадстаўнічы — але, на жаль, беларускія выдавецтвы ў ім ніводнага разу не бралі ўдзел, хоць я спадзяюся, што ў гэтым годзе яны будуць там прысутнічаць.

Але ва Украіне багата выставачных пляцовак, кожны год з’яўляюцца новыя форумы. У тым жа красавіку, за тыдзень да харкаўскай выставы, адбудзецца больш вузкапрофільны форум, які адметны не столькі выставай кніжак, колькі канферэнцыяй “Інфармацыйнае забеспячэнне вышэйшай адукацыі ва Украіне”. А паколькі пытанне падручнікаў для ВНУ актуальнае не толькі для Украіны, то на той форум у Адэсе запрашаюцца прадстаўнікі універсітэцкай навукі, выдавецтваў вышэйшай школы з Украіны, Беларусі, Расіі і Малдовы.

— Якія суадносіны паміж колькасцю дзяржаўных і недзяржаўных выдавецтваў ва Украіне? Якую ролю адыгрываюць і тыя, і тыя?

— Афіцыйна дзяржаўных профільных выдавецтваў як было, так і засталося дваццаць шэсць. Ёсць паліграфічныя прадпрыемствы, якія самі выдаюць: як правіла, іх асартыментная база вельмі нізкая — гэта некалькі кніжак на год. Таму сёння можна казаць пра тое, што да 80 працэнтаў усіх выданняў, якія выходзяць ва Украіне, — гэта заслуга прыватных выдавецтваў.

— А калі параўнаць якасць выданняў у дзяржаўным і недзяржаўным сектары?

— Бясспрэчна, прадукцыя дзяржаўных выдавецтваў больш якасная. Чаму? Бо яны маюць значныя традыцыі, большы штат прафесіяналаў з вялікім досведам падрыхтоўкі і выдання кніжак. Сумна пра гэта казаць, — але часам бывае так, што тыя, хто вырашыў заняцца выдавецкім бізнесам, не ўсведамляюць, што кніга — адмысловы, духоўны прадукт, і галоўнымі яго крытэрыямі павінна быць логіка, паслядоўнасць думкі і, канечне, пісьменнасць. А калі адкрываеш першую старонку і знаходзіш на ёй дзесятак, а то і больш памылак, дык, нават пры найвыдатнейшым літаратурным матэрыяле, жаданне чытаць такую кніжку адпадае. Таму сёння здараецца, што кніга, выдадзеная ў нейкім прыватным выдавецтве, не зусім адпавядае высокім стандартам, якія існуюць ва Украіне ўжо некалькі дзесяцігоддзяў.

З іншага боку, хачу зазначыць, што апошнім часам усё больш і больш падымаюцца некаторыя прыватныя выдавецтвы, асабліва з ліку тых, што былі зарэгістраваны на пачатку незалежнасці — гэта 1990—1992 гады. Яны ўжо, можна сказаць, прайшлі тую школу адаптацыі да рынку, школу напрацовак і досведу — і сёння з іх сценаў выходзяць цудоўныя выданні, якія надаюць славу Украіне.

— Ці маюцца дзяржаўныя прэферэнцыі для кнігавыдаўцоў ва Украіне і які парадак іх атрымання?

— З галоўных прэферэнцый трэба адзначыць Закон аб дзяржаўнай падтрымцы кнігавыдавецкай справы ва Украіне, які ўступіў у сілу 1-га ліпеня 2004 года. Паводле яго, нашыя выдаўцы, паліграфісты і распаўсюджвальнікі не сплачваюць падатак на дадатковую вартасць. Таксама выдаўцы і паліграфія ў частцы выдання кніжак (і гэта правіла пашырана на ўсю наменклатуру паліграфічнай прадукцыі) маюць ільготу з падаткаў на прыбытак. Апошняй ільготы, на жаль, не мае кніжны гандаль — хоць яна трэба, бо сёння ён надзвычай слабы, мізэрны па колькасці крамаў і знаходзіцца пад вельмі сур’ёзным ціскам з боку мясцовых органаў улады. Бо сёння сярод дэпутатаў мясцовых радаў нямала бізнесоўцаў, якія вызнаюць інтарэсы ўласнай кішэні, а не інтарэсы дзяржавы.

За савецкім часам кніжныя крамы атрымлівалі цудоўныя месцы на цэнтральных вуліцах абласных гарадоў, сталіцы Украіны. Сёння людзі бізнесу намагаюцца “выселіць” іх для таго, каб размясціць там свае ўласныя офісы, буцікі, рэстараны і гэтак далей. Не зважаючы на трывалую барацьбу нашай асацыяцыі, поўнасцю спыніць спробы знішчэння кніжных крамаў не ўдалося. І нават апошні магазін, які яшчэ заставаўся на Крашчаціку — “Знання” — церпіць ад кіеўскай улады, бо гэтае месца ў цэнтры горада вельмі прывабнае для яе. Гэта праблема.

Што датычыць іншых прэферэнцый, то існуюць праграмы прапаганды і пашырэння ўжытку ўкраінскай мовы, у рамках чаго дзяржава праз Міністэрства культуры закупляе ў выдаўцоў літаратуру для папаўнення бібліятэчных фондаў, а таксама праграма “Украінская кніга”, кураторам якой выступае Дзяржаўны камітэт тэлебачання і радыёвяшчання. Да апошняга часу тыя праграмы функцыянавалі досыць паспяхова, але ў мінулым годзе былі ўнесены папраўкі ў закон аб дзяржаўных закупках. Гэтым законам кніга прыроўнена да ўсіх банальных тавараў. У выніку абсалютна неадэкватных сітуацый і, на маю думку, абсалютна неразумных, нерэалістычных дзеянняў — праграма закупак у 2006-м была сарвана. Замест 18 мільёнаў грыўняў (7,65 млрд. бел. рублёў. — **Аўт.**), якія прадвызначалася выдзеліць на выданне ўкраінскіх кніг па праграме Дзяржтэлерадыё, было выдзелена толька 4,9 мільёна (2,1 млрд. бел. рублёў— **Аўт.**).

Сёння ёмістасць кніжнага рынку Украіны дасягае 400 млн. долараў. Але, на жаль, гэта не грошы ўкраінскіх кнігавыдаўцоў. Больш як 80 працэнтаў рынку займаюць кнігі Расіі. Таму тыя няшчасныя 4,9 мільёна, пра якія так апякуюцца дзяржаўныя службоўцы, не вартыя выедзенага яйка — яны складаюць, паводле нашых падлікаў, толькі 0,2 працэнта ёмістасці ўкраінскага кніжнага рынку. Гэта значыць, дзяржаве сёння трэба дбаць не пра тое, як падзяліць гэтыя дзве дзесятыя працэнта, а пра тое, як знайсці механізмы паступовага і нарастаючага крэдытавання кнігавыдавецкай справы. Не раздачы бюджэтных грошай, а крэдытавання — пад прыстойны працэнт, які б не заганяў выдавецтвы, паліграфію ў кабалу да банкаў, а быў бы элементам, стымулюючым да развіцця і да росту продажу кніг — як на ўкраінскай мове, так і на мовах тых нацый, якія жывуць на нашай зямлі.

Мікалай АНІШЧАНКА

Фота Сяргея Дубовіка

Час дыктуе свае правілы. Калі іх не трымацца, можна адстаць ад прагрэсіўнага чалавецтва нават на стагоддзі. Інфармацыйнае грамадства вымагае выкарыстання камп’ютэрных тэхналогій. Не сакрэт, што ў бліжэйшай будучыні існуе пагроза замены кнігі камп’ютэрам. Можа здарыцца, знікнуць з ужытку слоўнікі, якія зарэкамендавалі сябе ў стагоддзях: на змену ім парываюцца электронныя адпаведнікі...

На парозе камп’ютэрнай беларусізацыі

Папяровыя перакладчыкі

Вядома ж, піянерамі айчыннага перакладу былі кнігі-слоўнікі. Не будзем заглядаць глыбока ў гісторыю, прыгадаем з іх толькі сучасныя.

За многія гады плённай працы айчыннае выдавецтва “Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі” выпусціла не адзін слоўнік, якім карысталася некалькі пакаленняў лінгвістаў, навукоўцаў, школьнікаў і студэнтаў. Згадайма “Русско-белорусский словарь” (1982), “Англа-руска-беларускі слоўнік” (1989) і многія іншыя.

Высокая якасць слоўнікавых стандартаў, добрае афармленне, даступная цана... Да таго ж у стварэнні і рэдагаванні слоўнікаў “БелЭн” удзельнічалі класікі беларускай літаратуры, моўны запас якіх дазваляў стварыць дасканалыя выданні такога кшталту.

Але свет паступова набліжаўся да камп’ютэрнай рэвалюцыі...

Пераклад па-машыннаму

Беларусы не былі першымі ў тэхналогіях распрацоўкі праграмных абалонак і непасрэдна партатыўных электронных перакладчыкаў. Мы, спыняючыся падрабязна на іх характарыстыках, заўважым толькі, што мадэлі 3-4 гадовай даўнасці ўжо мелі ў сабе каля 1 млн. слоў для англа-рускага і руска-англійскага перакладаў.

Бясспрэчнымі сучаснымі лідэрамі сярод праграм сталі электронны слоўнік Lingvo і перакладчык PROMT...

Сённяшнія энтузіясты спрабуюць рабіць так званыя саматужныя беларусіфікатары асобных праграм. Іх спіс вельмі шырокі: ад звыклых калькулятараў, звышпапулярных камп’ютэрных гульняў да аперацыйных сістэм. Некаторыя з іх можна бясплатна спампаваць на сайце www.belsoft.tut.by.

На аснове ўсё таго ж перакладчыка PROMT стварыўся беларускі аналаг BELAZAR. Наш перакладчык бясплатны, не патрабуе ліцэнзійнага ключа-кода пры інсталяцыі. І нядзіўна, бо пакуль што на гэтым мала што заробіш...

Некалькі цікавых фактаў з гісторыі машыннага перакладу

- ***Чарльз Бэбідж яшчэ ў XIX ст. прапаноўваў ідэю машыны-перакладчыка;***
- ***1947 г. — нараджэнне машыннага перакладу як галіны даследаванняў;***
- ***1954 г. — фірма IBM сумесна з Джорджтаунскім універсітэтам прадэманстравала першую сістэму машыннага перакладу са слоўнікам з 250 слоў, 6 правіламі сінтаксісу, што дазволіла перакласці 49 адабраных загадзя сказаў.***

Думаю, тут варта прывесці словы стваральніка BELAZARа, якія характарызуюць як самога аўтара, так і яго погляд на праект (стыль і арфаграфія захаваны. — **С.Д.**):

“Маё імя — Алег Азароўскі. Праграмаванне — гэта мая прафесія і маё хобі. Мне цікава вывучаць новыя тэхналогіі і новыя сферы скарыстання сваіх прафесійных ведаў. У свой час я паспрабаваў праграмаваць камп’ютэрныя гульні, разнастайныя дапаможныя прылады для калегаў-праграмістаў, спрабаваў займацца вэб-дызайнам, і нават распрацаваў просты маўленчы сінтэзатар для беларускай гаворкі з выкарыстаннем гукавых патэрнаў.

Мая мэта — дапамагчы табе ствараць якасныя беларускія пераклады камп’ютэрных праграм, карпаратыўных сайтаў, асабістых старонак, форумаў, блогаў, іншых інтэрнет-сайтаў і проста тэкстаў, і тым самым пашыраць прысутнасць беларускай мовы на камп’ютэрах і межы беларускага сегменту ў сусветным камп’ютэрным Сеціве.

Ты таксама зможаш дапамагчы гэтай справе, дасылаючы ў слоўнік Белазара пераклады, і выпраўляючы выяўленыя ў слоўніку памылкі.”

Сапраўды, людзі дапамагаюць спадару Азароўскаму як заўвагамі, так і інфармацыяй наконт з’яўлення ў СМІ і Інтэрнеце тых ці іншых матэрыялаў, прысвечаных пытанням зменаў у беларускай мове. Дыскусія вядзецца на старонках гасцявой кнігі сайта BELAZARа www.belazar.belinternet.

BELAZAR на сённяшні дзень самы якасны з аматарскіх перакладчыкаў. Ён няблага перакладае тэксты гутарковага стылю, часам спраўляецца з так званымі “казённымі” афіцыйнымі паведамленнямі. Але ўзнікаюць цяжкасці з перакладам твораў літаратуры і газетных матэрыялаў. Добрая паслуга можа стацца “мядзведжай” з-за вялікай колькасці памылак у перакладзе, перш за ўсё з рускай на беларускую мову. Аўтар гэтага артыкула карыстаецца BELAZARам выключна для таго, каб праверыць тэкст на прадмет абдруковак і правільнай расстаноўкі літары “ў”. Але і тут не ўсе правілы і выключэнні з іх улічаны...

Увогуле ж сур’ёзныя тэксты давяраць такім перакладчыкам небяспечна. Чаму?

Электронная недарэчнасць...

Мая добрая знаёмая — кандыдат філалагічных навук, кіраўнік не адной студэнцкай курсавой работы, расказвала, як лянівыя студэнты карыстаюцца электроннымі слоўнікамі.

Адна студэнтка з цяжкасцямі пісала работу па стылістыцы беларускай мовы. Неўзабаве пашчасціла спампаваць карысную праграму BELAZAR. Напісала, што напісалася, па-руску і “ўкінула” тэкст на імгненны пераклад.

Адзін з апошніх пунктаў усялякай курсавой ці дыпломнай — *Заключение*. Але BELAZAR пераклаў слова як... *Зняволенне*. Студэнтка здала працу, а яе прыклад патрапіў у выкладчыцкую калекцыю недарэчнасцяў. Усё з-за таго, што электронныя перакладчыкі пакуль яшчэ не даюць магчымасці працаваць на чалавечым узроўні.

Дарэчы, тая ж праблема і з англа-рускімі слоўнікамі, якія не выдаюць словы ў адпаведнай склонавай форме, не разумеюць некаторых слоў, адметных спецыфічнымі стылістычнымі асаблівасцямі.

Напрыклад, агульнаўжывальная паўсюдна назва “прынтэр” стала ў BELAZARы... “друкаркай”. І гэткіх неалагізмаў зашмат! Таксама ўзнікаюць складанасці, калі саматужныя праграмісты пішуць на ненармаванай напаўтарашкевіцы-напаўнаркамаўцы. З аднаго боку пераконваешся: мова жыве, развіваецца. З іншага — варыянтнасць уносіць блытаніну ў правапіс, якая, напэўна, усё ж такі будзе ў хуткім часе ўрэгулявана законам. Добра, калі да стварэння айчыннага электроннага перакладчыка далучацца мовазнаўцы самага высокага ўзроўню, а не аматары-камп’ютэршчыкі, няхай нават і вельмі добрыя...

Карысць электронных памагатых для простага чалавека бясспрэчная. Не за гарамі той час, калі перакладчыкі з’явяцца ў мабільных тэлефонах, зрошчаных па функцыях з камп’ютэрам (ці так званых смартфонах). Ужо сёння створаны галасавы сінтэзатар беларускай мовы, а значыць, і электронныя перакладчыкі змогуць загаварыць. Была б толькі зацікаўленасць у гэтым як простых карыстальнікаў, так і стваральнікаў праграмных прадуктаў, а таксама дзяржавы.

Сяргей ДУБОВІК

Роздум ад прачытанага

У наш час, бадай, на ўсёй постсавецкай просторы не знайсці краіны, дзе б так шмат гаварылася і пісалася пра мову, як на Беларусі. Дый само абмеркаванне моўнай праблемы ў нас і ў іх мае прынцыповае адрозненне.

Для нас галоўнае, як павысіць сацыяльную ролю беларускай мовы, зрабіць яе запатрабаванай у грамадстве, дзе дзякуючы стараанням розных палітычных сістэмаў ужо не адно стагоддзе пануе руская мова.

Ва ўсіх жа астатніх краінах, утвораных на месцы колішніх саюзных рэспублік, вядуцца пошукі хоць самай нязначнай нішы для рускай мовы, каб толькі яна не стала мёртвай на іх тэрыторыі, звязвала і іх карэннае насельніцтва з галоўнымі цэнтрамі рускай культуры ў Расійскай Федэрацыі. Як правіла, гаворку пра захаванне рускай мовы паза межамі яе гістарычнай тэрыторыі вядзе ўзгадаваная на рускіх культурна-моўных стандартах інтэлігенцыя, прычым даволі часта і мясцовага паходжання. У нас жа галоўную функцыю па забеспячэнні рускай мове вядучага месца ў грамадскім жыцці ўзяў і даволі паспяхова дамагаецца такога дзяржаўны чыноўніцкі апарат, не выключаючы з яго і службоўцаў беларускай нацыянальнасці. Інтарэсы беларускай мовы адстойвае пераважна інтэлігенцыя. Сусветны вопыт сведчыць, што ініцыятыўным шляхам і сотай долі не зробіш таго для роднай мовы, што могуць уладныя структуры. Таму не будзем здзіўляцца, што апошнім часам беларуская мова апынулася ў такім незайздросным становішчы ў абслугоўванні ўсіх эшалонаў улады і кіравання, адміністрацыйна-гаспадарчага апарату, устаноў навукі, адукацыі, культуры, сродкаў масавай інфармацыі. Супакойвае, што хоць усе гэтыя негатыўныя з'явы ў моўным жыцці краіны не застаюцца не заўважанымі, да глыбіні душы хвалююць немалую частку беларускага грамадства, якая хоча, усяляк імкнецца да таго, каб наш народ не пераўтварыўся ў нешта бесструктурнае, каб навекі не страціў характэрную ў свеце толькі аднаму яму культурна-моўную адметнасць. Сваю шчырую пашану і заклапочанасць да яе выказалі аўтары Марыя Шамякіна і Мікалай Анішчанка ў змешчаных у газеце "Літаратура і мастацтва" артыкулах "На якой мове загавораць фізікі і хімікі?.." і "Як вярнуць мову ў школы?.."

На гэтыя артыкульныя назвы-пытанні зусім не складана даць адказ, прычым нават у самай сціслай форме.

Фізікі і хімікі загавораць на той мове, на якой атрымаюць адукацыю і якая будзе рабочай у калектывах, дзе ім давядзецца працаваць. Сёння ў Беларусі ў першым і ў другім выпадках выкарыстоўваецца руская мова. На ёй і загавораць новыя генерацыі фізікаў і хімікаў краіны. Выключэнні будуць мець толькі адзінкавы характар. Зразумела, калі хто-небудзь з іх апынецца ў Германіі, Францыі, Англіі, ЗША, Кітаі... дык загаворыць і на іх дзяржаўных мовах. Дарэчы, у кожнай з названых краін толькі адна мова мае дзяржаўны статус.

Бясспрэчна, адсутнасць беларускамоўнага навучання новых пакаленняў тэхнічнай інтэлігенцыі — гэта наша вялікая нацыянальная праблема. Не магу назваць аніводнай цівілізаванай краіны, дзе б рабілася такое, як у Беларусі. Не выручае становішча нават і тое, што руская мова, на якой навучальны працэс уведзен у статус другой дзяржаўнай мовы, бо родная ж мова карэннага насельніцтва, якой якраз і трэба аддаваць прыярытэты, па гэтай прычыне занепадае, чэзне. Калі і надалей у вышэйшай і сярэдняй школах выкарыстоўваць толькі рускую мову, мы ніколі не сфарміруем інтэлігенцыю, здольную жыць і працаваць у традыцыйным беларускім культурна-моўным рэчышчы. Выпускнікі беларускамоўных філалагічных факультэтаў і аддзяленняў не справяцца з той гістарычнай функцыяй, якая ўскладаецца на інтэлігенцыю кожнага народа па захаванні яго этнакультурнай самабытнасці, што зараз набывае асаблівую актуальнасць ва ўмовах паглыблення працэсаў глабалізацыі духоўнага жыцця ва ўсім цывілізаваным свеце. Для нашай рускамоўнай інтэлігенцыі мёртвым капіталам стануцца найбагацейшыя набыткі беларускай мастацкай літаратуры, арыгінальнае, адметнае ад іншых песенна-музычнае мастацтва. Толькі нейкім цудам у асяроддзі рускамоўнай інтэлігенцыі могуць з'явіцца здольныя да літаратурнай працы асобы, якія пажадаюць пісаць свае творы па-беларуску. А як многа траціць сама беларуская мова на ўзбагачэнне сваёй лексікі дакладнай і прыродазнаўчай тэрміналогіяй ад таго, што педагагічны працэс у сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай школах будуецца на рускай мове?! І трэба ж, што знаходзяцца людзі, якія абвінавачваюць не дзяржаўную моўную палітыку апошніх двух-трох стагоддзяў, а саму беларускую мову за беднасць, у параўнанні з рускай, такой тэрміналогіяй. Не сумняваюся, што варта толькі на 180 градусаў павярнуць моўнае становішча у гэтым самым прэстыжным звяне адукацыі, як яго цвёрдай нацыянальнай арыентацыі прафесары і выкладчыкі ў самы сціслы тэрмін падрыхтуюць высакаякасныя беларускамоўныя падручнікі па ўсім комплексе дакладных і прыродазнаўчых навук. Станоўчых прыкладаў у такой практыцы ўжо ёсць нямала. Словам, рускамоўнае навучанне ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных установах прычыняе больш шкоды (разбураюцца нацыянальна-моўныя культурныя асновы беларускага народа), чым карысці (стварэнне выключна толькі за кошт беларускіх інтарэсаў адзінай моўнай прасторы на абсягах усёй саюзнай дзяржавы як найвышэйшага фактару яе паспяховага функцыянавання). Такога могуць не заўважыць, не ўлічваць толькі недальнабачныя палітыкі і ідэолагі.

А цяпер адказ на пытанні аўтара другога артыкула. Вяртаць беларускую мову ў агульнаадукацыйную школу трэба аналагічнымі метадамі, як туды ўводзілі рускую мову. Але спачатку крыху гісторыі.

У другой палове XX стагоддзя яскрава акрэслілася вялікае жаданне бальшавіцкай партыі больш хуткімі тэмпамі рухацца па шляху пабудовы камуністычнага грамадства з яго адзінай культурай і мовай для ўсіх народаў СССР. Дамагчыся такога азначала сцерці існыя паміж імі надзвычай глыбокія нацыянальна-культурныя і моўныя адрозненні. Па прапанове ідэолагаў КПСС галоўную функцыю па ліквідацыі такіх адрозненняў усклалі на рускую мову, г. зн. ператварылі апошнюю ў разбуральны фактар, што пазней негатыўна адбілася на стаўленні да яе ўсіх неславянскіх народаў СССР. Адчуваецца такое і пасёння, асабліва ў прыбалтыйскіх і закаўказскіх краінах. Умацаванне сацыяльнай ролі рускай мовы ў саюзных рэспубліках пачалі з франтальнага ўкаранення яе ў справаводства партыйных і савецкіх органаў, міністэрстваў і ведамстваў, вышэйшую і сярэднюю спецыяльную школу. Што ж датычыць Беларускай ССР, тут такія пазіцыі руская мова займала ўжо ў першыя пасляваенныя гады. Прычына: з-за недаверу агульнасаюзнага партыйнага цэнтра мясцовым кадрам нядаўняй партызанскай рэспублікі сюды камандзіравалі велізарную колькасць рускамоўных кіраўнічых партыйных і савецкіх работнікаў, інтэлігенцыі, якія ў самыя сціслыя тэрміны не юрыдычна, а фактычна забяспечылі рускай мове статус адзінай дзяржаўнай. Ёю ўдалося выпхнуць беларускую мову з усіх сфераў грамадскага жыцця, у выніку беларускамоўныя агульнаадукацыйныя школы зрабіліся тупіковымі, імгненна пачалі траціць сваю прэстыжнасць у вачах і бацькоў, і старшакласнікаў. Падобнае назіралася і ва Украіне, толькі не ў такой вострай форме. Маскве ўсё гэта было добра вядома, але яна ніякіх рашучых крокаў не рабіла па дэнацыяналізацыі агульнаадукацыйнай школы ў СССР, чакаючы, каб руская мова хоць трохі пашырыла свае грамадскія функцыі ў іншых рэспубліках. Жаданыя зрухі яскрава абазначыліся ў сярэдзіне 50-х гадоў. Ідэалагічныя асы КПСС не памыліліся, даўшы дазвол у першую чаргу савецкаму кіраўніцтву БССР рукамі бацькоў руйнаваць беларускамоўную школу, ведаючы іх незадаволенасць тым, што яе выпускнікі зведвалі вялікія цяжкасці з-за мовы падчас вучобы ў рускамоўных інстытутах і тэхнікумах, а таксама працы ў розных установах і арганізацыях. Вынікі радавалі як Маскву, так і рэспубліканскі дзяржаўна-партыйны апарат. Ужо на пачатку 60-х гадоў і днём з агнём цяжка было адшукаць у вялікім горадзе хоць адну беларускамоўную агульнаадукацыйную школу.

Не трэба быць вялікім празорцам, каб сцвердзіць наступнае: надай сёння беларускай мове такія функцыі, як у рускай, звядзі апошнюю да такога гаротнага становішча, як у першай, і бацькі пры апытанні абавязкова выкажуцца за агульнаадукацыйную школу на беларускай мове, бо яна з закінутай пераўтворыцца ў запатрабаваную грамадствам. Як бачым, увесці беларускую мову ў школы вельмі проста. Галоўнае толькі, каб для гэтага былі створаны грунтоўныя перадумовы, каб беларускае слова запанавала ў грамадскім жыцці краіны. Стварэнне такіх ўмоў — прамы абавязак дзяржавы. Сучаснае незайздроснае па ўсіх пазіцыях для беларускага слова моўнае становішча не зменіш ніякімі высілкамі ініцыятыўных груп, ніякімі каласальнымі дасягненнямі нацыянальнага прыгожага пісьменства.

З'явіся сёння ў чыноўніцкага апарата жаданне забяспечыць беларускай мове яе законныя правы ў родным доме, — ужо заўтра моўнае становішча ў краіне пачне мяняцца да лепшага, а родненькае слова плаўна ўваходзіць у навучальна-выхаваўчы працэс агульнаадукацыйных школ. Моц і будучыня беларускай мовы — у запатрабаванасці яе грамадствам, пра што не могуць не дбаць уладныя структуры суверэннай Рэспублікі Беларусь. Пры станоўчым вырашэнні гэтай лёсавызначальнай для беларускага народа праблемы яны заўжды будуць мець ад яго неабходную падтрымку, бо каму ж хочацца бясследна растварыцца ў чужой культурна-моўнай стыхіі, адысці ў нябыт.

Леанід ЛЫЧ,
доктар гістарычных навук,
прафесар

Профіль Фартуны

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 9)

пяць зачыняў. То яна потым перад тым, як туды бегчы, пяць хвілін ва ўсе бакі галавой круціла, мяне выглядвала! — і Генадзь зарагатаў, мабыць, уявіўшы той даўні малюнак, калі трынаццацігадовая дзяўчынка, выбегшы з хаты па патрэбе, напачатку пільна ўзіралася на суседскі падворак — ці ёсць там гэты хлопец...

— Дык што ты цяпер хочаш? — з выклікам запытаў Генадзя Сяргей.

Яму было брыдка чуць пра даўнія выхадкі свайго сябра ў адносінах да яго цяперашняй жонкі, але падсвядома ён разумеў, што не дзеля гэтага распачаў Генадзь сваю размову. Не, нешта ён прыхаваў, каб ударыць каротка і балюча...

— Што я хачу? Што я хачу!? Я хачу не бачыць больш тваю шчаслівую фізіяномію. Я хачу, каб ты зразумеў, што ты перада мной сёння — ніхто. Што колькі б ты не ігнараваў маё сённяшняе становішча — яно ёсць. І ты не будзеш глядзець на мяне так, як глядзіш цяпер!

— Вось як... — цяпер ужо сам Сяргей наліў сабе ў шклянку гарэлкі, перад гэтым дэманстратыўна адкаркаваў пляшку сваёй, брэсцкай. — Не чакаў, прызнацца, што будзе ў нас сёння такі вечар. Цікавы вечар... Ты, значыць, усе гэтыя гады толькі і чакаў моманту, каб даказаць мне, што ты вышэй за мяне? Можа і вышэй... Ведаеш, можна прымусіць адносіцца да некага з бояззю. А вось прымусіць паважаць — нельга. Я так думаю, што табе проста сёння хочацца зрабіць мне нешта балючае. І толькі.

— Угадаў! Угадаў! — зарагатаў Генадзь. — Мяне ванітуе ад твайго шчаслівага выразу твару пры сустрэчах.

— Хочаш, каб я цябе ненавідзеў, ці што?

— Хачу, каб ненавідзеў. Хачу, каб зайздросціў. Хачу, каб ты разумеў: хто ёсць ты, і хто ёсць я!

— Выбачай, але ты мне вось цяпер проста смешны. — Сяргей, паспакайнеўшы, закурыў. — Калі табе няма больш пра што са мной размаўляць — самы час заканчваць вячэру.

— З хаты гоніш? — бліснуўшы вачыма, хутка спытаў, быццам чакаў гэтых слоў, Генадзь.

— Не ганю, сэнсу працягваць размову не бачу.

— Ну, ну... — Генадзь прыжмурыўся, як усё роўна прымерваўся, прыцэльваўся. — Я пайду, а ты тут такім упэўненым і шчаслівым застанешся?

— Застануся.

— Не атрымаецца! Я зараз пайду... От зараз і пайду... Толькі трэба мне табе колькі слоў сказаць. Важных слоў...

— Кажы, я слухаю, — без усякага хвалявання адказаў Сяргей. Ён і на самай справе ніколькі не баяўся цяпер Генадзя.

— Ну, дык слухай... — з прадчуваннем асалоды ад моманту пачаў Генадзь. — Я з тваёй Зойкай... У дзяцінстве мы з ёй у маму з таткам гулялі, за цукеркі... А перад выпускным балем я яе проста купіў — у яе ж ніколі нічога апрануць добрага не было, а я два гады збіраў грошы, спецыяльна збіраў, каб хапіла тканіны на сукенку — і купіў! У кустах ля сажалкі яна мне і прадалася, а ты яе ля вербаў у той час, як дурань, чакаў! І перад самым вашым вяселлем я яе купіў! Не, то яна купіла ў мяне маё маўчанне: я ёй прыгразіў, што раскажу табе, чаму яна на самай справе да цябе так спазнілася на спатканне пасля выпускнога балю! А памятаеш, як ты ў камандзіроўцы быў, а Зойчынага пляменніка ў армію праводзілі? От, я тады яе напаіў! Яна ўсё піва піла, а я туды гарэлачкі, гарэлачкі... Напаіў, дадому да сябе завёў... Ты б бачыў, як яна ачуняла і вакол сябе і на сябе глядзела! О-о, то быў малюнак! А я ёй яшчэ і кажу: "Ну, ты і жанчына! Давай табе і давай! Мабыць, твой Сяргей цябе на галодным пайку трымае...". А праз год у вёсцы было, на возеры. Нешта мне так жанчыну захацелася, а тут твая Зойка ідзе, адна. Купацца, загараць. Я да яе падсеў, кажу, замучыла мяне сумленне, пайду да Сяргея прызнавацца: гад я і скаціна, жонку тваю меў, але ж выбачай, я яе не гвалціў, не прымушаў, як атрымалася — лепш у Зойкі спытай... І Зойка твая згадзілася супакоіць маё сумленне, забеглі мы на гадзінку ў прыбярэжныя кусцікі. Вось так! Га-га-га! — зарагатаў Генадзь. — З'еў? Глытай!

За час гэтага маналога Сяргей не змяніў сваёй позы, і твар яго заставаўся аднолькава спакойным, толькі звузіліся вочы, быццам яго прымусілі глядзець на нешта надта зыркае ці занадта агіднае.

— А я ведаў, — выразна, але без асаблівай інтанацыі, сказаў ён, гледзячы ў чорныя зрэнкі Генадзя.

— Гы, — гыкнуў, быццам падавіўся нечым, Генадзь. Яго пераможная ўсмешка пачала расцягвацца ў нешта карыкатурнае, хваравітае. — А я ж гэта, ну...

— Я ведаў! — ужо галасней, але так жа спакойна паўтарыў Сяргей, узняўся з-за стала, дадаў з той ціхай пагрозай, да якой нельга было не прыслухацца: — Пайшоў прэч адсюль. І хутчэй, без слоў.

Генадзь падхапіўся, знізу ўверх гледзячы на Сяргея. Уся яго постаць цяпер, няўпэўненая, разгубленая выклікала шкадобу. Ён памкнуўся з кухні, не зводзячы вачэй з Сяргея.

Сяргей адвярнуўся да форткі, зацягваўся цыгарэтай, слухаў, як у прыхожай апранаўся Генадзь.

Ад форткі цягнула свежым марозным паветрам. Дыхалася лёгка, на поўныя грудзі, і не хацелася паварочвацца да стала, да пахаў стылага тлушчу, смажанай цыбулі і вэнджанага мяса.

Волкавы.

Малюнак. Тры пакаленні

Ці гэта з'ява прыродная, ці містычная, ці сацыяльная? Можна разважаць і спрачацца. Ды як бы там ні было, а творчая дынастыя ў кожным разе — з'ява прыцягальная. Адна з такіх вядомых і шаноўных дынастый у Беларусі — мастакі Волкавы.

Творчасць кожнага з іх уяўляе сабою асобны і асобасны, непаўторны свет, больш ці менш знаёмы айчынным аматарам выяўленчага мастацтва. Але супаставіць тры творчыя індывідуальнасці, пабачыўшы і адначасова, і побач работы дзеда, сына, унука, — такой мажлівасці ў нашых заўсёднікаў выставак раней не было. Толькі сёлета, дзякуючы намаганням самага малодшага прадстаўніка дынастыі, Сяргея Волкава, чыю ініцыятыву падтрымалі Міністэрства культуры і кіраўніцтва Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, была зладкаваная унікальная выстаўка трох.

Яе наведнікі праз "тры пакаленні малюнка" спасцігалі развіццё мастацкіх індывідуальнасцяў у адной сям'і. Волкавы непаўторныя, не падобныя між сабой (і дзякуй Богу: хай лепей у мастацтве ўтвараюцца кланы, абы не было клонаў!). Ды ўсё ж яны роднянца. Нібы атожылкі аднаго магутнага жыватворнага кораня, які сілкуе талент, фарміруе характар, дапамагае падтрымліваць, працягваць і ўзбагачаць традыцыю. І ці не самае каштоўнае ў гэтай традыцыі — думка пра чалавека, глыбокае вывучэнне характэрных праяў яго ўнутранага свету. Рознабаковае веданне людзей перадаецца з рэалістычнай назіральнасцю ў партрэтах, замалёўках, накідах.

Творчасць Волкавых яшчэ раз пераконвае, што малюнак можа існаваць як самадастатковы і самакаштоўны від мастацтва, не толькі як падсобнае рамяство для працы, скажам, над габеленам ці жывапісным палатном. Станковы малюнак можа выклікаць усе станоўчыя эмоцыі, звязаныя з выяўленчай эстэтыкай, і ўспрымацца як люстэрка эпохі.

Думка пра чалавека. Добры позірк на яго. Увага да твару, да выразу вачэй.... Вытокі гэтай дынастыйнай традыцыі лёгка вытлумачыць: народны мастак БССР Валянцін Волкаў (1881-1964) — з сям'і іканапісцаў. У Пензенскім мастацкім вучылішчы яго педагогам быў знаменіты К. Савіцкі. Грунтоўныя асновы прафесійнай адукацыі В. Волкаў замацаваў у Пецярбургу, дзе скончыў Вышэйшае мастацкае вучылішча пры Імператарскай акадэміі мастацтваў. З 1923 года — праца ў Беларусі, куды Волкаў-старэйшы прынёс вялікія традыцыі мастацтва XIX ст., творчы дух акадэмічнай школы. Хтосьці так пра яго і сказаў: "чалавек-школа".

Пару гадоў таму наш Нацыянальны мастацкі музей ладзіў незвычайную выстаўку адной карціны, агромністага палатна В.Волкава "Мінск 3 ліпеня 1944 года". Цяпер, з адкрыццём новага музейнага корпуса, эпахальная работа, якую майстар ствараў на працягу дзесяці гадоў (1945—1955), эфектна размясцілася ў пастаяннай экспазіцыі айчыннага выяўленчага мастацтва. А вось у атмасферы "выстаўкі трох" ураўзлівым партрэтам эпохі выглядала падборка эцюдаў да шматнаселенай, кампазіцыйна складанай знакамітай карціны, якія В. Волкаў віртуозна рабіў вуглём на паперы. Сярод іх — "Дзяўчынка ў сукенцы", "Галава хлопчыка", "Галава жанчыны" (той, што ўтрапёна-імклівым позіркам сустракае вызваліцеляў), усмешлівы танкіст... Намалявана дыхтоўна, дасканала — так, як вучылі раней. Але "раней" зусім не значыць "архаічна", у чым пераконваюць і па-сучаснаму дынамічны, жывы малюнак "Партызаны" (дата —1929 год — сведчыць пра занатаваны эпізод часоў станаўлення маладой беларускай рэспублікі), партрэт Д. Камарова (1917), "Франя" (1922), "Трактарыстка" са жвавым прыгожым тварам (1956).

Анатоль Волкаў (1908—1985) — выхаванец знакамітай віцебскай школы: вучыўся ў тамтэйшым мастацкім тэхнікуме ў свайго бацькі. Час і свет А. Волкава займаў у выставачнай зале асобную сцяну. Не толькі як высокі ўзор прафесійнай творчасці, але і як своеасаблівы дакумент гісторыі могуць зацікавіць яго мінскія работы 1941— 43 г.г., выкананыя на паперы алоўкам. І — малюнкі 50-х: абрысы прыгожага твару жонкі, 11-гадовы сын Сярожа ў характэрных тагачасных шаравары...

Вядома, што А. Волкаў ілюстраваў творы Якуба Коласа, М. Багдановіча, Цёткі, Э.Самуйлёнка, А. Куляшова, Я. Маўра, Я. Брыля, А. Васілевіч, рускіх класікаў. У 1944 — 45 гадах маляваў карыкатуры для газеты-плаката "Раздавім фашысцкую гадзіну!" і потым звязаў сваё жыццё з папулярным часопісам "Вожык", які вырас з гэтага партызанскага выдання. Хаця А. Волкаў увайшоў у гісторыю айчыннай культуры і як адзін са стваральнікаў дзіцячага часопіса "Вясёлка", ён да апошніх дзён свайго жыцця заставаўся вожыкаўцам.

З "Вожыкам" сёння супрацоўнічае яго сын Сяргей, якому нядаўна споўнілася 65 (яму, дарэчы, давялося папрацаваць і ў "Вясёлцы"). Сяргей Волкаў, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат прэміі імя В. Віткі, нарадзіўся і вучыўся ў Мінску. Яго настаўнікамі ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце (цяпер акадэмія мастацтваў) былі Л. Асецкі, П. Любамудраў, А. Кашкурэвіч. Выдатная графічная школа спрыяе рознабаковай працы — у кніжнай і станковай графіцы, акварэлі, літаграфіі, шаўкаграфіі, у жанры плаката. Кнігі (іх на рахунку С. Волкава ўжо за 200!) ён афармляе і для айчынных, і для расійскіх выдавецтваў. Удзельнічае ў выстаўках аб'яднання мастакоў "Верасень".

З першага позірку на малюнкі С. Волкава заўважаеш як іх няўлоўную спадкаемнасць партрэтным традыцыям бацькі і дзеда, так і відавочную адрознасць аўтарскай манеры. Дзіва што: Волкаў-малодшы ўжо карэнны мінчук, узгадаваны ў самабытным беларускім творчым асяроддзі, пад уплывам культурных павеваў новай эпохі. Людзі яго пакалення адчуваюць жыццё інакш. І ў яго партрэтах — імпульс іншага часу: знікае амаль фатаграфічная дакладнасць святлаценяў, з'яўляецца імправізацыйны дух, неспакойнымі, нервовымі робяцца спалучэнні ліній, штрыхоў, "не ў фокусе" апынаюцца нейкія перыферыйныя дэталі, але... Але, згодна з сямейнай традыцыяй, акцэнт у выяве робіцца на выразнасці твару, вачэй. Сяргей Волкаў уключыў у экспазіцыю і малюнкі абаяльных жаночых аблічча, і партрэты-замалёўкі сучасных беларускіх пісьменнікаў, і накіды архітэктурных краявідаў...

Прысутны на вернісажы патрыярх беларускага мастацтва У. Стальмашонак вітаў ідэю, пра ўвасабленне якой не адзін год марыў ініцыятар выстаўкі, і шчыра падтрымаў калегу: "Сяргей Волкаў — выдатны сын і ўнук, спадкаемца і годны прадаўжальнік справы бацькі і дзеда, чыю спадчыну ён захаваў..." Дарэчы, многае публіка раней і не бачыла, бо значная частка малюнкаў В. Волкава — уласнасць унука і захоўваецца ў яго прыватнай калекцыі. Таму выстаўку без перабольшвання можна лічыць унікальнай.

С. БЕРАСЦЕНЬ

На здымках: С. Волкаў і работы прадстаўнікоў дынастыі.

Фота К. Дробава

Крыжаванка



Па гарызанталі:

4. Назва вёскі Мікалаеўшчына ў трылогіі Я. Коласа "На ростанях". 6. Бясцэнны ўсенародны скарб літаратурных твораў песняра. 9. Буйны почырк старажытных славяна-рускіх, грэчаскіх, лацінскіх рукапісаў. 10. Алегарычнае апавяданне (1917 г.). 11. Рускі пісьменнік, аўтар аповесцей "Лес шуміць" і інш., творамі якога захапляўся Я. Колас. 14. Брат жонкі або муж сястры. 17. "... Станюце", верш, прысвечаны вядомай артыстцы, легендзе беларускага тэатра (1923 г.). 18. "Вось як цяпер, перада мною Ўстае ... той прыгожа". З паэмы "Новая зямля". 19. "Мой мілы Янка, мой ...! Ў агульны вір нас доля ўгнала". З паэмы "Новая зямля". 20. Жывы арганізм. 23. Размалёванае рознымі ўзорамі курынае яйка. 25. Вядомы беларускі філолаг-славіст, аўтар працы "Беларусы", у якой надрукаваны аўтабіяграфіі Я. Коласа і Я. Купалы. 26. Імя прадзеда Я. Коласа. 30. Дзявочае прозвішча жонкі песняра. 32. Тэатральная галёрка (разм.) ці батлейка. 33. Сталіца еўрапейскай краіны, якую ў 1935 г. наведаў Я. Колас для ўдзелу ў Міжнародным кангрэсе. 34. Дзіцячы празаік, паэт. Аўтар аповесці "Базылёў курган" і інш., а таксама артыкулаў пра песняроў. 35. ... родзіць — ільну годзіць (прык.).

Па вертыкалі:

1. Апавяданне, надрукаванае ў "Нашай Ніве" пад псеўданімам "Дзядзька Карусь" (1907 г.). 2. Вёска ў Пухавіцкім р-не, чыгуначная станцыя, дзе Я. Колас жыў з сям'ёй летам 1933—34 гг. 3. Бел. пісьменнік, публіцыст, аўтар рамана "Галаброды" і інш. Сустракаўся з Я. Коласам у час вучобы ў школе в. Мікалаеўшчына, а таксама ў Мінску ў 1955 г. на нарадзе маладых празаікаў і паэтаў. 4. Бел. пісьменнік, нарысіст. Аўтар зборніка "Каханне на золаку" і інш. Ураджэнец Пухаўшчыны, дзе і сустракаўся неаднаразова з Я. Коласам. 5. "Наш родны ...". Верш, надрукаваны ўпершыню пад псеўданімам Якуб Колас. (1906 г.). 7. Псеўданім, пад якім надрукавана ў 1906 г. апавяданне "Чорт". 8. Бел. літаратуразнаўца, крытык, паэт. Аўтар зборніка "Святло зары вячэрняй" і артыкулаў пра Я. Купалу і Я. Коласа. 12. Збор шматлікіх пісьмаў песняра, выдадзеных асобным томам. 13. Выданне, якое выходзіць раз на год. 15. Вядомы бел. пісьменнік, аўтар кнігі "Колас расказвае пра сябе", блізкі сябра паэта. 16. Народны мастак Беларусі і СССР, акадэмік АН Беларусі, якому сёлета споўнілася 85 год. Аўтар партрэтаў Я. Купалы, Я. Коласа, А. Пушкіна, А. Міцкевіча і інш. 21. Леснічоўка, дзе Я. Колас жыў у брата і нелегальна адкрыў школу. 22. Назва в. Люсіна былога Пінскага павета, дзе настаўнічаў Я. Колас, у трылогіі "На ростанях". 24. Наём зямельнага ўчастка. 27. Верш, напісаны ў 1941 г. 28. Псеўданім малодшага брата Я. Коласа — Міхаіла, які, жывучы з 1944 г. за мяжой, даследаваў творчасць брата, сумаваў па Беларусі. 29. Дзявочае прозвішча маці Я. Коласа. 31. "... аб вясне". Пачатковае слова верша, напісанага ў 1947 г.

Лявонцій ЦЕЛЕШ г. Дзяржынск

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Леанід ГАЛУБОВІЧ
Віктар КАВАЛЁЎ
Янка ЛАЙКОЎ
Валерый ПІНЧУК (адказны сакратар)
Мікола СТАНКЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара)
Ірына ШАЎЛЯКОВА

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага рэдактара — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-66-71
літаратурнага жыцця, крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі— 284-44-04
музыкі, тэатра, кіно і выяўленчага мастацтва — 284-66-71
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: minsk@lim.by

Адрас у Інтэрнеце: www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ"
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79

Індэкс 63856
Наклад 3630
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 4.04.2007 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 1815

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12